Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

5 ЛІСТАПАДА 2016 г. СУБОТА № 215 (28325)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

## Справядлівасць, праца, роўнасць

*Дарагія суайчыннікі!*

*Віншую вас з Днём Кастрычніцкай рэвалюцыі.*

*У XX стагоддзі гэта падзея займае асаблівае месца. Яна аказала значны ўплыў на ход сусветнай гісторыі і вызначыла лёс многіх народаў.*

*Даступныя сацыяльныя даброты, ідэалы раўнапраўя, міру, міжнацыянальнай згоды, што склаліся ў савецкую эпоху, актуальныя і да гэтага часу. СССР ажыццявіў моцны рывок у развіцці прамысловасці, сельскай гаспадаркі, энергетыкі, касмічных тэхналогій, заклаўшы аснову для цэлых галін вытворчасці, новых напрамкаў даследаванняў. Поспехі Савецкага Саюза ў сферы культуры і спорту сталі здабыткам усяго чалавецтва і прынеслі краіне сусветную славу.*

*Сёння мы ганарымся працоўнымі подзвігамі, воінскім гераізмам, навуковымі адкрыццямі савецкага часу. Імкнёмся захаваць і прымножыць усё лепшае, што дасталося нам ад папярэднікаў, якія вызначылі сваімі прыярытэтамі такія каштоўнасці, як справядлівасць, праца, роўнасць.*

*З намі бясцэнны вопыт папярэдніх пакаленняў, а значыць, нам многае пад сілу.*

*Са святам!*

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЛУКАШЭНКА.**

# ПАДАРУНАК ДА СВЯТА

## На Міншчыне з'явіўся яшчэ адзін дзіцячы садок. За тры гады — дзявяты



**Новы дзіцячы садок адкрыўся ўчора ў вёсцы Ляскоўка Бараўлянскага сельскага Савета Мінскага раёна.**

Наведваць установу будуць 230 выхаванцаў, раздзеленых на 12 груп. Тут асаблівую ўвагу будуць надаваць здароўю дзяцей. Для гэтага тут ёсць усё неабходнае: басейн, трэнажорная і фізкультурная залы. Ва ўстанове створаны медыцынскі і харчовы блокі з неабходным абсталяваннем. А ў музычнай зале малыя змогуць цалкам раскрыць свае творчыя здольнасці. У гонар адкрыцця садка яны разам з удзельнікамі студыі «Ангелы музыкі» паказалі гасцям першую музычную кампазіцыю.



Фота БЕЛТА.

Раздзяліць радасць з навасёламі прыехаў **старшыня Мінаблвыканкама Сямён ШАПІРА**. Як адзначыў Сямён Барысавіч, сёння няпростая сітуацыя ў эканоміцы, але дзяржава знаходзіць грошы, каб ствараць умовы для выхавання і развіцця дзяцей. «Мы ведаем праблему Бараўлян, дзе вялікая колькасць малых чакае месца ў дзіцячыя садкі. Таму кожны год будзем адкрываць тут па адной дашкольнай установе», — адзначыў старшыня Мінаблвыканкама.

СТАР. 2

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Ігар БУЗОЎСКІ, намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта:**

*«Сацыяльную сферу часам ўспрымаюць як затратную. Але калі разважаць больш шырока і палічыць, што менавіта нам прынесла экаміка кожнага канкрэтнага сацыяльнага аб'екта, то атрымаецца, што гэта сфера далёка не затратная, а прыбытковы складнік для бюджэту. Укладанні ў медыцыну і ахову здароўя маюць канкрэтныя эканамічныя вынікі, напрыклад, у такім важным пытанні, як паляпшэнне дэмаграфічнай сітуацыі. Развітыя адукацыя, навука, культура фарміруюць эфектыўнае стаўленне да працы, а веды нашых людзей даюць магчымасць распрацоўваць інавацыйныя праекты і тым самым прыносяць эканоміцы значна больш».*

■ Без тэрміну даўнасці

# ПАРАД НАДЗЕІ

## 7 лістапада 1941-га, калі на палях Вялікай Айчыннай ішлі жорсткія баі, у Маскве адбыўся ўрачысты парад

**75 гадоў таму за некалькі дзясяткаў кіламетраў ад сталіцы СССР грукатала армада фашысцкай групы армій «Цэнтр». З кожным днём узмацняліся варожыя паветраныя налёты і бамбёжкі. Сотні тысяч масквічоў добраахвотна ўступалі ў народнае апалчэнне, кругласутачна працавалі на будаўніцтве абарончых рубяжоў. Ваенная абстаноўка была настолькі напружанай, што ў кастрычніку 1941-га частка цэнтральных устаноў і ўвесь дыпламатычны корпус эвакуіравалі ў Куйбышаў, а ў Маскве і прылеглых да яе раёнах увялі асаднае становішча. На галоўнае савецкае свята — 7 лістапада — Гітлер прызначыў парад сваіх войскаў у сталіцы СССР, для чаго нямецкім салдатам і афіцэрам ужо выдалі парадную форму, у якой яны рыхтаваліся пераможна маршыраваць па Краснай плошчы. А тым часам савецкае кіраўніцтва не збіралася адмаўляцца ад сваёй традыцыі. Нават у такі трывожны для краіны час...**



**Адразу пасля парада чырвонаармейцы адправіліся на фронт.**

Падрыхтоўка да парада вялася ва ўмовах поўнай сакрэтнасці. Камандзірам злучэнняў і часцей Маскоўскага гарнізона паведамілі пра тое, што прыкладна ў сярэдзіне лістапада 1941 года ў раёне Крымскага моста плануецца правядзенне агляду часцей, якія знаходзяцца ў сталіцы і на яе рубяжах, і тых, якія неўзабаве пойдуць на фронт. Масквічы сваёй прысутнасцю павінны былі ўмацаваць у чырвонаармейцаў баявое братэрства і нязломную стойкасць. У гэтых мэтах падчас звычайных навучальных заняткаў на закрытых тэрыторыях узмацнялася страявая падрыхтоўка вылучаных для агляду часцей і навучальных устаноў.

За дзень да парада на платформе станцыі метро «Маякоўская» было праведзена традыцыйнае пасяджэнне Массавета, пасля якога Сталін абвясціў членам Палітбюро ЦК і некаторым асобам пра час пачатку парада войскаў на Краснай плошчы, які быў перанесены на дзве гадзіны раней. Парад павінен быў адбыцца ў восем гадзін раніцы. Камандзірам часцей, якія ўдзельнічалі ва ўрачыстасці, пра такія змены стала вядома ў 23 гадзіны. Звычайным байцам паведамілі пра гэта перад самым пад'ёмам раніцай 7 лістапада. Запрошаныя на Красную плошчу прадстаўнікі грамадскасці і рабочыя праз пасланцаў даведаліся пра час правядзення парада з пяці да сямі гадзін раніцы.

Падрыхтоўкай ваеннага парада на Краснай плошчы займаўся камендант сталіцы, наш зямляк, ураджэнец вёскі Бывалькі Лоеўскага раёна, генерал-маёр Кузьма Сінілаў.

СТАР. 5

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 5.11.2016 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,9052 | ▲ |
| Еўра | 2,1152 | ▼ |
| Рас. руб. | 0,0298 | ▼ |
| Укр. грыўня | 0,0745 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

ПІШАМ ПРА ТОЕ, ШТО САПРАЎДЫ ВАЖНА,
5 разоў на тыдзень!
Ідзе падпіска на «Звязду» на I квартал і I паўгоддзе 2017 года!
ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

■ З нагоды

# АДЧУВАННЕ ДОМА І РАДЗІМЫ

7 ЛІСТАПАДА мы з бацькам заўсёды глядзелі па тэлевізары парад на Краснай плошчы. Гэта быў своеасаблівы штогадовы сямейны рытуал, які ні дзіўна, абсалютна пазбаўлены ідэалагічнага падтэксту. На вуліцы была слата і холад, а ў хаце дыхала цяплом печ і можна было прытуліцца на канапе да бацькавага пляча і глядзець, як на чорна-белым экране нясуць партрэты кіраўнікоў і рухаецца ваенная тэхніка. Свята Кастрычніцкай рэвалюцыі было ў падсвядомасці (дый, калі шчыра, і застаецца) менавіта такім — дамашнім, утульным, спакойна-ўрачыстым. На падстрэшку сенцаў, што выходзілі на вуліцу, мы заўсёды (як і на 1 Мая, і на Дзень Перамогі) прыбівалі сцяг БССР, які, акуратна скручаны і запакаваны ў цырату, захоўваўся ў кладоўцы. І гэта таксама была сямейная традыцыя, якой можна было пахваліцца перад аднакласнікамі, — не ў кожнага на хаце трапятаў пад халодным ветрам сцяг...

Бацькі былі простымі вясковымі інтэлігентамі, яны не хадзілі на мітынгі, не ўдзельнічалі ў агітбрыгадах — проста спакойна жылі і працавалі. Я аднойчы, памятаю, класе ў трэцім, спытала ў мамы, калі яна чарговы раз даставала сцяг з кладоўкі, каб прыбіць у падстрэшшы перад лістападаўскім святам, навошта нам гэта трэба. «Бо мы многае маем дзякуючы той рэвалюцыі», — сур'ёзна, зусім як дарослай, адказала яна мне.

Я ўспомніла гэта, калі нядаўна адно маладое дзяўчо, што прыехала ў госці з былой саюзнай рэспублікі, скептычна так спыталася: навошта вы адзначаеце святы эпохі, якая закончылася, краіны, якая распалася? Дзень Кастрычніцкай рэвалюцыі, напрыклад. І я адказала ёй акурат так, як калісьці мне маці: «Бо мы многае маем дзякуючы той рэвалюцыі».

Сапраўды, мы маем — ні больш ні менш — сваю ўласную краіну з назвай Беларусь. Менавіта дзякуючы падзеям восені 1917 года. Кожны, хто ведае гісторыю на прыстойным узроўні, упэўнена, з гэтым пагодзіцца. Менавіта пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі ўзнікла ідэя стварэння Беларускай рэспублікі. Не аўтаноміі ў складзе Расіі, як нясмела, толькі набіраючы голас, прапаноўвалі дагэтуль прадстаўнікі нядаўна народжанай нацыі, а менавіта асобнай дзяржавы. Словы «Беларусь» і «беларусы» загучалі ў такім кантэксце, на такім узроўні і з такой перспектывай увогуле ўпершыню за ўсе часы. Пачатак нашай сённяшняй суверэннай дзяржавы — менавіта там, у кастрычніку 1917-га, калі наша патрабавальнае: «Людзьмі звацца» было пачута.

Яшчэ адзін момант, пра які нам варта ведаць і памятаць. Многія з нас нарадзіліся і жывуць не на чужыне, а на зямлі продкаў зноў жа дзякуючы рэвалюцыі 1917 года. Бо за тры гады Першай сусветнай вайны, што грукатала на нашай тэрыторыі, гэта зямля перадваралася ў папялішча і могілкі (варта толькі паглядзець тагачасную фотахроніку з Вілейкі або з-пад Смаргоні, каб у тым пераканацца). Дзясяткі, сотні тысяч бежанцаў-беларусаў рушылі у Прыбалтыку, углыб Расіі. Тыя, хто застаўся, былі на мяжы выжывання. Першы дэкрэт, падпісаны новай савецкай уладай, быў Дэкрэт аб міры. Нягледзячы на тое, што іншыя бакі яго спачатку праігнаравалі, менавіта ён стаў штуршком для перамір'я з Германіяй (а самыя жорсткія баі на беларускай зямлі руская армія вяла менавіта з немцамі). Пасля быў падпісаны Брэсцкі мір, і многія людзі змаглі вярнуцца з бежанства ў родныя мясціны, не страціўшы свае карані, працягнуўшы свой радавод менавіта тут, на гэтай зямлі, а не за тысячы кіламетраў ад яе.

Я ўжо не кажу пра зямлю — галоўную каштоўнасць для нашай вясковай, па сутнасці, нацыі. Менавіта пасля рэвалюцыі арандатары, якіх у любы момант мог выгнаць з участка гаспадар (перачытайце «Раскіданае гняздо» Купалы), беззямельныя, якія гнулі спіну ў парабках, сталі ўласнікамі зямельных надзелаў. Мая бабуля, якой у 1917-м было дванаццаць гадоў, і ў восемдзесят згадвала пра гэту самую яркую падзею свайго дзяцінства...

Пасля, канешне, было шмат драм і трагедый і ў жыцці вялікай краіны, і жыцці асобна ўзятай рэспублікі. Гэтаксама як і дасягненняў, і перамог. Але мы здолелі захаваць пачуццё ўласнай годнасці, уласнага самасцвярджэння, уласнага месца і права на гэтай зямлі — пачуццё, якое замацавалася ў нашым генетычным кодзе менавіта 99 год назад.

... А яшчэ мы маем не самую горшую традыцыю — не бэсціць уласнае мінулае, шанаваць яго, вучыцца на ім. І, у рэшце рэшт, — яшчэ адзін выхадны дзень, калі можна пабыць з самымі дарагімі людзьмі, сабрацца ў цёплым утульным пакоі, каб разам паглядзець стары добры фільм. Позняй восенню чалавеку асабліва патрэбна адчуванне дома і Радзімы.

**Алена ЛЯЎКОВІЧ.** alena@zviazda.by

■ Падпіска-2016

# Прыцягненне Карэліцкага краю

**Вядома, варта не забываць пра ваколіцы сталіцы, але ж насамрэч сапраўднага журналіста вабяць далёкія дарогі. Таму выпраўляемся ў самыя розныя куткі нашай цудоўнай краіны, каб як мага больш людзей даведаліся (калі яшчэ не ведаюць) пра нашу газету. Нас чакаюць даўнія падпісчыкі, сапраўдныя сябры выдання. Таму і сустрэчы атрымліваюцца цікавыя, змястоўныя, душэўныя.**

Так, прынамсі, атрымалася і падчас нашага Дня падпісчыка, які прайшоў у пасёлку Лясны. На наступным тыдні накіроўваемся на Гродзеншчыну — у самабытны і прыгожы Карэліцкі раён (адзін Мірскі замак — сапраўдная візітоўка Беларусі — чаго варты!). Адметныя гэтыя мясціны гістарычнымі каштоўнасцямі, прыродай і, зразумела, людзьмі — працавітымі і гасціннымі. У чым мы хутка ў чарговы раз пераканаемся. Дзень падпісчыка газеты «Звязда» адбудзецца ў некалькіх месцах. **10 лістапада з 11 да 12 гадзін сустрэчы адбудуцца ў Карэліцкім раённым цэнтры сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва. Пасля — з 12 да 15 гадзін мы чакаем вас у раённым вузле паштовай сувязі.** Прыходзьце — ёсць пра што пагаварыць!

# Парк унікальных тэхналогій і вопыту

**Мінскаму гарадскому тэхнапарку споўнілася пяць гадоў. За гэты час ранейшы будынак былога мясаперапрацоўчага завода стаў пляцоўкай, дзе рэалізуюцца адны з самых унікальных інавацыйных праектаў для нашай краіны.**

— Калі я толькі прыйшла сюды, то ўбачыла пустыя, няўтульныя памяшканні, якія патрабавалі рамонту, — падзялілася ўспамінамі **намеснік старшыні Мінгарвыканкама Жанна БІРЫЧ**. — І мне вельмі радасна, што плённая праца дапамагла прыцягнуць людзей, якія сёння рэалізуюць тут праекты, атрымліваюць прыбытак і займаюцца стваральнай дзейнасцю.

Цяпер на тэрыторыі парка працуе 31 рэзідэнт. Кампаніі займаюцца самымі рознымі кірункамі — ад тэхналогій у галіне авіябудоўлі і навігацыі да распрацоўкі самага сучаснага медыцынскага абсталявання.

— Сёлета мы мяркуем завяршыць 1-ю, 2-ю і 7-ю чэргі комплекснай рэканструкцыі комплексу, — падзяліўся планамі **дырэктар Мінскага гарадскога тэхнапарка Уладзімір ДАВІДОВІЧ**. — Гэта дазволіць выдзеліць для работы дадатковыя 15 тысяч квадратных метраў памяшканняў. Такім чынам, у 2018-2020 гадах тут змогуць займацца інавацыйнай дзейнасцю прыблізна 80 прадпрыемстваў адначасова.

Сярод новых будынкаў, якія хутка павінны перайсці ў эксплуатацыю, ёсць вытворчыя корпусы, аналагаў якім не існуе ў краіне. Унікальнасць гэтых плошчаў у тым, што яны ўніверсальныя, а не збудаваны пад нейкага пэўнага карыстальніка. У будынку шэсць аднатыпных боксаў з аўтаномнай сістэмай электраасілкавання, вентыляцыі, ацяплення і іншых неабходных умоў. Такім чынам, тэарэтычна ў адным будынку можа камфортна існаваць шэсць асобных прадпрыемстваў. Калі арандатар здымае для вытворчасці бокс на пяць гадоў і потым сыходзіць, то на яго месца без ніякіх дадатковых перабудаванняў можа адразу ўладкавацца новы рэзідэнт з падобнай тэхналогіяй вытворчасці. Будынкі яшчэ дапрацоўваюцца, але на іх ужо настолькі вялікі попыт, што ўтварылася чарга.

Да пяцігоддзя тэхнапарка таксама прымеркавана адкрыццё Міжнароднага форуму студэнцкай і вучнёўскай моладзі «Першы крок у навуку — 2016». Ён дае маладым навукоўцам з усёй Беларусі магчымасць расказаць пра свае праекты, абмяняцца вопытам, выслухаць парады журы. Такім чынам, школьнікі, студэнты і магістранты могуць загадзя вызначыць, у якім кірунку развівацца далей і, магчыма, планаваць свой бізнес.

**Рагнеда ЮРГЕЛЬ.** *yurgel@zviazda.by*

■ Форум

# ЗЯЛЁНАЕ СВЯТЛО ДЛЯ БІЗНЕСУ

**Наша краіна можа выйсці на лінію эканамічнага росту пры выкананні ўмовы павышэння эфектыўнасці вытворчасці. Аб гэтым, у прыватнасці, ішла гаворка на Кастрычніцкім эканамічным форуме, які праходзіў у Мінску. Намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Мікалай СНАПКОЎ назваў у ліку дзяржаўных прыярытэтаў забеспячэнне росту інвестыцый у навуку і адукацыю, прастату і даступнасць фінансавання для малога прадпрымальніцтва, а таксама стварэнне ўнутранага камфортнага асяроддзя для інвестыцый і бізнесу.**

У сваю чаргу **першы намеснік міністра эканомікі Аляксандр ЗАБАРОЎСКІ** на гэтым форуме адзначыў, што вельмі важна, каб «нашых інструментаў эканамічнай палітыкі было дастаткова, каб на выпадак пагаршэння сітуацыі ў нас былі рэзервы і магчымасці для падтрымання эканамічнага росту». Галоўную стаўку ў гэтым першы намеснік міністра робіць на прагноз з паступовым аднаўленнем росту, які будзе падтрымлівацца рознымі фіскальнымі інструментамі пры адначасовай рэалізацыі комплексу мер па павелічэнні патэнцыйнага ВУП.

«Асноўныя меры макраэканамічнай палітыкі сёння накіраваны на павелічэнне патэнцыйнага ВУП і магчымасці эканомікі збалансаванага росту. Зараз паваротны пункт макраэканамічнай дынамікі», — упэўнены Аляксандр Забароўскі. Вытрыманы макраэканамічны баланс, захоўваецца мінімальная інфляцыя за апошнія 5 гадоў (8,3% за студзень—верасень), збалансаваны знешні гандаль, растуць золатавалютныя рэзервы, а бюджэт выкананы з прафіцытам.

Спадар Забароўскі ўпэўнены, што важным сігналам да паляпшэння сітуацыі стала спыненне падзення прамысловай вытворчасці ў ключавых сектарах. А ключ да павелічэння росту будзе ў аднаўленні інвестыцый, але не за кошт бюджэтных сродкаў, а за кошт інстытутаў фінансавага рынку, у тым ліку — прамых замежных і ўнутраных інвестыцый. Сярод іншых фактараў ён назваў зніжэнне ставак па крэдытах і фінансавае аздараўленне прадпрыемстваў. «Ювелірная расчыстка даўгоў пры мінімальным задзейнічанні бюджэту — адна з ключавых задач для забеспячэння нармальнага росту», — адзначыў Аляксандр Забароўскі.

Ён падкрэсліў важнасць работы з усім сектарам дзяржпрадпрыемстваў, а таксама адзначыў, што ў сталіцы гэтымі днямі ўжо пачала працаваць тэхнічная місія МВФ па праблемах дзяржпрадпрыемстваў.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

■ Добрыя навіны

## ПАДАРУНАК ДА СВЯТА

Ён падзякаваў генеральнаму дырэктару адкрытага акцыянернага таварыства «Будтрэст №35 г. Мінска» Валерыю Крупінскаму за тое, што яго падначаленыя своечасова, у сціслыя тэрміны, узвялі новы дом для юных грамадзян і ўручыў яму Ганаровую грамату Мінаблвыканкама. Сямён Шапіра таксама канстатаваў, што з кожным годам шліфуецца майстэрства будаўнікоў, павышаецца якасць работ на сацыяльных аб'ектах.

— З 2011-га па 2016 год у вобласці пабудавана 14 дзіцячых садкоў, яшчэ 9 рэканструявана. Гэта работа будзе працягвацца. Мы бачым неабходнасць і ў тым, каб развіваць сетку прыватных дзіцячых садкоў, — паведаміла **начальнік упраўлення адукацыі Мінаблвыканкама Галіна КАЗАК**. — На тэрыторыі Бараўлянскага сельскага Савета ёсць адна дашкольная дзіцячая ўстанова прыватнай формы ўласнасці. У Мінскім раёне такіх тры. Праграмай развіцця дашкольнай адукацыі кожны год прадугледжана адкрыццё новых садкоў, у тым ліку і за кошт прыватнага інвестара. Ужо практычна гатовы дзіцячыя садкі ў вёсках Прылукі і Копішча адпаведна на 150 і 230 месцаў. Для іх дакупляецца абсталяванне, інвентар, камплектуюцца штаты. Першых наведвальнікаў, мяркуецца, яны прымуць у студзені-лютым 2017 года.

## І КОМПЛЕКС «STREET WORKOUT»

**У Віцебскай вобласці ў пачатку лістапада здалі ў эксплуатацыю некалькі аб'ектаў сацыяльнага прызначэння.**

У абласным цэнтры на тэрыторыі СШ №6 адкрылі спартыўную пляцоўку з комплексам трэнажораў для заняткаў стрыт-воркаўтам. Апошняе ў перакладзе з англійскай мовы значыць «вулічная трэніроўка». У апошнія гады гэты від спорту ўсё больш папулярны сярод падрастаючага пакалення.

Паводле інфармацыі галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Віцебскага аблвыканкама, у двух аграрных гарадках Віцебскага раёна запрацавалі станцыі абезжалезвання. Цяпер у Капцях і Бабінавічах для ачысткі вады выкарыстоўваецца сучаснае абсталяванне.

Нямала зроблена і для медыцыны. Напярэдадні ў Віцебску адбылося адкрыццё пасля капітальнага рамонту жаночай кансультацыі №3. Да канца года плануецца ўвесці ў строй капітальна адрамантаваныя тэрапеўтычны і акушэрска-гінекалагічны корпусы Докшыцкай цэнтральнай раённай бальніцы...

## ШКЛО ЗАХАВАЕ ЦЯПЛО

**Пуск новай высокатэхналагічнай аўтаматызаванай лініі адбудзецца на наступным тыдні на базе адкрытага акцыянернага таварыства «Гомельшкло». На прадпрыемстве пачынаюць выпускаць энергазахавальнае, сонцаахоўнае, мульціфункцыянальнае і іншыя віды шкла.**

Падчас рэалізацыі першай фазы (лістапад 2016 г.), запланавана выйсці на 60% магутнасці і пачаць выпуск энергазахавальнага шкла. Другая фаза вытворчага працэсу, якая павінна адбыцца ў пачатку 2017 года, прадугледжвае запуск 100% магутнасці лініі і вытворчасць як энергазахавальнага, так і мульціфункцыянальнага і сонцаахоўнага шкла. Шырокае ўжыванне шкла з такім пакрыццём дазволіць значна зменшыць страты цяпла ў будынках, кватэрах і дамах, якія адбываюцца праз аконныя праёмы — губляецца да 40% цеплавой энергіі. Да таго ж, расказалі спецыялісты прадпрыемства, наяўнасць каляровай гамы нанесеных пакрыццяў надае фасадам будынкаў эстэтычныя ўласцівасці экстэр'ера.

Запуск новай тэхналагічнай лініі дазволіць гомельскаму прадпрыемству цалкам забяспечыць запатрабаванні айчыннага рынку ў энергаэфектыўным шкле, значна скарочыць долю імпарту. Каля 60% аб'ёму плануецца рэалізоўваць на ўнутраным рынку, астатняе пастаўляць на экспарт.

## МУЗЕЙ І АРЭНА

**У Магілёўскай вобласці адкрываецца шэраг новых аб'ектаў**

У Крычаве, напрыклад, прымеркавалі да гэтай даты ўвод у строй 40-кватэрнага дома ў мікрараёне Камсамольскі. Дом цагляны, з поўным аздабленнем, так што клопатаў з рамонтам у навасёлаў не будзе. Ключы ад кватэр атрымаюць гараджане, якія стаяць на ўліку для паляпшэння жыллёвых умоў, а таксама маладыя спецыялісты. Месца вельмі зручнае — побач дзіцячы садок, крама, парк, дзіцячая пляцоўка, кавярня. Дарэчы, гэта першы арэндны дом, пабудаваны ў райцэнтры. «У нас шмат жадаючых атрымаць кватэру, але жылля з дзяржаўнай падтрымкай будуецца недастаткова. Арэндны дом — гэта адзін з выхадаў з жыллёвай праблемы», — кажа **намеснік старшыні райвыканкама Дзмітрый КЛІМЯНКОЎ**.

А ў Круглянскім раёне на базе этнакомплексу «Мікалаеўскія сажалкі» працягваецца працэс стварэння самага ўнікальнага ў Беларусі музея «Назад у СССР». Галерэя, дзе прадстаўлены рэчы савецкіх часоў, падоўжылася на 12 метраў. Новыя экспазіцыі прысвечаны школе, гандлю, медыцыне, спорту, гадзіннікам, веламотатранспарту. Музей ствараецца выключна сіламі Круглянскай ПМК-266.

Слаўгарадскі раён адкрывае ў вёсцы Пацяраеўка дзіцячы цэнтр лагічнага мыслення. На чарзе адкрыццё Лядовай арэны ў Шклове і моста цераз Днепр у Магілёве, якія адбудуцца ўжо пасля 10 лістапада.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ, Аляксандр ПУКШАНСКІ, Ірына АСТАШКЕВІЧ, Нэлі ЗІГУЛЯ**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

# «ЛІСТАПАД» АФІЦЫЙНА АДКРЫТЫ

## І з сённяшняга дня пачынаюцца конкурсныя паказы

**Госці кінафестывалю прайшліся па чырвонай дарожцы, вядучыя прадставілі сем саставаў журы, свайго ўладальніка знайшоў спецыяльны прыз Прэзідэнта «За захаванне і развіццё традыцый духоўнасці ў кінамастацтве», зала кінатэатра «Масква» аддала даніну памяці ганароваму старшыні кінафестывалю Расціславу Янкоўскаму, што пайшоў з жыцця ў чэрвені, і класіку беларускага кінематографа Віктару Тураву, якому ў гэтым годзе споўнілася б восемдзесят гадоў. Рэжысёр Аксана Бычкова прадставіла фільм адкрыцця «Пецярбург. Толькі па любові». Мы чакалі, калі гэта можна будзе сказаць, і вось нарэшце — ХХІІІ Мінскі міжнародны кінафестываль «Лістапад» адкрыты.**

Нягледзячы на пэўныя цяжкасці, з якімі сутыкнулася дырэкцыя форуму ў гэтым годзе, «Лістапад» — і людзі, што за ім стаяць — выстаялі, справіліся. Галоўнае тут, канешне, — фільмы, у той час як цырымоніі застаюцца фармальнасцю, але тым не менш, адкрыццё — важны рытуал. У кінатэатры «Масква» намеснік прэм'ер-міністра Наталля Качанава агучыла прывітанне Прэзідэнта ўдзельнікам і гасцям кінафоруму, старшыня кінафестывалю Генадзь Давыдзька разбіў талерку аб штатыў кінакамеры, прагучала шмат цёплых і, як належыць сітуацыі, урачыстых слоў у адрас кінафестывалю і яго значнасці. На жаль, не ўсе традыцыі мы змаглі захаваць у гэтым годзе, і знікла якраз адна з самых чуллівых — сёлета на сцэне кінатэатра ўжо не прагучаў верш у выкананні Расціслава Янкоўскага, што адкрываў фестываль усе дваццаць тры гады. «Масква» замест гэтага ўбачыла яго на экране ва ўрыўках з яго акцёрскімі ролямі.

У нейкім сэнсе інтрыгай цырымоніі адкрыцця кінафестывалю «Лістапад» з'яўляецца імя будучага ўладальніка спецыяльнага прыза Прэзідэнта. У мінулым годзе яго атрымаў рэжысёр Вадзім Абдрашытаў, у пазамінулым — рэжысёр і акцёр Станіслаў Гаварухін. Сёлета прэстыжная ўзнагарода была ўручана вядомаму купалаўцу — савецкаму і беларускаму акцёру тэатра і кіно, народнаму артысту Беларусі і СССР Генадзю Аўсяннікаву. І на гэты раз менавіта ён са сцэны кінатэатра прачытаў верш.

З сённяшняга дня пачынаюцца паказы шасці конкурсных праграм (пазаконкурсныя фестывальныя фільмы дэманструюцца ўжо з учарашняга дня) — гэта 83 работы з больш як 160. У раскладзе можна знайсці цэлы шэраг фестывальных хітоў кшталту работ Джыма Джармуша, братоў Дардэн, Ксаўе Далана, Крысціяна Мунджыу, Кена Лоўча, Джанфранка Розі, Асгара Фархадзі, шмат нашумелых работ кшталту фільмаў «Мой сябар Барыс Нямцоў» Зосі Радкевіч, «Жанчына, якая сышла» Лава Дзіяса, «Я не мадам Бавары» Фэна Сяагана. Ужо трэці раз на «Лістападзе» пройдзе Нацыянальны конкурс, які поўнасцю складаецца з работ беларускіх аўтараў. Дарэчы, сёлетнія лаўрэаты атрымаюць у якасці ўзнагароды тэхнічную дапамогу — здымачнае абсталяванне і паслугі постпрадакшн для рэалізацыі наступнай ідэі. Не трэба забываць і пра яшчэ адну важную частку «Лістапада» — індустрыяльную платформу, якая будзе накіравана на развіццё сферы кіно ў Беларусі і разуменне яе месца ў міжнародным кантэксце.

Фільмам закрыцця — і гэта яшчэ адзін гонар фестывалю — стане апошняя работа класіка сусветнага кіно польскага рэжысёра Анджэя Вайды «Астаткавыя вывы», якая трапіла ў лонг-ліст прэтэндэнтаў на суісканне прэміі Оскар.

Усё гэта кінабагацце, у якое можна акунуцца з галавой, будзе доўжыцца да 11 лістапада.

**Ірэна КАЦЯЛОВІЧ.**
*katsyalovich@zviazda.by*

■ Партрэт

# ПЕРШЫ ШЛЮБ — У 27 ГАДОЎ, ДРУГІ — У 40

## Некалькі фактаў пра нашых мужчын

**Сёння адзначаецца Сусветны дзень мужчын. З гэтай нагоды Белстат склаў партрэт сярэднестатыстычнага беларуса.**

Сярэдні ўзрост нашых мужчын — 37,3 года. Цікава, што гарадское насельніцтва на чатыры гады маладзейшае за вясковае (сярэдні ўзрост гарадскіх мужчын — 36,2 года, сельскіх — 40,9). Большасць беларусаў моцнага полу (65 працэнтаў) знаходзіцца ў працаздольным узросце, кожны шосты — пенсіянер. Яшчэ 19 працэнтаў — дзеці і падлеткі да 16 гадоў.

Чаканая працягласць жыцця сярод мужчын вырасла да 68,6 года. Але беларускі па-ранейшаму жывуць у сярэднім на 10 гадоў больш. Хоць з 2005-га разрыў у гэтых паказчыках для мужчын і жанчын скараціўся ў два гады.

Летась у шлюб уступілі 82 тысячы нашых суайчыннікаў, прычым 22,5 тысячы з іх (27 працэнтаў) аказаліся ў загсе не першы раз. Большасць вырашае стварыць сям'ю ў 25—29 гадоў: у гэтым узросце ажаніўся кожны трэці. А кожны чацвёрты думае, што са шлюбам лепш не зацягваць, і становіцца жаніхом у 20—24 гады. Паўторны шлюб заключаюць у сярэднім у 40,9 года. Летась 1,2 тысячы беларускіх мужчын выбралі нявесту з Расіі, 711 — з Украіны, 33 — з Літвы, 20 — з Латвіі, 12 — з Ізраіля.

Кожны трэці прадстаўнік моцнага полу лічыць сваё здароўе добрым. Праўда, фізкультурай і спортам займаецца толькі чвэрць мужчын. А вось курыць амаль палова (каля 47 працэнтаў).

Усяго на пачатак года ў краіне налічвалася 4 420 тысяч мужчын. Гэта 46,5 працэнта ад агульнай колькасці насельніцтва.




А якімі беларускіх мужчын бачаць жанчыны? І хто для іх ідэал? Дамам слова.

**Наталля АЎДЗЕЕВА, старшыня Беларускага прафсаюза работнікаў культуры, інфармацыі, спорту і турызму:**

— Няважна, дзе і кім мужчына працуе. Галоўнае, каб на яго можна было паспадзявацца. Ведаеце, як кажуць, «надзейнае плячо». Гэта не значыць, што ў мужчыны абавязкова павінна быць шмат грошай ці высокі статус. Можна займаць адказную пасаду і пры гэтым аказацца ненадзейным чалавекам. Мужчына павінен паважаць жанчыну, быць сябрам, і толькі пры такім мы можам быць і слабымі, і моцнымі — як захочам. Гэта для мяне самыя галоўныя якасці ў любым мужчыне.

**Жанна КАПУСНІКАВА, мастачка:**

— Ці адрозніваюцца нашы мужчыны ад заходніх? На самай справе не, яны такія ж. Людзі ўсюды аднолькавыя. У маім разуменні мужчына павінен быць добрым, разумным і шчодрым. Сутнасць не ў колькасці грошай, а ў жаданні імі падзяліцца: бедны чалавек таксама можа быць шчодрым.

**Ганна БОНД, тэлевядучая:**

— Беларускі мужчына змяніўся. Некаторыя працягваюць быць сапраўднымі мужыкамі — працуюць у полі, на заводзе, прыносяць карысць краіне. А ёсць метрасексуалы. Як з імі змагацца — вялікае пытанне. Гэта асаблівы індывід, за імі патрэбны вялікі догляд. Усе кажуць: «Жанчыны распесціліся»... Але не ў гэтым справа. Мужчына мяняецца, таму што цяпер час тэхнічных навінак. Яму не вельмі патрэбна жанчына, бо ёсць інтэрнэт, шматлікія гаджэты. Мужчына перакачаваў у віртуальнае жыццё. Думаю, жанчыне сёння складаней выйсці замуж, чым гэта было пяць гадоў таму.

Ідэальны вобраз для мяне — гэта прыстойны мужчына, які трымае сваё слова, пажадана без шкодных звычак (алкаголь, азартныя гульні). І каб ён разумеў, што такое сям'я.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**
*lubneuskaya@zviazda.by*

■ Наша здароўе

# УЖЫВАННЕ ЁДАВАНАЙ СОЛІ ПРЫНЕСЛА ПЛЁН

**Захворванні шчытападобнай залозы сустракаюцца практычна ў 30 працэнтаў насельніцтва планеты. Самымі распаўсюджанымі застаюцца дыфузны валляк, звязаны з дэфіцытам ёду, вузлавыя ўтварэнні, аўтаімунная паталогія. Калі вы рэгулярна наведваеце тэрапеўта, вам няма чаго баяцца: спецыяліст ведае, у якіх выпадках вас трэба накіраваць да вузкага спецыяліста — эндакрынолага — для больш дэталёвага абследавання. У абавязковым парадку абследуюцца толькі дзеці, жанчыны, якія плануюць цяжарнасць, і цяжарныя, а таксама пацярпелыя ад аварыі на Чарнобыльскай АЭС.**

— З пачатку 2000-х у краіне праводзіцца актыўная работа па ліквідацыі дэфіцыту ёду з дапамогай найбольш эфектыўнага метаду масавай прафілактыкі — ужывання ёдаванай солі, — тлумачыць **прафесар кафедры эндакрыналогіі Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта, доктар медыцынскіх навук Ала ШАПЛЯЛЬКЕВІЧ**. — 96 працэнтаў нашай солі ёдаваная. Вынікі ўкаранення стратэгіі ліквідацыі ёдавага дэфіцыту ў Беларусі дазволілі Міжнароднаму камітэту па кантролі за ёдадэфіцытнымі захворваннямі і Глабальнай сетцы па ёдзе ўключыць нашу краіну ў пералік краін, якія дасягнулі мэтавага ўзроўню забеспячэння харчавання ёдам. У выніку з 2000 па 2015 год знізілася і пярвічная захваральнасць на вузлавы і эндэмічны валляк...

На працягу апошніх пяці гадоў адзначаецца зніжэнне паказчыка як пярвічнай захваральнасці, так і агульнай колькасці дзяцей з дысфункцыяй шчытападобнай залозы. Самым распаўсюджаным захворваннем шчытападобнай залозы ў дзяцей з'яўляецца дыфузны валляк — 13 780 пацыентаў ва ўзросце да 18 гадоў. Усе нованароджаныя абследуюцца праз суткі пасля з'яўлення на свет на прыроджаны гіпатырэоз. Сёння мы дасягнулі сярэднееўрапейскага паказчыка па выяўленні гэтага захворвання: 1 выпадак на 4 216 немаўлят. Лячэнне такім дзецям прызначаецца літаральна з двух тыдняў жыцця, што дазваляе пазбегнуць нервова-псіхічнай інвалідызацыі.

Аднак за апошнія 15 гадоў вырасла аўтаімунная паталогія шчытападобнай залозы. Колькасць пацыентаў, у якіх упершыню ў 2015-м выявілі гіпатырэоз, вырасла з 2000 года ў 4,5 разы, а ў цэлым колькасць такіх пацыентаў — у 7 разоў.

Дыягнастычныя магчымасці тырэоіднай паталогіі ў дарослых і дзяцей значна палепшыліся. Ва ўсіх раёнах рэспублікі праводзіцца ўльтрагукавое даследаванне шчытападобнай залозы, на міжраённым узроўні — гарманальнае даследаванне тырэоіднага статусу. На абласным выконваецца тонкаігольная біяпсія пад кантролем ультрагукавога даследавання, сцынтыграфія залозы. На рэспубліканскім узроўні ў Рэспубліканскім цэнтры медыцынскай рэабілітацыі і бальнеалячэння выконваюцца па паказаннях у складаных выпадках усе неабходныя даследаванні. З мінулага года на базе цэнтра даступнае тэлемедыцынскае кансультаванне па раздзеле «Цыталогія».

Асноўнымі прэпаратамі для лячэння захворванняў шчытападобнай залозы з'яўляюцца прэпараты ёдыду калію, сінтэтычныя аналагі леватыраксіну (у тым ліку айчыннай вытворчасці), тырэастатычныя прэпараты. Усе неабходныя віды лекаў даступныя ў аптэчнай сетцы.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**
*protas@zviazda.by*

■ У рэжыме анлайн

# Пра небяспеку папярэдзяць... «Аднакласнікі»?

**Расійская сацыяльная сетка дадала ў свой сайт і мабільныя праграмы новую функцыю — папярэджанне пра надзвычайныя сітуацыі. Пры яе дапамозе карыстальнікі змогуць атрымаць усю неабходную актуальную інфармацыю і ўпэўніцца ў тым, што сябры і блізкія знаходзяцца ў бяспецы.**

Праект быў створаны ў супрацоўніцтве сацыяльнай сеткі і МНС Расіі, аднак у хуткім часе павінен запрацаваць і ў Беларусі. Прынцып дзеяння просты: падчас стыхійных бедстваў і катастроф праграма будзе рассылаць апавяшчэнні ўсім карыстальнікам, якія, згодна з дадзенымі GPS і інфармацыяй, указанай у профілі, знаходзяцца ў зоне надзвычайнага здарэння. Разам з гэтым адрасат будзе атрымліваць нумары экстранных службаў і карысную інфармацыю аб тым, як весці сябе ў канкрэтнай сітуацыі. Акрамя таго, функцыя дасць магчымасць карыстальнікам, якія знаходзяцца ў зоне бедства, устанаўліваць статус «Я ў бяспецы» (які будзе бачны сябрам) і аператыўна даведвацца, хто са знаёмых аказаўся ў раёне надзвычайнай сітуацыі.

— Падобная функцыя ўжо рэалізавана ў нашай уласнай мабільнай праграме «МНС: дапамога побач!», — каменцconfigure **прэс-сакратар МНС Беларусі Віталь НАВІЦКІ**. — Акрамя паведамленняў пра надвор'е, там таксама рэалізавана функцыя папярэджанняў пра надзвычайныя сітуацыі ў форме, зручнай для карыстальнікаў.

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.**
*lyskavets@zviazda.by*

■ Будзь у курсе!

# На Гомель — хутка і з камфортам

**Беларуская чыгунка пашырае магчымасці камфортных паездак паміж Мінскам і Гомелем.**

У сувязі з павелічэннем пасажырапатоку і для забеспячэння праезду пасажыраў на ўчастку Мінск — Гомель магістраль з 4 лістапада ў выхадныя дні ў два разы павялічвае колькасць месцаў у электрапоездзе міжрэгіянальных ліній бізнес-класа InterCity.

Здвоеным саставам (7+7) поезд №708 будзе адпраўляцца з Мінска 5,6 і 7 лістапада, а з 11 лістапада цягнік у колькасці 14-ці вагонаў будзе курсіраваць па Беларускай чыгунцы па пятніцах, суботах і нядзелях, расказалі ў прэс-цэнтры магістралі.

Поезд №707 Гомель — Мінск павялічаным саставам будзе адпраўляцца з Гомеля 5,6,7 і 8 лістапада, а з 12 лістапада — штотыдзень па суботах, нядзелях і панядзелках. Поезд №710 у колькасці 14-ці вагонаў прызначаны на 5, 6 і 7 лістапада, а з 11 лістапада штотыдзень ён будзе курсіраваць па пятніцах і нядзелях. У адваротным кірунку поезд №709 здвоеным саставам будзе курсіраваць 5,6 і 7 лістапада, а з 11 лістапада на ім можна будзе дабірацца з Гомеля ў Мінск штотыдзень па пятніцах і нядзелях.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

■ Дзеці адной зямлі

# Феномен этнічнай цярпімасці

## Талерантнасць — не данасць, а сумесная праца дзяржавы і грамадства

**Сучасная Беларусь — краіна, дзе ў згодзе і ўзаемапаваге ўжываецца больш за 125 нацыянальнасцяў, а высокі ўзровень талерантнасці беларусаў — гэта ўжо традыцыя, якая склалася з часоў Сярэднявечча. Пры гэтым прадстаўнікі этнічных груп, што жывуць у нашай краіне, адчуваюць абароненасць і, не забываючыся на сваю нацыянальную прыналежнасць, лічаць сябе найперш грамадзянамі Беларусі. Такія думкі выказвалі ўдзельнікі «круглага стала» «Роля і месца нацыянальных аб'яднанняў у захаванні і ўмацаванні міру і згоды ў Рэспубліцы Беларусь», на якім прысутнічалі прадстаўнікі больш як 30 нацыянальных аб'яднанняў.**

### Адкрытая нацыя

Адсутнасць міжнацыянальных канфліктаў у нас успрымаецца ўжо як нешта само сабой зразумелае і непарушнае і ніякі інфармацыйны негатыўны ўкід не прывядзе да рэзкага паніжэння талерантнасці. Аднак нельга забывацца, што на меркаванне і развіццё сучаснага грамадства ўплывае ўсё, што адбываецца навокал.

— З аднаго боку мы захоўваем талерантнасць, а з іншага — не жывём на востраве, і розныя з'явы ў суседзяў могуць па-рознаму ўплываць на нас. Мы ў стане падтрымліваць стабільнасць, якой дасягнулі за стагоддзі свайго развіцця. Аднак важна памятаць, што стабільнасць і талерантнасць — гэта не адвечны дар ці факт, які вызначае наша існаванне. Гэта пастаянная праца на ўзроўні дзяржавы і грамадства, — падкрэсліў **Сяргей ГРУНТОЎ, навуковы супрацоўнік аддзела нарадазнаўства Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.**

Спрадвеку на нашых землях практыкаваўся вопыт суіснавання розных этнічных суполак. У фарміраванні беларускай культуры на працягу XV—XVI стагоддзяў і да нашага часу ўдзельнічаюць самыя розныя этнічныя і канфесійныя групы. Пра гэта сведчаць і шматлікія архітэктурныя помнікі, што захаваліся на нашай тэрыторыі.

— На працягу стагоддзяў суіснаваць бесканфліктна на адной тэрыторыі ўдавалася дзякуючы таму, што этнічныя суполкі былі арганічна ўключаны ў жыццё дзяржавы і грамадства. У кожнага была свая ніша. Татар, напрыклад, запрашалі як ваеннае саслоўе, каб яны дапамагалі ахоўваць межы, яўрэяў — каб развіваць гандаль і рамёствы, — разважае Сяргей Грунтоў. — Паўплывала на захаванне традыцый талерантнасці і бесканфліктнасці і існаванне ў Савецкім Саюзе — адзінай дзяржаве з адзінай мовай. Беларуская нацыя фарміравалася на працягу XIX—XX стагоддзяў як надрэлігійнае грамадства. Гэта азначае, што этнічная група, якая пераўтварылася ў нацыю, была здольнай прымаць у сябе прадстаўнікоў любых канфесій. Беларусь як нацыя — гэта феномен этнічнай цярпімасці. У XX стагоддзі беларусамі станавіліся не толькі этнічныя беларусы, але і яўрэі, украінцы, татары. Яна адкрыта для кожнага чалавека, які хацеў у ёй удзельнічаць.

### Неад'емная частка — этнічныя суполкі

Разважаючы пра ролю і ўплыў нацыянальных аб'яднанняў у справе ўмацаванне міру і згоды ў краіне, прысутныя падкрэслівалі важнасць існавання дыялогу паміж дзяржавай і грамадствам і падтрымкі ўладамі развіцця нацыянальных суполак у Беларусі.

— Нас ведаюць далёка за межамі краіны, на нашых гістарычных радзімах. Мы ўдзельнічаем у агульных мерапрыемствах і расказваем аб палітыцы, што праводзіцца ў Беларусі ў дачыненні да нацыянальных арганізацый. Пераймаючы ў суседзяў лепшае, мы паказваем, як трэба жыць у міры, сяброўстве і міжнацыянальнай згодзе, — адзначыў **Георгій ЕГІАЗАРАН, старшыня Мінскага гарадскога армянскага культурна-асветніцкага грамадскага таварыства «Айастан», старшыня Кансультацыйнага міжэтнічнага савета пры Упаўнаважаным па справах рэлігій і нацыянальнасцяў.** — Калі чалавек любой нацыянальнасці не госць у краіне, ён усё робіць на яе карысць, бо ён тут дома, хоць і належыць да іншай нацыянальнай групы. І мы адчуваем тут сябе сваімі.

— Сферу інтарэсаў нацыянальных супольнасцяў нельга пакідаць без увагі. Гэтую думку падкрэсліваюць міжнацыянальныя канфлікты, якія, часам, прыводзяць да трагедый на тэрыторыях дзяржаў, і нават нашых бліжэйшых суседзяў, — падкрэсліў **міністр юстыцыі Алег СЛІЖЭЎСКІ.** — Перыядычна мы праводзім семінары, куды запрашаем прадстаўнікоў, каб растлумачыць ім нормы дзеючага заканадаўства, змены ў ім. У сваёй рабоце, асабліва напачатку, яны сутыкаюцца з пытаннямі, як весці дакументы, як арганізаваць работу, як прымяняць нарматыўна-прававыя акты і іншае. Каб не прымаць пасля санкцыі ў іх дачыненні, мы стараемся зрабіць так, каб парушэнні не адбываліся па няведанні. З 2700 існуючых у краіне грамадскіх аб'яднанняў 113 арганізацый, якія аб'ядноўваюць нацыянальныя меншасці. А калі лічыць і афіцыйна зарэгістраваныя арганізацыйныя структуры аб'яднанняў, атрымліваецца больш за 40 тысяч грамадскіх фарміраванняў. Гэта сведчанне актыўнага развіцця сучаснага грамадства.

Кожная этнічная група не існуе спантанна. Яна заяўляе аб сабе ў формах, зразумелых грамадству: танцах, песнях, перакладной літаратуры. А беларускае ноу-хау — прадстаўляць на міжнародных фестывалях не толькі айчыннае нацыянальнае майстэрства, але і культурныя здабыткі этнічных груп, што пражываюць у краіне, выклікае пазітыўную рэакцыю ў гледачоў. Этнасуполкі могуць развівацца і захоўваць сваю самабытнасць, адчуваць бяспеку, а беларусы, далучаючыся да іх культуры, могуць узбагачаць свой светапогляд, адзначалі ўдзельнікі «круглага стала».

**Ірына СІДАРОК.**
*sidarok@zviazda.by*

■ Працяг тэмы

# ЦІ ЁСЦЬ АЛЬТЭРНАТЫВА?

**У чэрвені на старонках «Звязды» быў надрукаваны матэрыял «Труба супрацьстаяння», прычынай для напісання якога стаў зварот жыхароў аднаго з пад'ездаў дома №6 па Віцебскім праспекце. У доме праводзіцца капрамонт, і праектам прадугледжана замена сістэм ацяплення, халоднага водазабеспячэння і каналізацыі. Раней водаправодная і каналізацыйная трубы былі агульнымі для дзвюх сумежных кватэр і знаходзіліся ў спецыяльнай нішы адной з іх. Зараз плануецца прапусціць дадатковую трубу дыяметрам 110 міліметраў праз санвузлы іх кватэр, дзе яе раней не было. Гэта паменшыць і без таго малую іх плошчу, якая складае ўсяго 2,97 квадратнага метра. Жыхары выступілі супраць. Яны аргументуюць тым, што ніхто не пацікавіўся іх меркаваннем і што гэты праект пагаршае іх жыллёвыя ўмовы. Між тым праз суд камунальнікі прымушаюць уласнікаў кватэр забяспечыць допуск у іх памяшканні для правядзення рэканструкцыі.**



У гэту нішу яшчэ адзін стаяк (шырокая труба) не памесціцца.

Упраўленне жыллёва-камунальнай гаспадаркі Магілёўскага аблвыканкама прыслала ў рэдакцыю ліст за подпісам намесніка начальніка ўпраўлення А. Цімашэнкі. У ім гаворыцца, што праектна-каштарысная дакументацыя была распрацавана інстытутам Магілёўжылпраект і ніякіх заўваг з боку Дзяржбудэкспертызы па Магілёўскай вобласці не мела. Але рэдакцыя нават не ставіла гэты факт пад сумненне. Размова ішла пра іншае. Ці ёсць у жыхароў альтэрнатыва? Ці можна выкарыстаць нішу, якая існуе, каб правесці стаякі на халодную ваду і каналізацыю, як гэта было раней на дзве кватэры.

Мы звярнуліся па каментарый у Дзяржбудэкспертызу па Магілёўскай вобласці.

Там, спасылаючыся на Тэхнічны кодэкс існуючай практыкі (ТКП ) па рамонце, рэканструкцыі і рэстаўрацыі жылых грамадскіх будынкаў і збудаванняў, патлумачылі, што «замена інжынернага абсталявання павінна адбывацца з улікам фактычнага стану яго элементаў, які вызначаецца візуальным метадам або метадам канструктыўнага інструментальнага абследавання. Тым, хто праводзіў абследаванні, у тэхнічным заключэнні трэба было пазначыць, як функцыянуе гэты стаяк. Адна справа, калі ўрэзка зроблена з боку кожнай кватэры асобна, і зусім іншая, калі ў яго ўразаецца адводная труба, да якой далучаецца сантэхніка дзвюх кватэр. Пры апошнім варыянце адназначна падчас рэканструкцыі павінна быць два стаякі. Але іх можна было б прапусціць разам у прадугледжанай для гэтага нішы, калі, канешне, гэта дазваляюць яе памеры».



Глыбіня нішы 265 міліметраў.

З незалежным экспертам аднаго з магілёўскіх праектных інстытутаў ідзём правяраць гэтую версію. Да жыхароў, не згодных з патрабаваннямі праекта, мы завіталі з раздрукоўкамі сучасных нормаў, дзе агаворваецца, колькі месца патрэбна камунікацыям для нармальнага функцыянавання. Напрыклад, для размяшчэння каналізацыйнай і водаправоднай трубы неабходна шырыня шахты мінімум 350 міліметраў. А для двух стаякоў каналізацыйных і аднаго водаправоднага спатрэбілася б як мінімум 600 міліметраў. Наша задача была высветліць, ці зможа ўмясціцца ў нішы яшчэ адна каналізацыйная труба.

На жаль, шырыня яе аказалася ўсяго 550 міліметраў. Жыхары пагадзіліся з тым, што стаякі не памесцяцца, але выказалі пажаданне, каб ім таксама прабілі нішу, а не забіралі карысную жыллёвую плошчу. Спецыяліст паведаміў, што гэта тэхнічна немагчыма. Бо глыбіня існуючай нішы 265 міліметраў, а калі такую ж прабіць са зваротнага боку, атрымаецца скразны праход.

У абласным упраўленні ЖКГ прытрымліваюцца меркавання, што ў кожнай кватэры павінен быць свой асобны стаяк. Маўляў, калі ён заб'ецца смеццем і ўзнікне неабходнасць яго пачысціць, не прыйдзецца турбаваць суседзяў.

Не на карысць жыхароў першага пад'езда і тое, што ў астатніх пад'ездах ужо цалкам зроблены капрамонт і заменены стаякі. «Уласнікі кватэр №№2, 6, 10 і 14 павінны забяспечыць доступ у свае кватэры для ўсталявання асобнага стаяка каналізацыі», — гаворыцца ў лісце з упраўлення ЖКГ Магілёўскага аблвыканкама.

Як стала вядома рэдакцыі, на 2 лістапада работы па рэканструкцыі ў пад'ездзе ўсё яшчэ не пачыналіся. Але, па словах камунальнікаў, гэта толькі справа часу.

Дарэчы, пасля публікацыі ў «Звяздзе» работнікі ЖЭУ №8 праверылі стан балкона кватэры №15, у якой пабываў карэспандэнт. Знешні выгляд яго выклікаў падазрэнні ў ненадзейнасці. Парэнчы пагнілі, а падлога знаходзілася пад нахілам. Як паведамілі ў ЖЭУ, балкон агледжаны, абноўлена тынкоўка і зроблены рамонт абрамлення. Праўда, стан тынкоўкі на будынку па-ранейшаму выклікае пытанні. На гэта начальнік ЖЭУ Святлана Мангуш паведаміла, што гэты факт у іх на кантролі.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**
*zigulya@zviazda.by*

«ГАРАЧЫ» 287 17 41

# ФЕЕРВЕРК У ЗНАК ПРЫМІРЭННЯ

## Чаму лепш не замоўчваць канфліктную сітуацыю?

**З Карэліцкага раёна на «гарачую лінію» газеты паступіў не зусім звычайны, на першы погляд, зварот. Грамадзянін паскардзіўся на тое, чаго яшчэ... не здарылася. Аднак для заяўніка, па яго словах, праблема была больш чым сур'ёзнай.**

— Хутка Новы год. І кожны раз падчас яго святкавання адбываецца адно і тое ж. Суседзі-дачнікі, якія прыязджаюць у бацькоўскі дом у гэты час, пачынаюць з ночы і ледзьве не да самага ранку забаўляцца з піратэхнікай, феерверкамі. Паміж нашымі хатамі метраў 40, таму ўсё вельмі добра чуваць. А ў мяне жонка інвалід першай групы, сам я перанёс два інсульты. Словам, гэта начная страляніна дастаўляе нам вельмі шмат галаўнога болю ў прамым сэнсе слоў. Спробы пагаварыць з суседам нічым добрым не скончыліся, ён толькі паціскае плячыма ў адказ, — расказаў падрабязнасці сваёй праблемы чытач. І папрасіў дапамагчы разабрацца ў ёй.

З гутаркі было зразумела, што карані канфлікту трэба шукаць у так званым чалавечым фактары: суседзі яўна, як кажуць, нешта не падзялілі. Мы параілі заяўніку звярнуцца ў міліцыю. Праз нейкі час патэлефанавалі **начальніку Карэліцкага РАУС Валерыю САЛАЎЁВУ,** каб даведацца, чым скончылася справа.

Валерый Іванавіч асабіста выязджаў на месца канфлікту, і, паводле яго слоў, адносіны пасля гэтага паміж суседзямі стабілізаваліся. Тым не менш участковым інспектарам даручана па-ранейшаму кантраляваць сітуацыю. Што датычыць увогуле канфлікту, начальнік Карэліцкага РАУС сказаў наступнае:

— Яго грамадзянам не варта замоўчваць, трымаць у сабе. Калі ўзніклі праблемы і іх не атрымліваецца вырашыць самастойна, звяртайцеся да ўчастковых інспектараў міліцыі, тэлефануйце па 102. Калі і пасля ўмяшання супрацоўнікаў праваахоўных органаў сітуацыя не вырашылася, званіце ці запішыцеся на прыём да начальніка міліцыі. Я ўпэўнены, што, па-першае, не кабінетная сустрэча з удзельнікамі канфлікту, а размова на іх уласным двары вельмі дапамагае пагасіць яго. Па-другое, прыцягненне аднаго з бакоў або абодвух да адказнасці нярэдка толькі ўзмацняе негатыўную сітуацыю. Таму я лічу, што заўсёды трэба імкнуцца дапамагчы знайсці найперш паразуменне паміж суседзямі. Упэўнены, мяне ў гэтым падтрымае кожны супрацоўнік міліцыі.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**
*rs@zviazda.by*

# ПАРАД НАДЗЕІ

*(Заканчэнне.
Пачатак на 1-й стар.)*

Вось што ён пісаў у пасляваенных успамінах: «...адзінае, чым вонкава адрозніваўся парад, — гэта адсутнасць дэманстрацыі. Адчувалася, што адбываецца ён ва ўмовах вайны, па ўсім: і па ўзбраенні, і па абмундзіраванні, і па той суровасці, якая бачная была ва ўсіх».

У 8 гадзін раніцы па гучнагаварыцелях СССР, якія ў тыя дні не выключаліся ні днём, ні ноччу, пачуліся ўрачыста-хвалюючыя словы дыктара Юрыя Левітана. На трыбуне маўзалея — Вярхоўны Галоўнакамандуючы Іосіф Сталін, а таксама кіраўнікі савецкай дзяржавы: Молатаў, Малянкоў, Мікаян, Шчарбакоў і іншыя. Прымаў парад герой грамадзянскай вайны Маршал Савецкага Саюза Сямён Будзённы. У кнізе «Сто ваенных парадаў» Сямён Міхайлавіч успамінаў: «У галопе выскокваю на прастору заснежанай Краснай плошчы. Прымаю рапарт камандуючага парадам генерал-лейтэнанта Паўла Арцем'ева. Аб'язджаю з ім выстраеныя войскі. У калонах стаялі радавыя вайскоўцы. Але ў тыя хвіліны яны мне здаваліся цуда-волатамі. Чырвонаармейцы дружна адказвалі на прывітанні. «Ура!» кацілася па Краснай плошчы, гучнае, ваяўнічае, прысягальнае. На трыбунах сабраліся члены ўрада, работнікі партыйных і савецкіх арганізацый, камандзіры Чырвонай Арміі, стаханаўцы, прадстаўнікі савецкай інтэлігенцыі, Усесаюзнага радыё і друку, акрэдытаваныя ў сталіцы карэспандэнты замежных газет.

Пасля выступлення Сталіна зводны аркестр, якім кіраваў аўтар бессмяротнага твора «Развітанне славянкі», кампазітар і дырыжор Васіль Агапкін, зайграў мелодыю «Інтэрнацыянала», а з набярэжнай грымнуў гарматны салют.



**Наш зямляк, генерал-маёр Кузьма Сінілаў, адказваў за падрыхтоўку ваеннага парада на Краснай плошчы.**

У парадзе ўдзельнічалі батальёны курсантаў ваенных вучылішчаў, НКУС, стралковыя, кавалерыйскія і танкавыя падраздзяленні, атрады ўзброеных рабочых Масквы, маракі, эскадроны кавалерыі... У Цэнтральным архіве Міністэрства абароны Расійскай Федэрацыі захоўваецца даведка-даклад каменданта горада Масквы Кузьмы Сінілава, з якога вядома, што парад доўжыўся гадзіну і дзве хвіліны, у ім удзельнічала 69 батальёнаў — 28 467 чалавек, з іх 5520 апалчэнцаў. Узбраенне і ваенная тэхніка былі прадстаўлены 296 кулямётамі, 18 мінамётамі, 12 зенітнымі кулямётамі, 140 артылерыйскімі прыладамі рознай магутнасці, 160 танкамі. Праз дрэннае надвор'е (моцны снегапад, завея, абмежаваная бачнасць) у парадзе не прыняла ўдзелу авіяцыя.

Адразу пасля парада байцы Чырвонай Арміі адправіліся на фронт, для чаго Массавет выдзеліў 14 трамвайных вагонаў. Да месцаў баявых дзеянняў, на перадавую воіны накіроўваліся таксама на машынах ЗІС-5, у пешым страі. Сярод іх былі і нашы землякі. Пра гэта пераканаўча напісаў савецкі паэт Мікалай Старшынаў:

*А над Москвою день небывалый,*
*Светом пронизанный, голубой...*
*Идут к Белорусскому вокзалу*
*От мавзолея — с парада — в бой!*

Ваенны парад атрымаў шырокі міжнародны рэзананс і выклікаў захапленне, а таксама павагу да савецкага народа і яго войска, спрыяў умацаванню міжнароднага прэстыжу СССР. У свой час франтавікі казалі, што без парада надзеі, як называлі яны парадзю 7 лістапада 1941-га, не было б і парада Перамогі 24 чэрвеня 1945 года.

**Мікалай ШАЎЧЭНКА.**




Пролетарии всех стран, соединяйтесь!
Пригласительный билет №1632
Правая трибуна
Тов. Сандлер С.М
На Красную площадь в день празднования 24 годовщины Великой Октябрьской Социалистической Революции 7 ноября 1941 года.
Комиссар гос. безопасности 3-го ранга
(ВЛАСИК)
7 ноября 1941 года
Действителен при пред'явлении паспорта
Проход через ул. Куйбышева, Разина, Москворецкая, Москворецкий мост и Васильевский спуск


**Парад доўжыўся гадзіну і дзве хвіліны, у ім удзельнічала 69 батальёнаў — 28 467 чалавек, з іх 5520 апалчэнцаў.**

■ Векапомнае

# ХАЛАКОСТ: ТРАГЕДЫЯ БЕЗ ТЭРМІНУ ДАЎНАСЦІ

## Амерыканская даследчыца нямецкага паходжання Аніка Вальке напісала кнігу пра генацыд у Беларусі

**Падчас сустрэчы-прэзентацыі ў Нацыянальнай бібліятэцы гісторык, дацэнт універсітэта імя Вашынгтона ў Сент-Луісе расказала, што прымусіла яе вывучаць архівы і запісваць успаміны ахвяр Халакосту, большасць з якіх нарадзілася і вырасла на беларускай зямлі.**

— На жаль, пасля вайны быў шырока распаўсюджаны міф аб тым, што яўрэі не ваявалі, не супраціўляліся, а пасіўна праводзілі час у эвакуацыі і чакалі, пакуль Чырвоная Армія вызваліць краіну, — расказвае Аніка Вальке. — Мне падалося такое абвінавачванне несправядлівым, і я паспрабавала абвергнуць яго менавіта з дапамогай дакладнага гістарычнага даследавання.

Апошнія 15 гадоў Аніка Вальке працавала ў Нацыянальным архіве Беларусі, архівах Германіі, Расіі, Ізраіля, музеі Халакосту ў Вашынгтоне. Паралельна брала інтэрв'ю ў выжыўшых ахвяр Халакосту. Знаходзіла іх у Маскве, Санкт-Пецярбургу, Мінску, іншых беларускіх гарадах. Гэтыя жахлівыя аповеды змешчаны ў кнізе «Піянеры і партызаны: вусная гісторыя нацысцкага генацыду ў Беларусі». У ёй расказваецца аб маладых савецкіх грамадзянах, якія нарадзіліся ў позні 1920-я — ранніх 1930-я гады, апісваецца іх жыццё да, падчас і пасля Другой сусветнай вайны. Аўтар акцэнтуе ўвагу на тым, як яны, у асноўным на акупаванай тэрыторыі Беларусі, выжывалі з 1941 па 1944 год, як успрымалі тое, што адбывалася навокал.

Асобную главу Аніка Вальке прысвяціла выжываванню яўрэяў у Мінскім гета, распавяла пра іх жыццё і ў партызанскіх атрадах. У прыватнасці, у сямейным партызанскім яўрэйскім атрадзе № 106 пад камандаваннем Шолама Зорына на момант яго злучэння з Чырвонай Арміяй (ліпень 1944 года) знаходзіўся 141 баец і 421 член яўрэйскіх сем'яў.

Атрад быў створаны 5 чэрвеня 1943 года ў асноўным з небаяздольных вязняў Мінскага гета. Дзейнічаў у Налібоцкай пушчы. Члены атрада не толькі супраціўляліся гітлераўцам, а і ратавалі яўрэйскае насельніцтва. Акрамя таго, атрад Зорына з'яўляўся базай, якая забяспечвала іншыя партызанскія злучэнні патрэбнымі спецыялістамі: медыкамі, збройнікамі, друкарамі для падпольных друкарняў, краўцамі, шаўцамі...




Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

**Аніка ВАЛЬКЕ: «Тым, хто займаецца гістарычнай навукай, цікава не толькі, тое, што людзі расказваюць, а і чаму яны гэта робяць».**




Як падкрэсліў падчас сустрэчы **Часовы Паверany ў справах ЗША ў Беларусі Роберт РАЙЛІ**, гэта вельмі важная кніга. «У ёй расказваецца аб тым, як Халакост разгортваўся на тэрыторыях Савецкага Саюза, якія знаходзіліся пад нацысцкай акупацыяй, і як савецкія грамадзяне рэагавалі на яго, — адзначыў Часовы Паверany. — Кніга складзена на аснове індывідуальных вусных гісторый людзей, якія перажылі гэтыя падзеі. Мы жывём у той час, калі ёсць спробы перапісаць мінулае і прадставіць яго ў значна больш пазітыўным выглядзе, больш спрыяльным, чым тое, што адбывалася на самай справе. Таму асабліва важна захаваць гэтую памяць. Дзякуючы такім кнігам, свет ніколі не забудзе пра тыя падзеі».

**Вераніка КАНЮТА.**
*kanyuta@zviazda.by*

# КАБ ПОМНІЛІ НАШЧАДКІ

## Брэсцкая крэпасць адзначае дзве юбілейныя даты

**Мемарыяльны комплекс «Брэсцкая крэпасць-герой» адзначае сёння сорак пяць гадоў з дня адкрыцця, а музей абароны Брэсцкай крэпасці святкуе 60-гадовы юбілей. Сёння комплекс з'яўляецца найбуйнейшым на постсавецкай прасторы помнікам, які ўвекавечыў мужнасць савецкага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны.**

У музеі абароны, які працуе з 1956 года, прадстаўлена каля чатырох тысяч экспанатаў. І кожны ўвасабляе ў сабе жывую старонку нашай гісторыі. Падлічана, што за шэсць дзесяцігоддзяў музей наведалі амаль 24 мільёны чалавек. Клопатамі найперш работнікаў музея зараз вядомыя імёны больш чым 1000 удзельнікаў абароны крэпасці.

Менавіта пра іх, салдат і афіцэраў гарнізона, шмат гаварылася на канферэнцыі «Духоўная і гістарычная спадчына Брэсцкай крэпасці», якая адкрыла шэраг святочных мерапрыемстваў. У навукова-практычным форуме прынялі ўдзел навукоўцы і музейныя работнікі нашай краіны і блізкага замежжа. На ўрачысты вечар з нагоды двух юбілеяў запрошаны нашчадкі абаронцаў крэпасці і тых людзей, якія мелі дачыненне да стварэння мемарыяла.

Падрыхтаваны цікавы сумесны праект мемарыяльнага комплексу і абласнога краязнаўчага музея пад назвай «Крэпасць. Гісторыя. Рарытэты». Тэматычная выстава з фондаў краязнаўчага музея размесціцца ў суседстве з экспазіцыяй «Музей вайны — тэрыторыя міру» ў выставачнай зале паўднёва-ўсходняй казармы. Там абяцаюць паказаць нават дошку і скарбонку з манетамі, якія замуравалі ў фундамент цытадэлі пры закладцы першага каменя ў 1836 годзе. Будуць і іншыя рарытэты накшталт асабістых рэчаў камісара Яфіма Фаміна. Афіцыйнае адкрыццё выставы запланавана на 8 лістапада. У гэты ж дзень усе музеі Брэсцкай крэпасці будуць працаваць для наведвальнікаў бясплатна.



Такім чынам супрацоўнікі мемарыяльнага комплексу робяць унёсак у справу папулярызацыі подзвігу людзей, якія наблізілі Перамогу. У віншаванні, якое Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь накіраваў калектыву мемарыяльнага комплексу з нагоды юбілеяў, падкрэслена вялікая і пачэсная работа, што праводзіцца тут па патрыятычным выхаванні моладзі, фарміраванні яе светапогляду і маральных якасцяў.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**
*yackevich@zviazda.by*

# Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

## ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА

| Наименование | Характеристика |
|---|---|
| **ЛОТ 1** | |
| Наименование объекта, краткая характеристика | Автомобиль МАЗ-5440А5, гос. номер АВ 0890-4, 2008 г.в. (двухосный седельный тягач, цвет белый, допустимая масса 18450 кг) |
| Начальная цена продажи | 5 265,88 р. (пять тысяч двести шестьдесят пять рублей восемьдесят восемь копеек) с учетом НДС |
| Сумма задатка | 527 р. (пятьсот двадцать семь рублей) |
| **ЛОТ 2** | |
| Наименование объекта, краткая характеристика | Автомобиль МАЗ-6430А8, гос. номер АА 5356-4, 2008 г.в. (трехосный седельный тягач, цвет белый, допустимая масса 26000 кг) |
| Начальная цена продажи | 6 377,53 р. (шесть тысяч триста семьдесят семь рублей пятьдесят три копейки) с учетом НДС |
| Сумма задатка | 638 р. (шестьсот тридцать восемь рублей) |
| **ЛОТ 3** | |
| Наименование объекта, краткая характеристика | Автомобиль МАЗ-543205, гос. номер АА 0358-4, 2007 г.в. (двухосный седельный тягач, цвет белый, допустимая масса 18000 кг). |
| Начальная цена продажи | 3 591,68 р. (три тысячи пятьсот девяносто один рубль шестьдесят восемь копеек) с учетом НДС. |
| Сумма задатка | 359 р. (триста пятьдесят девять рублей) |
| **ЛОТ 4** | |
| Наименование объекта, краткая характеристика | Автомобиль МАЗ-543205-220, гос. номер СІ 5683, 2006 г.в. (двухосный седельный тягач, цвет белый, допустимая масса 18000 кг) |
| Начальная цена продажи | 3 530,45 р. (три тысячи пятьсот тридцать рублей сорок пять копеек) с учетом НДС |
| Сумма задатка | 353 р. (триста пятьдесят три рубля) |
| **ЛОТ 5** | |
| Наименование объекта, краткая характеристика | Автомобиль МАЗ-6430А8360-020, гос. номер АА 3831-4, 2008 г.в. (трехосный седельный тягач, цвет белый, допустимая масса 26 000 кг) |
| Начальная цена продажи | 6 645,65 р. (шесть тысяч шестьсот сорок пять рублей шестьдесят пять копеек) с учетом НДС |
| Сумма задатка | 665 р. (шестьсот шестьдесят пять рублей) |
| **ЛОТ 6** | |
| Наименование объекта, краткая характеристика | Автомобиль МАЗ-5440А8-360-030, гос. номер АІ 2909-4, 2008 г.в. (двухосный седельный тягач, цвет зеленый, допустимая масса 18 750 кг) |
| Начальная цена продажи | 6 162,11 р. (шесть тысяч сто шестьдесят два рубля одиннадцать копеек) с учетом НДС |
| Сумма задатка | 616 р. (шестьсот шестнадцать рублей) |
| **ЛОТ 7** | |
| Наименование объекта, краткая характеристика | Автомобиль МАЗ-5440А8, гос. номер АІ 2908-4, 2008 г.в. (двухосный седельный тягач, цвет белый, допустимая масса 18 750 кг) |
| Начальная цена продажи | 4 076,06 р. (четыре тысячи семьдесят шесть рублей шесть копеек) с учетом НДС |
| Сумма задатка | 408 р. (четыреста восемь рублей) |
| **ЛОТ 8** | |
| Наименование объекта, краткая характеристика | Автомобиль МАЗ-5337, гос. номер СЕ 3178, 2000 г.в. (автоцистерна 10 м$^3$ для перевозки нефтепродуктов на шасси 2-осного автомобиля, цвет серый, допустимая масса 14 950 кг) |
| Начальная цена продажи | 723,10 р. (семьсот двадцать три рубля десять копеек) с учетом НДС |
| Сумма задатка | 72 р. (семьдесят два рубля) |
| **ЛОТ 9** | |
| Наименование объекта, краткая характеристика | Автомобиль МАЗ-533702-241, гос. номер СМ 6975, 2006 г.в. (автоцистерна 10 м$^3$ для перевозки нефтепродуктов на шасси 2-осного автомобиля, цвет белый, допустимая масса 16500 кг) |
| Начальная цена продажи | 4 167,13 р. (четыре тысячи сто шестьдесят семь рублей тринадцать копеек) с учетом НДС |
| Сумма задатка | 417 р. (четыреста семнадцать рублей) |
| **ЛОТ 10** | |
| Наименование объекта, краткая характеристика | Полуприцеп-цистерна ППЦ-22, гос. номер А 1052 А-4, 2007 г.в. (стальной полуприцеп-цистерна для перевозки нефтепродуктов на 3-осном шасси, емкость 22 м$^3$, цвет оранжевый, допустимая масса 36 000 кг) |
| Начальная цена продажи | 7 369,34 р. (семь тысяч триста шестьдесят девять рублей тридцать четыре копейки) с учетом НДС |
| Сумма задатка | 737 р. (семьсот тридцать семь рублей) |
| **ЛОТ 11** | |
| Наименование объекта, краткая характеристика | МАЗ-9919, гос. номер А 0682 А-4, 2005 г.в. (стальной полуприцеп-цистерна для перевозки нефтепродуктов на 3-осном шасси, емкость 22 м$^3$, допустимая масса 36 000 кг) |
| Начальная цена продажи | 6 139,55 р. (шесть тысяч сто тридцать девять рублей пятьдесят пять копеек) с учетом НДС |
| Сумма задатка | 614 р. (шестьсот четырнадцать рублей) |
| **ЛОТ 12** | |
| Наименование объекта, краткая характеристика | РРС 96227, гос. номер А 8620 А-4, г.в. не определен (стальной полуприцеп-цистерна для перевозки нефтепродуктов на 3-осном шасси, емкость 35 м$^3$, допустимая масса 41 700 кг) |
| Начальная цена продажи | 5 054,30 р. (пять тысяч пятьдесят четыре рубля тридцать копеек) с учетом НДС |
| Сумма задатка | 505 р. (пятьсот пять рублей) |
| **ЛОТ 13** | |
| Наименование объекта, краткая характеристика | MAZ-9919, гос. номер А 0959 В-4, 2008 г.в. (стальной полуприцеп-цистерна для перевозки нефтепродуктов на 3-осном шасси, емкость 22 м$^3$, цвет оранжевый, допустимая масса 29 737 кг) |
| Начальная цена продажи | 12 324,96 р. (двенадцать тысяч триста двадцать четыре рубля девяносто шесть копеек) с учетом НДС |
| Сумма задатка | 123 р. (сто двадцать три рубля) |
| **ЛОТ 14** | |
| Наименование объекта, краткая характеристика | МАЗ-9919, гос. номер А 1233 А-4, 2006 г.в. (стальной полуприцеп-цистерна для перевозки нефтепродуктов на 3-осном шасси, емкость 22 м$^3$, цвет оранжевый, допустимая масса 36 000 кг) |
| Начальная цена продажи | 5 832,52 р. (пять тысяч восемьсот тридцать два рубля пятьдесят две копейки) с учетом НДС |
| Сумма задатка | 583 р. (пятьсот восемьдесят три рубля) |
| **ЛОТ 15** | |
| Наименование объекта, краткая характеристика | Полуприцеп-цистерна ППЦ-22, гос. номер А 0274 А-4, 2007 г.в. (стальной полуприцеп-цистерна для перевозки нефтепродуктов на 3-осном шасси, емкость 22 м$^3$, цвет оранжевый, допустимая масса 29 737 кг) |
| Начальная цена продажи | 9 350,06 р. (девять тысяч триста пятьдесят рублей шесть копеек) с учетом НДС |
| Сумма задатка | 935 р. (девятьсот тридцать пять рублей) |
| **ЛОТ 16** | |
| Наименование объекта, краткая характеристика | МАЗ 892600 1020-001р ПЦ-812 прицеп-цистерна, гос. номер А 1025 А-4, 2007 г.в. (стальная автоцистерна для перевозки нефтепродуктов на базе 2-осного прицепа, емкость 8 м$^3$, цвет оранжевый, разрешенная масса 12 000 кг) |
| Начальная цена продажи | 3 472,30 р. (три тысячи четыреста семьдесят два рубля тридцать копеек) с учетом НДС |
| Сумма задатка | 347 р. (триста сорок семь рублей) |
| **ЛОТ 17** | |
| Наименование объекта, краткая характеристика | МАЗ 892600 прицеп-цистерна ПЦ-8, гос. номер А 1033 А-4, 2007 г.в. (стальная автоцистерна для перевозки нефтепродуктов на базе 2-осного прицепа, емкость 8 м$^3$, цвет оранжевый, разрешенная масса 12000 кг) |
| Начальная цена продажи | 3 532,92 р. (три тысячи пятьсот тридцать два рубля девяносто две копейки) с учетом НДС |
| Сумма задатка | 353 р. (триста пятьдесят три рубля) |
| **ЛОТ 18** | |
| Наименование объекта, краткая характеристика | Фургон ГАЗ 2705, гос. номер СІ 3628, 2005 г.в. (грузопассажирский цельнометаллический фургон, цвет темно-синий, допустимая масса 3500 кг). |
| Начальная цена продажи | 853,63 р. (восемьсот пятьдесят три рубля шестьдесят три копейки) с учетом НДС. |
| Сумма задатка | 85 р. (восемьдесят пять рублей) |
| **ЛОТ 19** | |
| Наименование объекта, краткая характеристика | Фургон ГАЗ 2705, гос. номер АА 4823-4, 2007 г.в. (грузопассажирский цельнометаллический фургон, цвет синий, допустимая масса 3500 кг). |
| Начальная цена продажи | 1 247,47 р. (одна тысяча двести сорок семь рублей сорок семь копеек) с учетом НДС. |
| Сумма задатка | 125 р. (сто двадцать пять рублей) |
| **ЛОТ 20** | |
| Наименование объекта, краткая характеристика | Фургон ГАЗ 2705, гос. номер СІ 7035, 2007 г.в. (грузопассажирский цельнометаллический фургон, цвет синий, допустимая масса 3500 кг). |
| Начальная цена продажи | 1 120,18 р. (одна тысяча сто двадцать рублей восемнадцать копеек) с учетом НДС. |
| Сумма задатка | 112 р. (сто двенадцать рублей) |
| **ЛОТ 21** | |
| Наименование объекта, краткая характеристика | Фургон ГАЗ 2705, гос. номер АВ1719-4, 2008 г.в. (грузовой цельнометаллический 3-дверный фургон, цвет красный, допустимая масса 3500 кг). |
| Начальная цена продажи | 1 284,36 р. (одна тысяча двести восемьдесят четыре рубля тридцать шесть копеек) с учетом НДС. |
| Сумма задатка | 128 р. (сто двадцать восемь рублей) |
| **ЛОТ 22** | |
| Наименование объекта, краткая характеристика | Фургон ГАЗ 2705, гос. номер АВ 0869-4, 2008 г.в. (грузопассажирский цельнометаллический фургон, цвет темно-синий, допустимая масса 3500 кг). |
| Начальная цена продажи | 1 346,40 р. (одна тысяча триста сорок шесть рублей сорок копеек) с учетом НДС. |
| Сумма задатка | 135 р. (сто тридцать пять рублей) |
| Условия аукциона | Без условий |
| Продавец | РУП «Белоруснефть-Гродноооблнефтепродукт», 230005, г. Гродно, ул. Дзержинского, 96, тел.: 45-27-03, 41-24-81 |
| Организатор торгов | Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел.: 41-98-32, 41-98-34 |
| Условия оплаты | – возмещение победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю аукциона) затрат Продавца на организацию и проведение аукциона, в том числе затрат по уплате вознаграждения организатору аукциона в размере 5% от конечной цены продажи объекта;<br>- 100% предоплата за приобретаемый объект. |
| Срок заключения договора купли-продажи | Не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов |
| Номер р/с для перечисления задатка | Р/с 3012579170017 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка 153001739, УНП 500833225 |

**Аукцион состоится 05 декабря 2016 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209**

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами: заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении; *юридическим лицом — резидентом Республики Беларусь* – копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица;

*индивидуальным предпринимателем* – документ, подтверждающий государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, и его копия, которая заверяется организатором аукциона; *юридическим лицом — нерезидентом Республики Беларусь* – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе организатору аукциона предъявляются: представителем юридического лица, индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность этого представителя; физическим лицом – документ, удостоверяющий личность физического лица; представителем физического лица – доверенность и документ, удостоверяющий личность представителя. Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.

В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Последний день приема заявлений – 29 ноября 2016 г. до 15.00**

*Телефоны для справок: 45-05-38, 41-98-32 — Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» http://grodnoino.by/*

## ИЗВЕЩЕНИЕ

**о проведении «06» декабря 2016 года торгов по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Белагропромбанк»**

Сведения о продаваемом имуществе:

| Номер предмета торгов | Информация об имуществе | Площадь, кв. м | Начальная цена, руб. | Размер задатка, руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Киоск пункта обмена 3 класса с инв. № 3978, по адресу: Брестская обл., г. Малорита, ул. Лермонтова | 5,1 | 11 014,68 | 1 100,00 |
| 2 | Пункт обмена валют по 3 классу стойкости с инв. № 8839, по адресу: Брестская обл., г. Пинск, ул. Ленинградская, 15 | 8,5 | 8 792,52 | 880,00 |
| 3 | Капитальное строение с инв. № 124/С-23162. Здание гаража по адресу: Брестская обл., г. Пружаны, ул. Парковая. Земельный участок с кадастровым №125650100001004031, площадью – 0,0157 га; назначение участка – для обслуживания здания гаражей | 85,0 | 13 632,48 | 1 300,00 |
| 4 | Капитальное строение с инв. №110/С-91200. Здание гаража, по адресу: Брестская обл., г. Барановичи, ул.Пролетарская, д. 32. Земельный участок с кадастровым №141000000003000437, площадью – 0,0219 га; назначение участка – для обслуживания здания гаражей | 21,0 | 7 498,90 | 750,00 |

**Продавец имущества:** Открытое акционерное общество «Белагропромбанк», 220036, г. Минск, пр. Жукова, 3.

**Организатор торгов:** Консалтинговое унитарное предприятие «Агробизнесконсалт», 220123, г. Минск, ул. В. Хоружей, 22, к. 1703.

Торги проводятся в форме аукциона в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и условиями проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Белагропромбанк».

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, внесшие задаток и заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по соответствующему предмету торгов, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка (задатков); документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с условиями проведения аукциона.

Задаток перечисляется на расчетный счет Консалтингового унитарного предприятия «Агробизнесконсалт» № 3012201310011 в ОАО «Белагропромбанк», г. Минск, код 153001964, УНП 190982374 в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе.

Торги проходят в форме открытого аукциона на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в условиях проведения торгов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) подписывается в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся «06» декабря 2016 года в 12.00 по адресу: г. Брест, ул. Куйбышева, 76, пом. 216. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются с 08.11.2016 по 02.12.2016 включительно в рабочие дни с 08.30 до 13.00 и с 14.00 до 17.30 (по пятницам – до 16.15) по адресу: г. Минск, ул. В. Хоружей, 22-1703.

Получить дополнительную информацию и ознакомиться с документацией по условиям и предметам торгов можно на сайте www.torgi.agroconsult.by

Телефоны для справок Филиал ОАО «Белагропромбанк» — Брестское областное управление, Главный специалист отдела обеспечения деятельности банка Конончик Татьяна Анатольевна, тел. 8 (016) 27 72 36. Организатор аукциона: Tel/Fax 8 (017) 399 66 39, GSM VEL 8 (029) 816-64-46, GSM MTS 8 (044) 540-64-46.

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

**Организатор:** государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел. (0212) 42-61-62.

**Продавец:** ОАО «Витебскхлебпром», 210024, г. Витебск, ул. Горбачевского, 5, тел. (0212) 35-86-82.

| |
|---|
| Лот №1. Изолированное помещение с инв. № 200/D-108266 по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Змитрока Бядули 3-я, 27, пом. 39, площадью 174,7 кв.м, наименование: торговое помещение. Нач. цена (с учетом/до деноминации): 70 400/704 000 000 бел. руб. без НДС. Задаток (с учетом/до деноминации): 7 040/70 400 000 бел. руб. |
| Повторный аукцион состоится 06.12.2016 г. в 15.00 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5, в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Срок внесения задатков и приема документов: с 08.11.2016 с 8.30 по 05.12.2016 г. до 17.30. Срок заключения договора купли-продажи: 20 календарных дней со дня проведения аукциона, оплата за объект производится в порядке и сроки, установленные договором купли-продажи. Условие аукциона: возмещение затрат по оценке имущества, оплата НДС сверх цены продажи объекта. Ранее опубликованное извещение: газета «Звязда» 14.10.2016. |

**Заявления на участие в аукционе со всеми необходимыми документами принимаются в рабочие дни с 8.30. до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, д. 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга».** Аукцион проводится в порядке, установленном Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 N 609. Лица, желающие участвовать в аукционе, обязаны подать организатору аукциона заявление на участие в аукционе, подписать соглашение установленной формы с приложением документов: документ, подтверждающий внесение суммы задатка на р/счет, указанный в извещении, с отметкой банка; юр. лицом или индивидуальным предпринимателем РБ — копия документа, подтверждающего гос. регистрацию юр. лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования; иностранным юр. лицом — легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юр.статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; иностранным индивидуальным предпринимателем — легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; представителем юридического лица РБ – доверенность (кроме случаев, когда юр. лицо представляет его руководитель); представителем гражданина или индивидуального предпринимателя РБ — нотариально удостоверенная доверенность; представителем иностранного юр. лица, иностранного физ. лица или индивидуального предпринимателя — доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, руководитель юр. лица — документ, подтверждающий его полномочия. Победитель аукциона (единственный участник аукциона) обязан перечислить затраты на организацию и проведение аукциона, возместить затраты по оценке имущества на расчетный счет, указанный в протоколе аукциона в течение 3 (трех) рабочих дней со дня проведения аукциона. **Задаток перечисляется на р/с 3012078870010, ЦБУ №2 ЗАО «МТБанк», г. Витебск, ул. Ленина, 17, БИК 153001117, УНП 390477566, получатель платежа ККУП "Витебский областной центр маркетинга".** Организатор аукциона вправе в любое время, но не позднее, чем за 3 дня до даты проведения аукциона, отказаться от проведения аукциона. Дополнительную информацию можно получить по тел.: (0212) 42-61-62, (029) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru, marketvit.by.

СООО «Белкоопстрах» просит считать недействительным страховой полис по договорам страхования, заключаемым с физическим лицом (Форма 2РН), юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем (Форма РП) по страхованию иному, чем страхование жизни формы 2РН, 2РП серии БК № 0268323.

■ З рэдакцыйнай пошты

# ЦІ ПРАЧЫТАЕМ МЫ ТОЙ ЛІСТ...

Кожная дата — гэта частка гісторыі. І калі пазіраеш на календар з пэўнымі пазнакамі — звычайна хвалюешся, нешта прыпамінаеш. І з жыцця краіны, і з уласнага лёсу таксама. У лістападзе 2017 года спаўняецца цэлы век падзеі, якая перавярнула свядомасць многіх пакаленняў людзей, якая ўвогуле перавярнула гісторыю свету. Будзе 100 гадоў Вялікай Кастрычніцкай рэвалюцыі. Сёння часам забываюцца на маштабы з'явы, да якой ішлі нашы прашчуры, нашы прадзеды і іх папярэднікі.

Я жыву ў вёсцы і шмат што памятаю з яе сацыяльнага, палітычнага, грамадскага, так бы мовіць, летапісу. Памятаю герояў Грамадзянскай вайны. Перад вачыма — слёзы жанчын, якія нацярпеліся ў фашысцкую навалу. У свядомасці — тыя жахі, драматычныя падзеі, якія ад аднаго сведкі да другога, болей маладзейшага, перадаваліся ў аповедах пра спаленыя ў нашых ваколіцах вёскі. Бывае, што раз на год, мо і болей, я заходжу ў мясцовы краязнаўчы музей у нашым райцэнтры — у Слуцку. Заходжу, каб старымі вачыма паглядзець на тыя памяткі, якія расказваюць пра мінулыя часіны. Пра панства і гора, пра калгасы і вайну, пра бядоты і шчаслівыя моманты пераможных дзён 1944—1945 гадоў. Мне добра вядомыя імёны людзей, якія вызвалялі нашу старонку ў Вялікую Айчынную вайну... І згадваючы іх, я думаю пра тое, што іх светапогляд выпеставаў час палітычных змен пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі, сама рэвалюцыя іх заклікала да жыцця актыўнага, дзейснага, вольнага.

І, разумеючы маштабы і ўсе складанасці змен новага стагоддзя, я трымаю ў памяці тую даўнюю дату... Днямі мне на вочы патрапіла кніга пра Міхаіла Матусоўскага. Славуты рускі паэт-песеннік, у Вялікую Айчынную ваяваў на Беларусі. І гісторыя некаторых яго вершаў звязана з Беларуссю таго перыяду. Дык вось, у той кнізе прачытаў, што ў пярэдадзень 50-годдзя Вялікага Кастрычніка камсамольцы Новарасійска вырашылі апусціць на дно Чорнага мора кантэйнер з пісьмамі і найболей характэрнымі дакументамі і песнямі савецкага часу. З разлікам на тое, каб падняць кантэйнер да стагоддзя рэвалюцыі. Значыць: у наступным, 2017 годзе. Звярнуліся маладыя людзі і да аўтара «Падмаскоўных вечароў» з просьбай напісаць суправаджальны ліст да сваёй песні. Міхаіл Матусоўскі выказаўся досыць лаканічна: «Штабу па адпраўцы пісем у будучыню.

Людзі 2017 года! Я не ведаю, які мі вы будзеце, але я хацеў бы, каб вы заўсёды помнілі, якой цаной дасталося нам ваша шчасце».

Што мне хацелася б яшчэ дадаць?.. Я не ведаю, ці знойдуць той кантэйнер у лістападзе 2017 года. І не магу нават уявіць, якім ён будзе ва ўсім свеце ці хоць бы на постсавецкай прасторы — лістапад 2017 года. Але ж і зараз жыву сваімі старэчымі спадзяваннямі на тое, каб і 2017 і ўсе наступныя гады для ўсіх нас былі ў міры і згодзе. Каб да нас ішлі з міралюбствам і каб мы толькі адну спагаду і ласку да людзей сваімі светлымі, беларускімі справамі выпраменьвалі. Ці атрымаецца так? Павінна атрымацца!..

Вось бы знайсці той «новарасійскі» кантэйнер і ў знак памяці пра розных людзей, што жадалі нашчадкам дабра і святла, міру і згоды, сказаць услых усяму чалавецтву: «Людзі! Помніце лепшае! Жывіце ў міры!»

Прабачце, што ў адным лісце спрабую ахапіць усё ранейшае вялікае жыццё. Але мне здаецца, што і сёння нам, людзям, несумненна, розным, трэба ўсё ж жыць з памяццю. Яе некалі было шмат — у музеях, у кнігах, на старонках газет. Часам мо дужа заідэалагізавана ўсё рабілася. Ды ты не меней многа добрага ў ранейшых клопатах па захаванні гістарычнай памяці, памяці пра палітычныя і сацыяльныя перамены, і рабілася, і стваралася. Між іншым, з разлікам і на сённяшні дзень, з разлікам на будучыню.

**Мікола КВЯТКОЎСКІ, пенсіянер**

■ Імя з газетнай паласы

# «ТАКІМ ЛЮДЗЯМ І САПРАЎДЫ ТРЭБА ПАКЛАНІЦЦА»

*Сто гадоў налета споўніцца газеце «Звязда». Гэта, згадзіцеся, дата! Гэта — падзея для краіны, для падпісчыкаў і чытачоў, для ўсіх яе супрацоўнікаў (бо звяздоўцаў былых не бывае) і — безумоўна — для герояў нашых публікацый. Якія яны? Розныя. Дзе жывуць? Усюды. Колькі іх? Без перабольшвання — мільёны, бо пра некага «Звязда» пісала летась ці пазалетась, а пра некага, літаральна, — у мінулым стагоддзі: у пачатку васьмідзясятых, саракавых, трыццатых, даўно... Але ж напісанае і сапраўды застаецца. Сведчаннем таму наша рэдакцыйная пошта.*

«...З таго дня прайшло больш як пяцьдзясят гадоў: у нумары «Звязды» за 17 чэрвеня 1964 года быў невялічкі артыкул «Такім людзям нізкі паклон». Яго аўтар Сяргей Новік-Пяюн, хай вельмі сцісла, але напісаў, якім чынам я, маленькая, згубілася ў самым пачатку вайны. І як нечакана потым знайшлася.

Зрэшты, спачатку трэба сказаць пра аўтара. Я толькі потым даналася, што ён быў паэтам, мастаком, кампазітарам, але найперш — ён быў досыць рэдкім чалавекам, чалавекам вельмі ўважлівым да іншых, нават зусім незнаёмых яму людзей.

Пачалося ўсё з таго, што ў Слоніме Сяргей Міхайлавіч выпадкова сустрэўся і разгаварыўся з Анастасіяй Юр'еўнай Смяткоўскай і што яна — да слова прыйшлося, расказала яму, як некалі на Зэльвенскай шашы падабрала малое знясіленае дзіця, як узяла яго на рукі і не змагла больш выпусціць: маючы сваіх дзвюх дачушак, яна вырашыла: «Хай будзе трэцяя». І панесла мяне дамоў.

У новай сям'і я ўсім вельмі спадабалася. Мяне як маглі дагледзалі, выняньчылі, наноў вучылі хадзіць. Я ведала сваё імя і прозвішча, я казала ўсім, што мая мама самая прыгожая, а тата вайсковец...

Такім чынам Анастасія Юр'еўна і яе муж цудоўна разумелі, што ратавалі дзіця «ворага», што пры гэтым рызыкавалі сваімі дзецьмі і сабой, а таму навучалі мяне, каб пра бацьку я, крый Божа, нікому нічога не казала...

Берагалі мяне. Анастасія Юр'еўна ўпотай мяне пахрысціла. Праўда, аб гэтым я даведалася праз шмат гадоў, на пахаванні яе дачкі Ніны — ад Надзі (так звалі дачок Смяткоўскіх). Мая ж мама пра тое хрышчэнне нічога не ведала і потым пахрысціла мяне яшчэ раз. Такім чынам атрымалася, што я хрышчоная двойчы...

Што яшчэ я добра помніла і пра што расказала ў новай сям'і, дык гэта пра тое, як мы з мамай ехалі на цягніку ў Мінск да бабулі, як па дарозе нас сталі бамбіць нямецкія самалёты, як пачалася паніка, і ўсе пасажыры кінуліся з вагонаў...

Помніла, што мама вынесла мяне і загадала адну хвілінку пастаяць, пакуль яна забярэ сястрычку, але я іх не дачакалася, бо мяне панесла з натоўпам. Такім чынам я згубілася, і ў Мінск да бабулі мама дабралася толькі з адной, малодшай дачушкай.

Шукаць мяне, старэйшую, ёй давялося доўга. Спачатку мама выпадкова сустрэла знаёмую, якая сказала, што бачыла мяне сярод бежанцаў у раёне Зэльвы. Кінулася туды. Хадзіла і ездзіла па ўсіх дзіцячых прытулках і пасля гэтага, убачыўшы дзетак, якія таксама чакалі мам, не магла знайсці сабе месца, а там больш — спыніць сваіх пошукаў...

Пашчасціла: на нейкім этапе ў яе з'явілася добраахвотная памочніца (мама называла яе дэпутаткай), і яны ўжо ўдзвюх сталі наведваць прытулкі...

У Слоніме, у чарговым і Бог ведае, якім па ліку дзіцячым доме, гэтыя жанчыны зноў нічога не знайшлі і ад сваёй бездапаможнасці проста расплакаліся.

Што далей было, інакш як найвышэйшай Боскай воляй не назавеш: ім насустрач выбегла незнаёмая дзяўчынка і спытала:



**Тая самая выратавальніца.**
**І тое самае «знясіленае дзіцё». 1967 г.**

— А чаго вы плачаце?

Мама адказала, што згубіла сваю дачушку, і зараз не ведае, што рабіць і дзе шукаць.

— А як яе завуць? — пацікавілася малая.

— Томачка, — адказала мама.

— Томачка Іванова? — узрадавалася дзяўчынка.

У мамы падкасіліся ногі, але ж яна папрасіла паказаць, дзе гэта Томачка цяпер.

Як высветлілася, — зусім недалёка, бо я і сапраўды была дома ў Смяткоўскіх, з нейкімі цацкамі гуляла каля акна, як раптам...

— Томачка, дачушка...

Я кожны дзень чакала, што пачую гэтыя словы! Я прасіла Бога, каб мая мама знайшлася, аднак у тое, што гэта сталася, паверыць не магла.

— Дзіцятка, ты забылася мяне? — спытала «самая прыгожая з усіх жанчын свету». І толькі тут я кінула свае цацкі, толькі тут загаварыла:

— Мамуся мая, естэм загубёна...

Я загаварыла з ёй па-польску, так, як прывыкла ў сваім новым доме, у доме Смяткоўскіх.

Але ж шчасце наша ўсё роўна не мела межаў!

Радаваліся за нас і ўсе мае выратавальнікі. Мама і тая дэпутатка дзякавалі ім, збіраліся пісаць распіску, што заплацяць Смяткоўскім за прытулак, за клопат пра мяне, але гэтыя людзі — Анастасія Юр'еўна і Пётр Іванавіч — адмовіліся хоць нешта браць, бо за гэты час (а прайшоў амаль год) я для іх стала сваёй, амаль роднай. Яны спрабавалі нават угаварыць маю маму не забіраць мяне — наогул... Альбо хоць пачакаць, не везці ў Мінск, заняты немцамі, пакінуць у іх, у Слоніме да канца вайны.

Мама, вядома ж, адмовілася ад іх прапановы.

Такім чынам мяне сталі рыхтаваць да ад'езду: сабралі адзежку, нейкай ежы, сушаных ягад, і мы накіраваліся ў сталіцу.

Тут нам хапіла ўсяго: голаду, холаду, жаху, гора... Трагічна абарвалася жыццё маёй малодшай сястрычкі, цяжка параненым вярнуўся дадому бацька... Жыццё ў нейкае больш спакойнае рэчышча ўвайшло толькі потым, пасля вызвалення, пасля вайны.

Я стала хадзіць у школу, мая мама пайшла працаваць — яшчэ і для таго, каб аднойчы з дарагімі падарункамі завітаць да нашых выратавальнікаў, у сям'ю Смяткоўскіх. Мы помнілі пра іх, вельмі часта згадвалі ў сваіх размовах, але ж з'ездзіць усё не выпадала: то не было патрэбных грошай (сорамна ж ехаць з пустымі рукамі), то часу, то здароўя...

Чужы зусім чалавек, Сяргей Міхайлавіч Новік-Пяюн адшукаў нас праз адрасное бюро. У Мінску знайшоў завулак Усходні, потым дом нумар 117, убачыў гаспадыню (яна выйшла якраз на ганак) і сказаў, што ён са Слоніма...

Мама (а гэта была яна) тут жа запрасіла чалавека ў хату. Яны доўга размаўлялі, успаміналі, глядзелі фатаграфіі. Пасля гэтага Сяргей Міхайлавіч прыехаў да мяне на працу ў інстытут «Белдзяржпраект»...

А праз нейкі час ужо я паехала ў Слонім, завітала ў хату Смяткоўскіх. Мая выратавальніца Анастасія Юр'еўна не ведала, куды мяне пасадзіць, а я не ведала, як жа ёй аддзякаваць!

...Сувязь з гэтай цудоўнай жанчынай і з яе сям'ёй больш не парывалася да сконy.

Як, дарэчы, і нашы сяброўскія адносіны з Сяргеем Міхайлавічам Новікам-Пеюном. Ён потым падарыў мне свой зборнічак вершаў «За кратамі», адмысловую папку з уласнымі здымкамі Шчары, перад вялікімі святамі заўжды дасылаў мне віншавальныя паштоўкі. Атрымаўшы іх, я дзякавала, і мы падоўгу гаварылі па тэлефоне...

Такім людзям, як ён, сужэнцы Смяткоўскія, і сапраўды трэба пакланіцца. Нават праз гады.

**Тамара ІВАНОВА-УЛАСІК,**
*г. Мінск.*

***Ад рэдакцыі.** Газетная нататка пра дзяўчынку, якая згубілася ў першыя дні вайны і такім неверагодным чынам потым знайшлася, змешчаная ў нумары «Звязды» за 17 чэрвеня 1964 года, і сапраўды была вельмі невялікай, але — што відавочна — дарагой, бо інакш не захоўвалі б яе ў гэтым сямейным архіве.*

***А таму, калі ласка, зазірніце ў свой. Магчыма, у ім таксама ёсць старыя нумары «Звязды», артыкулы, здымкі, згадкі пра вашых блізкіх. Успомніце іх, напішыце, як склаўся далейшы лёс. Час да стагоддзя «Звязды» яшчэ ёсць. Лепшыя лісты надрукуем***

■ Пытанне!

## Падвёз бы? Ці не?

...Восень, горад, вуліца. На тратуары — дзве заклапочаныя кабеты (падобна, свякроў з нявесткай). Гавораць аб нечым і няцяжка здагадацца аб чым: перад імі — досыць вялікая кардонная каробка з нейкай бытавой тэхнікай. Самім яе дамоў не данесці, значыць, трэба шукаць транспарт.

З грашыма, гэта, вядома ж, не праблема. І сапраўды: маладзейшая з жанчын дастае мабільнік, набірае нумар дыспетчарскай таксі, тлумачыць, што трэба завезці і куды. Пажылая ў гэты час трушком кіруецца да шыкоўнага чорнага «Мерседэса».

— Вы куды гэта? Чаго? — услед ёй крычыць маладуха з тэлефонам і такі ж спыняе, вяртае кабету назад. Пытае:

— Што вы ад яго хацелі?

— Вой, ды падумала, падыду, — разгублена адказвае тая, — папытаюся, можа б ён дапамог...

— Ды вы што?! Паглядзіце на яго машыну! Паглядзіце на яго букет!

Глядзім (усе разам): «Мерседэс» і сапраўды так званага бізнес-класа.

І мужчына каля яго ў дарагім паліто, з велізарным букетам руж...

Не ведаю, як каму, а мне раптам уявілася, што тую пажылую жанчыну не спынілі, што яна і сапраўды падышла да яго, сказала:

— Сынок, дапамажы нам, падвязі, калі ласка... Каробка дужа нязручная — самім нияк не дацягнуць... Мы заплацім!

Мужчына на нейкі момант задумаўся, зірнуў на гадзіннік, потым дастаў з кішэні тэлефон, набраў нумар, сказаў:

— Дарагая, прабач, я затрымаюся, але хутка буду! Чакай!

І, паклаўшы тэлефон у кішэню, а букет на задняе сядзенне «Мерседэса», ужо ў пажылой кабеты спытаў:

— Ну, дзе там ваша каробка?

...Як думаеце, такое магчыма?..

**С.Р.,** *г. Мінск*

# АРЫГІНАЛЬНАСЦЬ КАНСТРУКЦЫЙ

## У міжнароднай праграме форуму ТЭАРТ

**Айчынны тэатр нам падаецца больш кансерватыўным і традыцыйным у асноўнай сваёй масе (фестывальны падбор у беларускім шоу-кейсе — якраз выключэнне), магчыма, таму арганізатары форуму ТЭАРТ імкнуцца падабраць у праграму замежныя пастаноўкі, створаныя ў абсалютна іншым ключы, так бы мовіць, паказаць варыянты, якіх у нас не ўбачыш. Тыя, што могуць зачапіць. Чым?**



Сцэна са спектакля «Горад. Жаніцьба. Гогаль».

**1. Актуальнасцю (нават публіцыстычнасцю).** Яшчэ адзін доказ актуальнасці шэкспіраўскіх тэм прадставіў сумесны праект Маскоўскага драматычнага тэатра імя А.С. Пушкіна і брытанскай тэатральнай кампаніяй «Cheek by Jowl». Рэжысёр Дэклан Данелан у спектаклі «Мера за меру», які меў шырокі рэзананс нават за межамі Расіі. Можа, таму і меў, што па ім успрымаюць Расію з асаблівай іерархіяй улады і несумленнасцю чынавенства (гэта паказана даволі прама, нібыта агалошваюцца факты, без мудрагелістых алегорый). Затое Герцаг добры і справядлівы: наводзіць парадак, карае нячэсных, але ж літасціва, з боскай ласкі. Зрэшты, калі забыцца на пазнавальныя дэталі і абстрагавацца, то ўлада — гэта гарачая тэма для абмеркавання ці не ў кожнай краіне. Можна пагаварыць пра гэта і вось такім чынам: проста, называючы (паказваючы) рэчы як ёсць.

Ці праз інтэрактыў. Праз яго імкнуліся паказаць «Трагедыю Макбета», пастаўленую ў Нацыянальным славенскім тэатры. Рэжысёр Ігар Пізон быў арыгінальны ў тым, што ўзяўшыся асучасніць класіку, зрабіў гледачоў часткай палітычнага шоу, што разгортваецца ў фае ў антракце. Лёгкі інтэрактыў, аднак пасля перапынку ўсе вяртаюцца ў глядзельную залу і збоку назіраюць трагедыю. Яна ў тым, што ўсе гінуць: тут забойствы як нешта дзяжурнае, што не выклікае ні болю, ні шкадавання. Нікога не шкада ў гэтых разборках, таму што ні ў кім не адчуваецца чалавек. Напэўна, так задумана. Але калі ў грамадства была магчымасць на свае вочы, на адлегласці рукі бачыць лідара (караля, цара, кіраўніка), то няўжо яго смерць не выклікала б ніякіх эмоцый? Таму інтэрактыў мала прыдумаць, ён павінен адыграць пэўную ролю ў прасоўванні думкі, асабліва калі ёсць разуменне, што яна патрэбная грамадству для асэнсавання менавіта сёння.

**2. Сінтэз тэатральных і тэхнічных сродкаў (нават відаў мастацтва).** Нельга сказаць, каб да такога падыходу не прымяраліся ў нас. Але пастаноўка «Місія. Успаміны аб адной рэвалюцыі», якую ажыццявілі тэатр Ганавера і Рурскі тэатральны фестываль высілкамі Тома Кюгеля і Юргена Кутнера, уражвае чыста нямецкай праліччанасцю, пры тым што вырашалі яны задачу ўзроўню вышэйшай матэматыкі ці нават фізікі. Задаў яе культавы нямецкі драматург Хайнэр Мюлер, праз вялікую павагу да яго рэжысёры вырашылі выкарыстаць яго рэальны «закадравы» голас, што быў запісаны падчас чытання п'есы, а нястачу эмоцый кампенсавалі за кошт нагрувашчанай шматузроўневай сістэмы, дзе ёсць месца і акцёрам: яны паказваюць персанажаў п'есы, што нясуць ідэі Вялікай французскай рэвалюцыі, ідэалы якой перакрэслілі самі ж правадыры (гэта вельмі камічна паказана з дапамогай камеры, якая падглядае, напрыклад, за расправай над намалляваным Рабесп'ерам). Але тая ж камера нас пераносіць на наступны ўзровень, у прастору рэвалюцыянераў XX стагоддзя. Выхоплівае сівога Карла Маркса і яго паслядоўніка Леніна, спыняецца на ваяўнічым Чэ Гевары... Міжволі пачынаеш згадваць прыкметы рэвалюцыйнай сітуацыі, калі «вярхі не могуць, а нізы не хочуць», але ж каб усё было так проста... Настаў у ідэйных рэвалюцыянераў бываюць хістанні і здрада, сумневы ў тым, ці зразумее іншы, што дае свабода і дзеля чаго яна патрэбная. Акцёрская работа і тэхніка, манатонны голас аўтара і музыка маркіруюць адразу некалькі пластоў пастаноўкі. У выніку яны сыходзяцца ў адным адказе на ўмовы задачы, якую кожны глядач будзе вырашаць для сябе, каб вызначыцца ў асабістым стаўленні да пытання. Задача можа быць не ўсім па зубах: але хто сказаў, што ў тэатры ўсё павінна быць проста?

Але ёсць прыклады, калі тэхніка спрашчае вырашэнне задач рэжысёрамі. Нібыта калькулятар, прапануе гатовы адказ. Напрыклад, спектакль «Паліва», прадстаўлены «Pop-up тэатрам» з Санкт-Пецярбургу, выкарыстоўвае з афармлення хіба што экран, на якім час ад часу ўзнікае адлюстраванне таго ж акцёра, што расказвае гісторыю рэальнага чалавека, стваральніка інавацый. Перад намі паўстае рацыянальны вобраз. Нічога лішняга. На жаль, ніякіх асабістых эмоцый у дачыненні да яго не нараджаецца, слухаеш і ўспрымаеш розумам.

Адзін акцёр і ў спектаклі Вільнюскага гарадскога тэатра «Апошняя стужка Крэпа» (паводле С. Бекета). Але які — Юозас Будрайціс. Рэжысёр Оскарас Каршуновас свядома ішоў на эксперымент па спалучэнні тэхнікі (голас) і чалавека, які сам па сабе прыцягвае ўвагу, але яшчэ і ўсе яго дзеянні прадуманыя да дробязяў.

**3. Чалавечнасцю, вялікай чалавечнасцю.** Чалавек нібыта сусвет, незалежна ад таго, гэта вядомая асоба ці просты жыхар вялікага горада. Пра чалавечае можна гаварыць словам ці музыкай. Напрыклад, у цэнтры швейцарскага спектакля «Кінг сайз» некалькі персанажаў, звязаных спевамі. Проста песні, якія не расказваюць гісторыі, але яна складваецца паводле слоў песень і дзеянняў герояў. Музыка наогул шыкоўны сродак для эксперыментаў у тэатры. Яна можа стаць нават эфемерным персанажам, як гэта адбываецца ў спектаклі «Шапен без фартэпіяна» Варшаўскай тэатральнай кампаніі CENTRALA. Сучаснае ўспрыманне Шапена (прынамсі, у польскім грамадстве) накладваецца на яго творы. Партыя фартэпіяна не гучыць, яе замяняе артыстка, якая гаворыць пра Шапена. Так, арыгінальна. Праўда, падалося, што тут не Шапен без фартэпіяна, а спектакль пра Шапена, але без яго. Таму што ён — гэта найперш партыя фартэпіяна, у якой растворана яго чалавечая (і жывая) душа. Тым не менш гэта спроба пагаварыць пра сімвал польскай культуры інакш.

Тую задачу — паказаць свайго Гогаля — ставіў рэжысёр Юрый Бутусаў. У спектаклі «Горад. Жаніцьба. Гогаль» Санкт-Пецярбургскага тэатра імя Ленсавета людзей даволі шмат, яны простыя, маленькія, але за час спектакля становяцца роднымі. Героі «Жаніцьбы» заклапочаныя выключна чалавечым жаданнем асабістага шчасця. Але гэта так цудоўна, калі людзі могуць жыць такімі натуральнымі памкненнямі. І пры ўсёй вонкавай прастаце гэта зроблена настолькі тонка, з пачуццём, што ловіш кожнае прамоўленае (і як!) слова, баішся прамінуць дробныя дэталі (бо ў Гогаля насамрэч усё да дробязяў мае сэнс, таксама як і ў Бутусава). І так патрэбна людзям вера ў тое, што ўсё можа быць у нашым адзіным жыцці, што нават жаніх, які збег з вяселля, і відавочныя магілкі няспраўджаных надзей не перашкодзяць марыць пра шчасце. Бо без мар няма будучыні: яны яе праграмуюць.

**Крыху асабістага.** Злавіла сябе на думцы, што сёлета глядзела беларускую праграму нават з большай цікавасцю, чым міжнародную. Магчыма таму, што ёсць мара (і яна ўжо працуе на ўзроўні праграмавання) бачыць у тэатры адбітак нашай рэчаіснасці. І справа нават не ў сродках, праз якія яна адлюстроўваецца. Дзіўным было адчуванне: форма проста дзеля формы не зацягвае, хоць бываюць канструкцыі і сапраўды арыгінальныя. Сродкі, формы, узроўні эксперыментаў і падачы могуць быць розныя. Галоўнае: дзеля чаго? Ёсць у нашым тэатры рэжысёры, якія вызначыліся з адказам на гэтае пытанне. Астатняе — прыкладзецца.

Ларыса ЦІМОШЫК.
tsimoshyk@zviazda.by

■ Дэбют

# КАЛІ НАРАДЖАЕЦЦА ПАЭТ?

## Паспрабавала высветліць маладая аўтарка Ніна Лістота



Ніна ЛІСТОТА — гэта творчы псеўданім карэспандэнта «Звязды» Ніны ШЧАРБАЧЭВІЧ.

**Яе першая паэтычная вечарына прайшла ў Літаратурным музеі Янкі Купалы.**

— Кожны чалавек у сваім жыцці выконвае некалькі роляў, — разважае Ніна. — І калі некаторыя з іх мы разумеем і адчуваем як дакладныя — дачка, калега, сяброўка; то многія так і застаюцца неўсвядомленымі. Калі чалавек малюе, ці можна яго назваць мастаком? Калі піша вершы — паэтам? Таму і я сёння толькі спрабую, як новую сукенку, прымерыць да сябе ролю паэткі.



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

Зрэшты, вечарына не стала першай сустрэчай Ніны з публікай. Яе вершы друкаваліся ў беларускай літаратурна-мастацкай перыёдыцы, перакладаліся на польскую і ўкраінскую мовы, а некаторыя тэксты ўжо паспелі стаць песнямі і гучалі на фэстах — з лёгкай рукі барда Марыі Гаўрыленкі. Але варта адзначыць, што ўласны творчы вечар — той яшчэ экзамен для паэта. Тут не схавацца ад пільных позіркаў публікі, не схлусіць у інтанацыях, а Ніне трэба было яшчэ і не схібіць пад пільным позіркам Купалы — хай і бронзавага, але паўнапраўнага гаспадара ва ўласным доме.

Ці ўсё атрымалася? Думаю, так. Але Ніне Лістоце зараз трэба вытрымаць яшчэ больш складаныя экзамены — зберагчы любоў і прыхільнасць чытачоў, а таксама займець смеласць прадставіць сваю першую кнігу вершаў. Як вядома, тэксты для дэбютнага зборніка Ніны ўжо падрыхтаваны да выдання.

Марына ВЕСЯЛУХА.
vesialuha@zviazda.by

# БАРДАЎ ЦЯГНЕ Ў ВІЦЕБСК...

**На XXX фестывальсвята аўтарскай песні «Віцебскі лістапад» прыехалі ўдзельнікі з Беларусі, Расіі, Чэхіі, Нідэрландаў, іншых краін. Сярод шматлікіх замежных бардаў быў і Сяргей ДЖЫГУРДА, які расказаў у грымёрнай карэспандэнту «Звязды» пра любоў да Беларусі.**



Сяргей ДЖЫГУРДА (кадр з фільма «Споведзь д'ябла», 2008 год).

## Самаакупны праект

Бардаўскі фэст нават старэйшы, чым знакаміты «Славянскі базар», і з'яўляецца адной з візітовак культуры краіны.

— «Базар» сёлета адбыўся 25-ы раз, а «Віцебскаму лістападу» ўжо 30. І яго па праве таксама можна лічыць брэндам, унікальнай старонкай у культурным жыцці горада, краіны, — лічыць **генеральны дырэктар «Цэнтра культуры «Віцебск», кіраўнік дырэкцыі міжнароднага фестывалю мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску» Аляксандр СІДАРЭНКА.**

Праект самаакупны. Гледачы ахвотна купляюць не толькі білеты на асобныя канцэрты, але і абанементы на права наведаць усе пляцоўкі. У будучым свята аўтарскай песні будзе знаходзіць новых прыхільнікаў і аўтараў, не сумняваюцца арганізатары.

На тэрыторыі былога СССР самы «доўгайграючы» расійскі бардаўскі фэст — Грушынскі. Упершыню ён адбыўся ў 1968 годзе пад Самарай. У Віцебску барды выступаюць на сцэне ў зале, а не на ўлонні прыроды. У гэтым розніца, як падкрэсліваюць арганізатары «Віцебскага лістапада». Патэнцыйныя ўдзельнікі конкурсу праходзяць адбор. Ад іх чакаюць і акцёрскіх задаткаў. Падчас конкурсу разам з журы працуе экспертны савет. Усё гэта сведчыць пра высокі ўзровень фэсту.

Уладальнікам Гран-пры конкурсу аўтарскай песні сёлета стаў Анатоль Папейка з Магілёва. Ён атрымаў дыплом і памятны прыз, выраблены спецыяльна для юбілейнага «Віцебскага лістапада».

## І карціны спяваюць

Падчас юбілейнага фэсту ў канцэртнай зале «Віцебск» было многае ўпершыню. Адбыўся відэамост паміж аўтарамі-выканаўцамі з розных краін. Прэзентавалі выставу «Рытмы і рыфмы часу», прысвечаную паэзіі і музыцы ва ўсіх яе прыродных, культурных, сімвалічных і чароўных сэнсах. На ёй можна было ўбачыць больш за 100 мастацкіх твораў 35 аўтараў.

У фае публіка «трапляла» і ў савецкае мінулае — у імправізаваную кватэру. Сярод экспанатаў былі старыя мэбля, халадзільнік, кінаўстаноўка, якая круціла аматарскія кадры.

Душэўнасць і дэмакратызм вялі рэй. На гала-канцэрце, прысвечаным юбілею, гучалі песні розных жанраў і стыляў. Вельмі спадабаўся публіцы канцэрт праекта «Булат Акуджава. Уладзімір Высоцкі. Цытаты». На ім песні мэтраў бардаўскай песні гучалі на розных мовах, у тым ліку па-чэшску і ўкраінску.

— Я і беларускі бард Вольга Залеская прыдумалі праект пару гадоў таму. Вырашылі, што вельмі добра паслухаць, як выконваюць класіку аўтарскай песні на мовах тых краін, дзе цікавяцца нашай культурай, цэняць і любяць яе. І слухае не толькі рускамоўная публіка. Выступалі ў Польшчы, Чэхіі, Славакіі, Германіі, Аўстрыі, Расіі, — растлумачыў **Аляксей ГАЛЫБІН, кіраўнік арт-лабараторыі «Вышыня» і міжнароднага праекта.**

Спадарыня Залеская — адна са стваральнікаў «Віцебскага лістапада».

— Фестываль мы пачыналі ў якасці свята для сябе. І ён цяпер стаў велізарным мерапрыемствам з 30-гадовай гісторыяй. У розныя гады знаходзіліся энтузіясты, якія не апускалі рукі пры падрыхтоўцы да чарговага фэсту. І былі заўсёды тыя, хто дапамагаў. А сёння, дзякуючы Уладзіславе Цвікі, кіраўніку «Віцебскага лістапада», упершыню выканаем ў Віцебску бардаўскую класіку, — дадала Вольга ЗАЛЕСКАЯ.



Фота Аляксея СПАТКАЯ.

На канцэрце, прысвечаным юбілею фэсту, выступае бард з Віцебска Алеся МЯДЗВЕДЗЕВА.

## Старэйшы брат пра жанчын і смятану

Сяргей Джыгурда, старэйшы брат Мікіты Джыгурды, артыст тэатра і кіно, аўтар песень — адзін з удзельнікаў «Цытат».

— Ніколі не думаў, што буду перакладаць вершы Высоцкага і Акуджавы на ўкраінскую мову. Некаторыя казалі: навошта? Аказалася цікава. Нават у Маскве дзякуюць. Кажуць, што новы сэнс пачулі, дакладней паглыбілі разуменне песні і тэксту. Добрыя пераклады даюць магчымасць зайграць песням новымі гранямі. Гэта як алмазу дадаць аправу, — разважае ён.

Сяргей на пяць гадоў старэйшы за Мікіту. Летам адсвяткаваў 60-ю гадавіну нараджэння. Пасля вучобы ў Кіеўскім інстытуце тэатральнага мастацтва працаваў у тэатрах Данецка і Кіева. У апошнія гады жыве ў Маскве.

— З задавальненнем прыязджаю ў Беларусь. Тут сустракаюся і з украінскімі сябрамі. У Брэсце і Мінску быў, у Гомелі. Вельмі цудоўна адчуваў сябе на міжнародным музычна-спартыўным свяце «Вялікая бардрыбалка» ў Магілёўскай вобласці.

А ў Віцебску даўно не быў. Апошні раз у 1979-м ці 1980 годзе — падчас гастроляў Данецкага тэатра. Спадабаўся горад, як і краіна. Прыгожыя жанчыны, спакойныя мужчыны, ветлівыя вадзіцелі і непадкупныя міліцыянеры. У гэтым сэнсе не моцна змянілася краіна з таго часу, — успамінае Сяргей Барысавіч.

Чамусьці яму вельмі запомнілася, як у сталоўцы браў паўшклянкі смятаны, туды ўстаўляў чайную лыжку, і яна стаяла.

— Перагортваў шклянку, ішоў ад стала, а яна не падала! Чым падабаецца ў вас: няма падробак. Я пра спіртное, прадукты — усё сапраўднае! Не ведаю, як гэта робіцца, але прыемна. І падчас СССР ніхто не разводзіў тую ж смятану... Працавітыя і сумленныя, добрыя і разумныя людзі жывуць у Беларусі. Я цяпер прыехаў з Масквы а 5-й гадзіне раніцы, ніхто не сустракаў. Таксіста пытаю, ці давязе да гатэля? Ён адказаў, што пешшу можна дайсці. Таксіст, які мог бы зарабіць! Я заблукаў. А побач дама з сабакам гуляе. Яна мяне давяла да дзвярэй. Простая душэўнасць і чалавечая спагада! Гэта дарагога каштуе, — не шкадаваў кампліментаў Сяргей Джыгурда.

## ...І пра брата

Пачуўшы пытанне пра брата, сказаў, што апошнія два гады яны наогул не маюць зносін, нават па тэлефоне. Прычыну не раскрыў.

— Наконт скандальнай славы яго, рэпутацыі *(доўгая паўза)*... Бадай, як кажуць, увайшоў у ролю. Але ён заўсёды быў адкрытым, вясёлым, сумленным і шчодрым. Проста так атрымліваецца, што Мікіце ў гэтай рэальнасці цяжка існаваць. Такім ён нарадзіўся, — сказаў Сяргей Джыгурда.

У адказ на пытанне пра ўласнае асабістае жыццё Сяргей далічыў на пальцах шлюбы да чатырох, пакуль іншы бард яго не перабіў. Пажартаваў, маўляў, «план» выкананы. Дадаў, што чарговая жонка збірае званочкі. У яе калекцыі і беларускія ёсць.

Сам ён нічога не калекцыянуе. Бывае, на гастролях купляе маленькія талерачкі, каб павесіць на сцяне. Прызнаўся, што нават уласнае фота не захоўвае, бо іх калісьці стала вельмі шмат.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**
pukshanski@zviazda.by

■ Вернісаж

# АДЗІНСТВА ДУШЫ І НАВАКОЛЛЯ

## Унутраная свабода Святланы Кастрыцы

Філасофія прыроды, гармонія свету і атмасфера ўтульнасці... Мастачка, член Беларускага саюза мастакоў, выкладчыца Мінскага дзяржаўнага каледжа імя Аляксея Глебава Святлана Кастрыца выкарыстоўвае гэтыя складнікі ў творчасці і на асабістым прыкладзе дэманструе, як узнікае адзінства душы і наваколля. Сёлета аўтар святкуе дваццацігоддзе з пачатку творчай дзейнасці. З нагоды юбілею ў мастацкай галерэі «Універсітэт культуры» адкрылася выстаўка творцы «Прастора і свет».

За апошнія пяць месяцаў гэта другі вернісаж, дзе Святлана Кастрыца прадстаўляе мастацкія кампазіцыі. Толькі першая экспазіцыя складалася з невялікай колькасці работ, а вось другая — прыемны падарунак для мастачкі: у галерэі для твораў аўтара адведзены тры залы, у кожнай размешчаны работы розных перыядаў мастацкай дзейнасці.

Экспазіцыя складаецца з пейзажных палотнаў, нацюрмортаў і партрэтаў. Творчасць Святланы Кастрыцы нібы музыка — кранае абсалютна розныя струны душы, захапляе інтрыгай, нечаканасцю. Якраз адчуванне такога трапятання ў душы канцэнтруе ўвагу на дробязях, якіх, дарэчы, у работах мастачкі шмат.

Творчасць Святланы Кастрыцы вызначаецца стылістычнай разнастайнасцю (эксперыментальны жывапіс, рэалізм, імпрэсіянізм). Мастачка спрабуе гарманічна спалучаць прастору святла (адсюль і назва выстаўкі) з больш насычанымі адценнямі. Але ж няўзброеным вокам бачна, што святло перамагае, у творах апошняга часу яно літаральна запаўняе палатно цалкам.

Як адзначыла на адкрыцці праекта куратар выстаўкі, мастацтвазнаўца, культуролаг Ксенія Сяліцкая-Ткачова, творы Святланы Кастрыцы — гэта чысціня, лірычная споведзь душы, што глыбока раскрывае асобу аўтара перад гледачом. Пагрузіцца ў прастору мастачкі — значыць злавіць кавалачак душэўнага цяпла, адчуць духоўную змястоўнасць аўтарскіх вобразаў.

Мастачка даволі часта ўдзельнічае ў пленэрах, як мясцовых, так і замежных. Таму тэма прыроды ў яе творчасці з'яўляецца адной з галоўных. У экспазіцыі каларыстычныя пейзажы змяняюцца адзін за адным. Здаецца, што разам яны ствараюць вялікі калаж альбо мастацкую кінастужку, дзе кадры поўняцца мяккімі беларускімі краявідамі ў розным выкананні.



«Увечары на возеры», 2016 г.

Партрэты аўтара падзяляюцца на некалькі тыпаў: ёсць пяшчотныя, лёгкія, выкананыя ў пастэльных танах, а ёсць і з магічным падтэкстам. Тут многае таксама залежыць ад перыядаў творчасці, у якіх унутранае адчуванне і падзеі калісьці выконвалі важную ролю.



«На стале», 2014 г.

Наогул, ад асобы мастака залежыць шмат што. У выпадку Святланы Кастрыцы яе ўнутраная гармонія, святло і спакой дакладна перададзены ў мастацкіх творах. Адразу заўважны мастацкі почырк аўтара, стаўленне творцы да прыроды, чалавека і нават грамадства. Святлана Кастрыца — мастачка, здольная адкрыць свой свет для людзей. На працягу многіх гадоў яна не толькі вучыць дзетак мастацкай справе, але ж і сама вучыцца не губляць цеплыню і святло душы.

**Вікторыя АСКЕРА** ■

# ЧЫТАЦЬ МОЖНА І РУКАМІ

## У Магілёве невідушчыя далучаюцца да айчыннай класікі

**Магіляўчанкі Алена ЧЫГІРОВА і Раіса ЛІНІЧ з дзяцінства прывучаны чытаць кнігі. Гэтую звычку ім прывілі яшчэ ў Шклоўскай спецшколе-інтэрнаце для дзяцей з парушэннямі зроку. Там яны добра засвоілі навуку чытання рыльефна-кропкавага шрыфту. Француз Луі Брайль, які сам цалкам аслеп у 5 гадоў, зрабіў чалавецтву неверагодны падарунак — даў магчымасць чытаць нават пры адсутнасці зроку. Кнігі па Брайлю былыя выхаванкі спецыялізаванай установы навучыліся глытаць на адным дыханні. І хоць з таго часу прайшло больш за 50 гадоў, яны і цяпер першыя прэтэндэнткі на кніжныя навінкі. Для такіх, як яны, на базе дзіцячай бібліятэкі №2 у Магілёве дзейнічае спецыяльны абанемент. Там мы, дарэчы, і сустрэліся.**





**З навінкамі ёсць магчымасць азнаёміцца ў бібліятэцы.**

### Слова трэба памацаць

У невялікім пакоі palічкі з кнігамі рознага фармату — «брайлеўскія», на касетах, дысках, звычайныя папяровыя. Апошніх няшмат. Іх бяруць чытачы з 3-й групай інваліднасці. Прычым адна шафа выключна для жанчын — з жаночымі любоўнымі і сентыментальнымі раманамі, другая для мужчын — з гістарычнай літаратурай або дэтэктывамі. Ёсць палічка з часопісамі і газетамі. «Гісторыі з жыцця, народныя традыцыі, кулінарныя парады — самыя хадавыя тэмы», — кажа **бібліятэкар абанемента па абслугоўванні інвалідаў па зроку Людміла ЮМАНАВА**. Кожнае выданне чытана-перачытана. Навінкі тут чакаюць, як манну нябесную. З кніжкамі «па Брайлю» наогул дэфіцыт.

— Раней выдавецтва з Санкт-Пецярбурга забяспечвала нас кожны месяц «Літаратурнымі чытаннямі» ў 2 «сшытках», — бібліятэкар дэманструе вялікія кнігі ў мяккім пераплёце. — Чытачам было зручна, не так доўга прыходзілася чакаць наступнага нумара. Але з другога паўгоддзя мы атрымліваем літаратуру толькі раз у квартал. Замест «Літаратурных чытанняў» нам прысылаюць толькі дадаткі — «Вострыя сюжэт» у 4 «сшытках» і «Гісторыя і асоба». Людзі стамляюцца чакаць, кожны прэтэндуе ўзяць кнігу першым. Потым трэба чакаць, калі наступны пачытае. Хутка перадаць адзін аднаму таксама не заўсёды атрымліваецца. Гэта ж людзі ў асноўным не маладыя, да таго ж з абмежаваннямі.

Апошні нумар дадатку «Гісторыя і асоба», наогул, стаў бестселерам. Чытачы цяпер цалкам захопленыя лёсам памешчыка Варатынцава, пра жыццёвыя перыпетыі якога ідзе там размова.

— Гэта хроніка часоў прыгоннага права, — уводзіць у курс Алена Чыгірова. — Там і пра гісторыю, і пра каханне. Чытаць — адно задавальненне.

Яе сяброўка Раіса Ліміч такога ж меркавання. У бібліятэку яны ходзяць выключна разам.

Алена Чыгірова зусім невідушчая, і без прыяцелькі — нікуды. У той вочы крыху рэагуюць на святло. У школе абедзве натхняліся такімі раманамі, як «Вайна і мір». Зараз хочацца чагосьці больш лёгкага. З аднолькавым інтарэсам чытаюць дэтэктывы, прыгодніцкую літаратуру, жаночыя раманы. І робяць гэта з неверагоднай хуткасцю.

«Мне чатырох кніжак хапае на 2 дні», — кажа Алена Чыгірова і з задавальненнем дэманструе сваю здольнасці. Трэба бачыць, як спрытна бегаюць яе пальцы па маленькіх выпуклых «брайлеўскага» шрыфту. «Арыядна Барысава «Увесь красавік нікому не вер», — прагаворвае ўслых жанчына і ўдакладняе — «класны раман». У кнізе ў сярэднім 150 старонак. На старонцы тэксту няшмат, таму кніжка заканчваецца вельмі хутка. Але «брайлеўскі» маштаб не паменшыш, прыходзіцца задавольвацца тым, што ёсць. І чакаць чарговых паступленняў у бібліятэку. Бо такіх спецыфічных выданняў у продажы не бывае.

— Гукавыя кнігі добра, але ж гэтыя лепей, — лічыць Раіса Ліміч. — Калі чытаеш вачыма або пальцамі, тэкст хутчэй запамінаецца і ўспрымаецца лепей. Дыктоўкі ў школе пісала без памылак. Не за кошт ведання правілаў, а толькі дзякуючы такому чытанню. Адна справа — пачуць слова, і іншая — пакратаць яго пальцамі. Я, напрыклад, толькі пасля таго, як навобмацак прачытала, даведалася, што но-шпа пішацца ў два словы.

Вельмі ўзбагачаюць веды «Гучныя чытанні», якія ладзяцца ў бібліятэцы кожны другі панядзелак. Спачатку бібліятэкар нешта чытае ўслых, а потым удзельнікі гуртка (звычайна гэта 10—15 чалавек) абмяркоўваюць прачытанае. Паўтары гадзіны зносін пралятаюць як адно імгненне.

### І пальцам прыемна роднае слова

Чытачкі з задавальненнем дэманструюць сваё веданне беларускай мовы. Алена Чыгірова кажа, што яе бацька Георгій Чыгіроў заўсёды карыстаўся родным словам, калі пісаў водгукі ў розныя газеты, у тым ліку і цэнтральныя. І мова асацыіруецца цяпер з нечым вельмі блізкім і родным. А Раіса Ліміч далучылася да мовы, слухаючы праўдное радыё. Асабліва любіла беларускамоўныя спектаклі. Цяпер гэта можна рабіць па прыёмніку, але да яго яшчэ трэба прыстасавацца. На жаль, кніг на роднай мове ў бібліятэцы — як кот наплакаў. Ды і адкуль ім узяцца? Галоўны пастаўшчык тактыльнай літаратуры — Санкт-Пецярбург.

— А вы хацелі б чытаць кнігі на беларускай мове? — пытаюся ў жанчын.

— З задавальненнем, — не задумваючыся адказваюць яны.

Абедзве чыталі Івана Шамякіна «Сэрца на далоні». Цяжкавата было, але ж прыстасаваліся. Пачуўшы, што пра іх напішуць на беларускай мове, шчыра ўзрадаваліся: гэта ж выдатна!

Дарэчы, у Міжнародны дзень роднай мовы бібліятэка прадставіла магчымасць папрактыкавацца ў чытанні на беларускай мове. Прапанова карысталася вялікім поспехам.

— Я да ўнука ў школу прыходжу і з настаўніцай на беларускай мове размаўляю, — уражвае Алена Георгіеўна. — Тая здзіўляецца, маўляў, адкуль ведаеце? Па мне, дык было б дзіўна, калі б я яе не ведала.

У бібліятэцы ёсць некалькі «брайлеўскіх» кніг з творамі Кандрата Крапівы беларускага выдавецтва «Народная асвета». Але гэта выдавецтва забяспечвае «брайлеўскай» літаратурай у асноўным спецыялізаваныя школы-інтэрнаты. Бібліятэкам, на жаль, яна дастаецца па рэштках прынцыпе. Астатнія беларускія творы ідуць у асноўным у аўдыяфармаце. Якуб Колас, Янка Маўр, Тарасевіч — некаторыя чытачы прынцыпова слухаюць іх на беларускай мове.

### Пад знакам «Белага кія»

Па традыцыі на перыяд месячніка «Белы кій» бібліятэкай сумесна з абласной арганізацыяй Беларускага таварыства інвалідаў па зроку (БелТІЗ) (яны знаходзяцца ў адным будынку на вуліцы Цыялкоўскага, 10) запланавана шмат розных мерапрыемстваў — майстар-класы, інтэлектуальныя конкурсы, конкурс на лепшага чытальніка па Брайлю, трансляцыя гукавых кніжак з дапамогай гукавога буктрэйлера для мінакоў, сустрэча з тытулаваным параалімпійцам Ігарам Бокім. Каб асабіста ўпэўніцца, што людзі са страчаным зрокам таксама на нешта здольныя, трэба пабываць на выставе іх работ. А нядаўна арганізатары запрасілі на экскурсію вучняў восьмых і другіх класаў са школы №23. Некаторыя дзеці ўпершыню ўбачылі прадметы, якімі карыстаюцца інваліды, — белы кій, спецыяльныя падлогавыя вагі, вызначальнік узроўню вадкасці. Ім прадэманстравалі прыбор для пісання па Брайлю і грыфель, якім выбіваюцца кропкі. А потым правялі майстар-клас — паказалі буквар з выпуклымі малюнкамі і яны з заплюшчанымі вачыма спрабавалі адгадаць, што на іх намалявана.

У бібліятэцы іх уразіла чытаючая машына. Кладзеш на панэль тэкст, і металічны голас пачынае яго агучваць. Побач незвычайнага выгляду электронная лупа, з дапамогай якой павялічаны друкаваны тэкст выводзіцца на экран. Тут жа знаходзіцца абсталяванне, каб паслухаць дыск. Не ў кожнага ж дома ёсць такая магчымасць.

— Для нашых чытачоў страціць магчымасць прыходзіць у бібліятэку страшней за ўсё, — кажа Людміла Юманава і ўспамінае выпадак, як адна чытачка нават прывязвала кватэру, каб толькі яе не перасялілі ў іншае месца. Адтуль ёй было б складана дабрацца да бібліятэкі. «І я яе вельмі разумею, — прызнаецца суразмоўца. — Для нашых чытачоў жыццё — гэта аднагодкі, крама і бібліятэка».

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**
*zigulya@zviazda.by*

### У ТЭМУ

**Старшыня Магілёўскай абласной арганізацыі Беларускага таварыства інвалідаў па зроку Наталля ПАНЦЯЛЕЕВА:**

— Месячнік дапамагае прыцягнуць увагу да праблем людзей з абмежаванымі магчымасцямі па зроку. Мы крыху асабліvыя, а таму больш безабаронныя. Нават такія дробязі, як правільна падаць у краме здачу, для нас вельмі важныя. Абыякавыя людзі сыплюць металічныя капейкі проста на прылавак, а ўважлівыя — у далонь невідушчага. Калі б людзі часцей ставілі сябе на наша месца, яны б былі болей уважлівымі.

Шрыфт Брайля дапамагае нам адчуваць сябе больш упэўнена ў сучасным грамадстве. На жаль, цяпер тактыльную кнігу выцясняе камп'ютар. З яго дапамогай можна слухаць літаратурныя творы, знаходзіць сяброў, стасавацца з імі. Але чытанне па Брайлю дае магчымасць быць больш пісьменным, адукаваным, дазваляе лягчэй сацыялізавацца. Насцярожвае, што сёння нават у спецшколах-інтэрнатах дазваляецца не вучыцца «чытаць рукамі». Памяншаецца попыт на тыфлапедагогаў, а кнігі па Брайлю амаль зніклі з нашага жыцця. Але так быць не павінна. Падчас экскурсіі па нашай арганізацыі адзін васьмікласнік, у якога няма праблем са зрокам, зацікавіўся азамі шасціпрапкавага «брайлеўскага» шрыфту. Ён нават не ведаў, што такі існуе. Але Брайль зусім не ўчарашні дзень. Нездарма ад гэтага шрыфту не адмаўляюцца ва ўсім свеце. Некаторыя лекі суправаджаюцца надпісамі па Брайлю, ёсць спецыяльныя прынтары, іншая тэхніка. Усё гэта вельмі аблягчае жыццё ў цэмры. Галоўнае, каб у чалавека было жаданне развівацца, дасягаць чагосьці. У Магілёве ёсць хлопец, які вучыцца ў Кіеўскай семінарыі на святара і запоем чытае літаратуру на царкоўнаславянскай мове менавіта па Брайлю. Інакш гэту мову і не вывучыш. Рэлігійныя кнігі яму прывозіць з Санкт-Пецярбурга маці.

## ■ Зачапіла




### Д. ЛАБАЖЭВІЧ. «НАВАТ АФРЫКА ГУЛЯЕ Ў ЖАНОЧЫ ХАКЕЙ»

*(«Звязда» ад 26 кастрычніка)*

— Цяпер дзяўчаты ў нас усюды лідзіруюць. І ў хакей гуляюць, і ў футбол, і баксіруюць, і на Алімпіядах больш перамагаюць, чым беларускія мужчыны. Гэта добра, але... Мужчыны ў Еўропе, чуў, мастацкай гімнастыкай і сінхронным плаваннем вельмі актыўна сталі займацца. Дык, можа, усё ж такі хай усё будзе на сваіх месцах, як гістарычна склалася? Дзяўчаты — для прыгажосці, а мужчыны — для сілы і мужнасці. А то, здаецца, цяпер усё пераблыталася.

Калі дзяўчаты займаюцца прыгожымі відамі спорту, на іх прыемна глядзець. Гэта неабавязкова гімнастыка, ёсць жа і ў лёгкай атлетыцы, напрыклад, шмат прыгажунь. Не хацеў бы я трапіць на матч, дзе жанчыны адна адной валасы выдзіраюць або зубы выбіваюць. Гэтак жа мне не вельмі хацелася б глядзець на мужчын у ласінах і з нафарбаванымі тварамі на гімнастычным дыване або ў басейне.

**Уладзімір Кандрацкі**, *г. Орша.*

### Н. ЗІГУЛЯ. «НА ДНЕ ЯРА»

*(«Звязда» ад 28 кастрычніка)*

— Страшна падумаць, колькі яшчэ вось такіх непрыкаяных душ дагэтуль не могуць знайсці супакаення. Мне расказваў знаёмы пошукавік, што калі яны робяць перапахаванне байцоў, кожны раз пачынае ісці дождж. Неба быццам плача. Я аднойчы прысутнічала на такім перапахаванні — свяціла сонейка, і мне чамусьці ўспомніліся гэтыя словы. Я яшчэ падумала, што мой таварыш напрыдумваў розных небыліц. Але, калі сталі закопваць труну, нечакана набегла хмара і закапалі рэдкія кроплі... Можна быць непапраўным атэістам, але ёсць рэчы невытлумачальныя. І тут трэба цалкам давярацца сваёй інтуіцыі. А што, калі гэты невядомы, астанкі якога знайшлі пад гаражом, сапраўды нагадваў пра сябе? У любым выпадку, гісторыя не для слабанервовых. Я паспрабавала б як мага хутчэй пазбавіцца ад такога гаража. Тым больш што месца ва ўсіх адносінах «цёмнае». Або запрасіла б святара.

**Святлана**, *Бабруйскі раён.*

### С. ЯСКЕВІЧ. «БАБА НАДЗЯ З ЧАРНІЧНАГА ЗБІРАЕЦЦА НА ЗІМУ Ў ГОРАД»

*(«Звязда» ад 29 кастрычніка)*

— Прачытаў гэты матэрыял, і ахапіла шчымлівае пачуццё. Успомнілася маці, такія цяжкія яе апошнія дні... Яна таксама жыла ў вёсцы, але пасля перажытага інсульту я забраў яе да сябе. Што такое былы вясковы жыхар у горадзе, тым больш нездаровы, не вам расказваць: мы абое днямі на рабоце, а яна сядзіць у кватэры на дзявятым паверсе, нібы ў клетцы. Так вытрымала нядоўга, стала плакаць, прасіцца, каб адвёз дадому. І я зрабіў першую памылку — пасадзіў маці ў машыну і завёз у вёску. Там пабыў з паўдня, упэўніўся, што яна сама не справіцца, сказаў рашуча: «Не, я цябе тут не пакіну». І гэта была другая памылка. Бо па дарозе назад яна расстроілася, падняўся ціск, і здарыўся другі інсульт... А праз два тыдні мамы не стала.

І цяпер каторы год усё гэта перажываю і думаю, што нешта зрабіў не так. А як зрабіць ТАК, пэўна, не ведае ніхто. Адарваць старых людзей ад іх роднай хаты, дзе яны былі гаспадарамі, тое самае, што вырваць дрэва з коранем. Хіба яно будзе жыць? Шчаслівыя тыя старыя, якіх дзеці, выйшаўшы на пенсію, дагледзелі ў сваёй хаце. Пра такія сем'і, дарэчы, чытаў і ў вашай газеце. Ды, на жаль, не ўсе нашы мамы дажываюць да нашай пенсіі. І рана ці позна ўзнікае вось такое пытанне.

**Сяргей Ш.**, *г. Брэст.*

### Н. ЛУБНЕЎСКАЯ. «НА СЯЛЕ ПЛАЦЯЦЬ НАРМАЛЬНЫЯ ГРОШЫ!»

*(«Звязда» ад 1 лістапада)*



— Домікі што трэба, у сталіцы такога жылля ад прадпрыемства не дачакаешся. Максімум — пакой у інтэрнаце, і тое невядома, у якім стане ён табе дастанецца і калі. Але я з Мінска ў вёску дакладна не пераехала б. У іншы абласны горад, той жа Гродна, — магчыма, а на сяло не цягне. Ну, толькі калі на пару тыдняў падчас водпуску ці на выхадныя ўлетку. Бо чым там заняцца ў вольны час? Нават дамы культуры не ўсюды працуюць. А хочацца ж і ў кіно схадзіць, і ў кавярні пасядзець. Не той рытм жыцця ў вёсцы...

**Вікторыя**, *г. Мінск*

■

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

**Организатор торгов:** государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, (0212) 42-61-62.

| |
|---|
| **Продавец:** ОАО «Плисский льнозавод», Витебская обл., Глубокский р-н, г.п. Подсвилье, ул. Советская, 83, (029) 598-99-44. |
| Наименование предмета торгов. Начальная цена (с учетом/до деноминации). |
| Лот №1. Капитальное строение с инв. №220/С-26912 (Насосная станция 1 подъема) по адресу: Витебская обл., Глубокский р-н, Подсвильский с/с, г.п. Подсвилье, ул. Советская, д. 83, площадью 12,6 кв.м, на зем. участке с кадастровым №221585090610000024, площадью 0,0371 га, в т.ч. линия электропередачи 0,4 кВ, на зем. участках с кадастровыми №№: 221585090610000026, 221585090610000027, 221585090610000028, 221585090610000029, 221585090610000030, 221585090610000031, 221585090610000032. Нач. цена: 4 950/49 500 000 руб. без НДС. |
| Лот №2. Льнокомбайн ЛКВ-4А, инв. №198, 2005 г.в. Нач. цена: 160/1 600 000 руб. без НДС. |
| Лот №3. Льнокомбайн ЛКВ-4А, инв. № 400, 2002 г.в. Нач. цена: 160/1 600 000 руб. без НДС. |
| Лот №4. Комбайн льноуборочный самоходный КЛС-3,5 «ПАЛЕССЕ LS-35», 2009 г.в., заводской №085, инв. №231. Нач. цена: 13 750/137 500 000 руб. без НДС. |
| Лот №5. Автомобиль грузопассажирский вагон УАЗ-39099-4, рег. знак АВ 5987-2, 2008 г.в. Нач. цена: 2 010/ 20 100 000 руб. без НДС. |
| Лот №6. Агрегат почвообрабатывающий посевной АПП-6А-01, инв. номер 526, 2009 г.в. Нач. цена: 20 886,25/ 208 862 500 руб. без НДС. |
| Лот №7. Производственная база ОАО «Плисский льнозавод» по адресу: Витебская обл., Ушачский р-н, г.п. Ушачи, ул. Калининская, д. 118, в т.ч. капитальные строения: Производственный корпус инв. №234/С-8549 площадью 1821 кв.м; Весовая инв. №234/С-8559 (д. 118/4) площадью 243 кв.м; Столярная мастерская инв. №234/С-8551 (д. 118/8) площадью 18 кв.м; Насосная инв. №234/С-8553 (д. 118/5) площадью 6 кв.м; Гараж-насосная инв. №234/С-8552 (д. 118/11) площадью 157 кв.м; Склад льносемян инв. №234/С-8560 (д. 118/9) площадью 411 кв.м; Склад готовой продукции инв. №234/С-8556 (д. 118/1) площадью 631 кв.м; Электроподстанция инв. №234/С-8550 (д. 118/10) площадью 23 кв.м; Склад ГСМ инв. №234/С-8555 (д. 118/3) площадью 32 кв.м; Навес для льна №3 инв. №234/С-8616 (д. 118/6) площадью 1298,6 кв.м; Навес для льна №4 инв. №234/С-8617 (д. 118/7) площадью 173,5 кв.м; Кабельные линии электропередач инв. №234/С-8649 (д. 118) протяженностью 184,4 м.; Линия электропередач инв. №234/С-8648 (д. 118) протяженностью 377,3 м.; Проходная инв. №234/С-8554 (д. 118/2), площадью 22,9 кв.м, в т.ч.: пешеходная часть, ограждение; оборудование. Имущество расположено на зем. участке с кадастровым №224955100001000185 площадью 20,6811 га. Нач. цена: 77 609,76/776 097 640 руб. без НДС. |
| Лот №8. Производственная база ОАО «Плисский льнозавод» по адресу: Витебская обл., Глубокский р-н, Подсвильский с/с, г.п. Подсвилье, ул. Советская, д. 83, в т.ч. капитальные строения: административно-бытовой корпус инв. №220/С-5652 площадью 2416,3 кв.м; производственный корпус инв. №220/С-26836 (д. 83 корп. 1) площадью 11309,6 кв.м, в т.ч: кабель 0,4 кВ, кабель 10 кВ; Заправочная инв. №220/С-26857 (д. 83 корп. 11) площадью 487,7 кв.м; блок вспомогательных помещений инв. №220/С-26839 (д. 83 корп. 12) площадью 518,4 кв.м, в т.ч.: кабель 0,4 кВ, кабель 10 кВ; Материальный склад инв. №220/С-15281 (д. 83/9) площадью 604,3 кв.м; Электроцех инв. №220/С-15299 (д. 83/10) площадью 97,8 кв.м; Здание автовесовой №1 инв. №220/С-15286 (д. 83/3) площадью 50,9 кв.м; Автовесовая № 2 инв. №220/С-15297 (д. 83/4) площадью 50,9 кв.м; Костросборник инв. №220/С-15292 (д. 83/6) площадью 92,3 кв.м; Здание фильткамеры инв. №220/С-26840 (д. 83 корп. 2) площадью 946,0 кв.м; Конюшня инв. №220/С-26841 (д. 83 корп. 13) площадью 124,9 кв.м; Проходная старого завода инв. №220/С-26830 (д. 83, корп. 14) площадью 8,9 кв.м; Мазутонасосная инв. №220/С-15284 (д. 83/5) площадью 66,4 кв.м; Шоха №1 инв. №220/С-26803 площадью 3434,4 кв.м; Шоха №2 инв. №220/С-26802 площадью 3434,4 кв.м; Шоха №3 инв. №220/С-26804 площадью 3436,8 кв.м; Шоха №4 инв. №220/С-26805 площадью 3427,2 кв.м; Шоха №5 инв. №220/С-26806 площадью 3434,4 кв.м; Шоха №6 инв. №220/С-26801 площадью 3432,0 кв.м; Шоха №7 инв. №220/С-26807 площадью 3146,4 кв.м; Водонапорная башня инв. №220/С-26800 площадью 11,3 кв.м; Резервуар для мазута с помещением коренных задвижек №1 инв. №220/С-26861; Резервуар для мазута с помещением коренных задвижек № 2 инв. №220/С-26862; Насосная станция 2 подъема, в т.ч. водопровод, противопожарные резервуары 2 шт. инв. №220/С-26825 площадью 104,2 кв.м; Трансформаторная подстанция инв. №220/С-15295 (д. 83/8) площадью 21,0 кв.м; Техническая насосная станция инв. №220/С-26826 площадью 224,2 кв.м; Сети наружного освещения инв. №220/С-26827; Эстакада технологических трубопроводов инв. №220/С-26863; Канализационная сеть инв. №220/С-26828; Водопроводные сети инв. №220/С-26822; Мазутопровод инв. №220/С-26824; Трасса мазутопровода инв. №220/С-26823; Теплотрасса инв. №220/С-26838; Канализационная напорная сеть инв. №220/С-26837; Канализационно-насосная станция инв. №220/С-26799 площадью - 47,1 кв.м; Оборудование; Строительные материалы. Имущество расположено на зем. участке с кадастровым №221555400001000019. Нач. цена: 365 090,19/3 650 901 8767 руб. без НДС. |
| Лот №9. Капитальное строение с инв. №220/С-15300 (Гараж для автомашин) по адресу: Витебская обл., Глубокский р-н, Подсвильский с/с, г.п. Подсвилье, ул. Советская, д. 83, корп. 7, площадью 1060,7 кв.м, на зем. участке с кадастровым №221585090610000023 площадью 0,2819 га. Нач. цена: 6 154,60/61 546 000 руб. без НДС. |
| Лот №10. Автомобиль грузопассажирский вагон ГАЗ 2705, рег. знак АА 2181-2, 2005 г.в. Нач. цена: 65/650 000 руб. без НДС. |
| Лот №11. Механическая ножовка 872m, инв. №369, 1997 г.в. Нач. цена: 68/680 000 руб. без НДС. |
| Лот №12. Комбайн льноуборочный КЛС-3,5, рег. знак ВВ-2 1512, 2008 г.в. Нач. цена: 1 430/14 300 000 руб. без НДС. |
| Лот №13. Комбайн льноуборочный самоходный КЛС-3,5 Полессе LS35, рег. знак БХ 9339, 2009 г.в. Нач. цена: 1 615/ 16 150 000 руб. без НДС. |
| Лот №14. Сверлильный станок 2Н-118, инв. №10, 1966 г.в. Нач. цена: 41/410 000 руб. без НДС. |
| Лот №15. Машина раскладочная МР-1400, инв. №533, 2010 г.в. Нач. цена: 542,47/5 424 698 руб. без НДС. |
| Лот №16. Машина слоеформирующая МС 6,97, инв. №534, 2010 г.в. Нач. цена: 1 356,17/13 561 746 руб. без НДС. |
| Лот №17. Машина трясильная ТН-112-01, инв. №539, 2010 г.в. Нач. цена: 927,84/9 278 410 руб. без НДС. |
| Лот №18. Агрегат мяльно-трепальный МТА-2Л, инв. №538, 2010 г.в. Нач. цена: 8 794,27/87 942 654 руб. без НДС. |
| Лот №19. Машина мяльная М-110-Л, инв. №537, 2010 г.в. Нач. цена: 1 222,70/12 226 932 руб. без НДС. |
| Лот №20. Панель автоматизации, инв. №551, 2011 г.в. Нач. цена: 25,65/256 475 руб. без НДС. |
| Лоты №21-24. Сушилка СКП-10КУ, 1979 г.в. Нач. цена за 1 лот: 728,84/7 288 400 руб. без НДС. |
| Лоты №25-28. Трясильная машина ТГ-135, г.в. Нач. цена за 1 лот: 88,17/881 665 руб. без НДС. |
| Лот №29. Пресс РП-5, инв. №179, инв. №179, 1979 г.в. Нач. цена: 73,72/737 161 руб. без НДС. |
| Лот №30. Машина СМТ-200, инв. №235, 1985 г.в. Нач. цена: 151,09/1 510 862 руб. без НДС. |
| Лот №31. Машина МТА-1Л, инв. №256, 1988 г.в. Нач. цена: 1 353,24/13 532 418 руб. без НДС. |
| Лот №32. Кудельно-приготовительный агрегат КПЛМ-2М, инв. №167, 1979 г.в. Нач. цена: 53,16/531 611 руб. без НДС. |
| Лот №33. Циклон ЦН-15, инв. №322, 1992 г.в. Нач. цена: 134,22/1 342 153 руб. без НДС. |
| Лот №34. Пресс паковочный РП-5, инв. №50, 1972 г.в. Нач. цена: 103,38/1 033 750 руб. без НДС. |
| Лот №35. Пресс паковочный РП, инв. №51, 1974 г.в. Нач. цена: 189,59/1 895 886 руб. без НДС. |
| Лот №36. Пресс НВВ, инв. №57, 1990 г.в. Нач. цена: 144,28/1 442 811 руб. без НДС. |
| Лот №37. Трепальное колесо, инв. №104,1965 г.в. Нач. цена: 78,36/783 568 руб. без НДС. |
| Лот №38. Машина разрывная (гидропресс), инв. №63, 1996 г.в. Нач. цена: 98,61/986 062 руб. без НДС. |
| Лот №39. Циклон, инв. №299, 1991 г.в. Нач. цена: 7,67/76 689 руб. |
| Лот №40. Машина сушильная СКП-10КУ, инв. №39, 1985 г.в. Нач. цена: 69,92/699 186 руб. без НДС. |
| Лот №41. Станок СМТ-200М, инв. №250, 1987 г.в. Нач. цена: 80,61/806 102 руб. без НДС. |
| Лот №42. Машина МТА-2Л, инв. №188, 2005 г.в. Нач. цена: 5 996,09/59 960 900 руб. без НДС. |
| Лот №43. Самоходный оборачиватель лент льна «ОСЛ-1», инв. №512, 2009 г.в. Нач. цена: 939,17/9 391 660 руб. без НДС. |
| Повторные торги состоятся 22.11.2016 в 12.00 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Срок внесения задатков и подачи заявлений на участие в торгах: с 08.11.2016 с 8.30 по 21.11.2016 до 17.30. Шаг аукциона устанавливается в сумме 5% от начальной цены лота. Задаток составляет 10% от начальной цены лота и перечисляется на р/с №3012470594456 в РКЦ №39 филиала ОАО «Белагропромбанк» Витебское облуправление, код 424, УНП 300019491. Получатель платежа: ОАО «Плисский льнозовод». Движимое имущество расположено по адресу: Витебская обл., Глубокский р-н, г.п. Подсвилье, ул. Советская, 83. Условие аукциона: оплата НДС сверх цены продажи имущества. Ранее опубликованные извещения: газета «Звязда», «Веснік Глыбоччыны» 12.10.2016. |

**Заявления на участие в торгах со всеми необходимыми документами принимаются в рабочие дни с 8.30 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга».** Торги проводятся в соответствии с Законом Республики Беларусь от 13 июля 2012 г. №415-З «Об экономической несостоятельности (банкротстве)». Лица, желающие участвовать в торгах, обязаны подать организатору торгов заявление на участие в торгах с приложением документов: заверенного банком документа, подтверждающего внесение суммы задатка на р/с, указанный в извещении; для индивидуального предпринимателя — копии свидетельства о гос. регистрации индивидуального предпринимателя; для юр. лица — доверенность, выданную представителю юр. лица (кроме случаев, когда юр. лицо представляет его руководитель), а также копии свидетельства о гос. регистрации юр. лица; для иностранного юр. лица, иностранной организации, не являющейся юр. лицом, созданной в соответствии с законодательством иностранных государств иностранным государством и его административно-территориальными единицами в лице уполномоченных органов, международной организации — легализованные в установленном порядке копии учредительных документов, выписки из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иного эквивалентного доказательства статуса юр. лица в соответствии с законодательством страны происхождения, документа о финансовой состоятельности, выданного обслуживающим банком; для представителя гражданина РБ, в том числе индивидуального предпринимателя, — доверенность, оформленную в соответствии с законодательством. При подаче документов на участие в торгах граждане РБ, иностранные граждане и лица без гражданства, а также граждане РБ, постоянно проживающие за пределами РБ, представители юр. лиц РБ, предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность. Имущество считается проданным лицу, которое предложило на торгах самую высокую цену. В случае если торги признаны несостоявшимися, предмет торгов продается единственному участнику, подавшему заявление на участие в торгах (либо явившемуся для участия в них) при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5%. Победитель торгов в день проведения торгов подписывает протокол. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан: в течение 5 (пяти) дней со для проведения торгов возместить затраты на организацию и проведение торгов, затраты по оценке имущества, изготовлению документации, необходимой для проведения торгов; в течение пяти рабочих дней со дня проведения торгов подписать договор купли-продажи; оплатить предмет торгов в порядке и в сроки, установленные договором купли-продажи. Организатор торгов вправе отказаться от проведения торгов не позднее, чем за 5 дней до даты их проведения. Имущество бывшее в употреблении. Ознакомление с объектами осуществляется в рабочие дни с 8.30 до 17.00. Конт.тел.: (0212) 42-61-62, (029) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru, marketvit.by.

## ИЗВЕЩЕНИЕ о проведении аукциона по продаже имущества ОАО «БПХО» с понижением начальной цены продажи на 60 процентов

| № п/п | Наименование лота | Местонахождение | Начальная цена продажи с учетом НДС, руб. коп. | Задаток 20%, руб. коп. |
|---|---|---|---|---|
| 1. | **Лот № 14** – капитальные строения: | | | |
| 1.1 | Хозяйственный корпус ЖКУ с инвентарным номером 110/С-102445, площадью 850,0 кв.м | Брестская область, г. Барановичи, ул. Фабричная, 4А, на земельном участке с кадастровым номером 141000000006000798, площадью 0,7228 га | **132 613,92** | **26 522,78** |
| 1.2 | Уличное освещение ЖКУ с инвентарным номером 110/С-111919, протяженностью 333,6 м | Брестская область, г. Барановичи, ул. Фабричная, 4А, на земельном участке с кадастровым номером 141000000006000798, площадью 0,7228 га | **1 017,98** | **203,60** |
| 1.3 | Канализационная сеть здания ЖКУ с инвентарным номером 110/С-111736, протяженностью 61,1 м | Брестская область, г. Барановичи, ул. Фабричная, 4А, на земельном участке с кадастровым номером 141000000006000798, площадью 0,7228 га | **103,10** | **20,62** |
| 1.4 | Водопроводная сеть здания ЖКУ с инвентарным номером 110/С-111735, протяженностью 50,0 м | Брестская область, г. Барановичи, ул. Фабричная, 4А, на земельном участке с кадастровым номером 141000000006000798, площадью 0,7228 га | **60,96** | **12,19** |
| 1.5 | Теплотрасса здания ЖКУ с инвентарным номером 110/С-111734, протяженностью 38,0 м | Брестская область, г. Барановичи, ул. Фабричная, 4А, на земельном участке с кадастровым номером 141000000006000798, площадью 0,7228 га | **503,90** | **100,78** |
| | **Итого:** | | **134 299,86** | **26 859,97** |

Аукцион состоится **08 декабря 2016 в 14.00** по адресу: 225410, г. Барановичи, ул. Фабричная, 7, каб. 503, 5-й этаж.

*Организатор аукциона:* открытое акционерное общество «Барановичское производственное хлопчатобумажное объединение» (ОАО «БПХО»), г. Барановичи, ул. Фабричная, 7.

Прием заявлений и документов на участие в аукционе осуществляется в рабочие дни с 9.00 до 12.00 и с 14.00 до 16.00 по адресу: г. Барановичи, ул. Фабричная, 7, каб. 602. Последний день подачи заявлений на участие в аукционе – **02.12.2016**.

Задаток вносится до подачи заявления на участие в аукционе на р/с 3012605450052 в отделении ОАО «АСБ Беларусбанк», код 150501245, получатель платежа – ОАО «БПХО», УНП 200166488.

Шаг торгов – 5 процентов.

Победителем аукциона признается участник, предложивший наивысшую цену. Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 10 рабочих дней со дня подписания (утверждения) протокола о проведении аукциона. Срок оплаты за предмет аукциона устанавливается при заключении договора купли-продажи с продавцом.

Победитель (единственный участник) аукциона в течение 3 рабочих дней после дня проведения аукциона (утверждения протокола) возмещает затраты на организацию и проведение аукциона в соответствии с Соглашением.

Информация о предыдущих аукционах по продаже капитальных строений опубликована в газете «Звязда» от 12.07.2016, 20.08.2016, 30.09.2016.

Дополнительную информацию можно получить у организатора аукциона по тел.: (80163) 47-75-73, 64-05-19.

## ИЗВЕЩЕНИЕ о проведении открытого аукциона по продаже земельных участков в Лидском районе в частную собственность

Аукцион состоится в 11.00 07 декабря 2016 г. в г. Лида по ул. Советской, 8. Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник — четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Последний день приема заявлений — 01 декабря 2016 г. до 15.00. Телефон для справок 45-05-38 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки». http://grodnoino.by/

| **Номер лота** | **1** | **2** | **3** |
|---|---|---|---|
| Адрес земельного участка, кадастровый номер | Лидский район, Третьяковский сельсовет, аг. Ёдки, позиция 53 423685403125000302 | Лидский район, Третьяковский сельсовет, аг. Ёдки, позиция 34, 423685403125000326 | Лидский район, Третьяковский сельсовет, аг. Ёдки, позиция 32 423685403125000315 |
| Право на земельный участок | право частной собственности | право частной собственности | право частной собственности |
| Площадь, га | 0,1012 га | 0,1208 га | 0,1320 га |
| Начальная цена земельного участка, руб. | 2 339,98 р. (две тысячи триста тридцать девять) рублей девяносто восемь копеек) | 2 793,16 р. (две тысячи семьсот девяносто три рубля шестнадцать копеек) | 3 357 (три тысячи триста пятьдесят семь) рублей) 34 (тридцать четыре) копейки |
| Задаток, руб. | 234 р. (двести тридцать четыре рубля) | 279 р. (двести семьдесят девять рублей) | 336 р. (триста тридцать шесть рублей) |
| Дополнительное условие | Возместить затраты: За изготовление градостроительного паспорта земельного участка 315 (триста пятнадцать) рублей 89 (восемьдесят девять) копеек. За землеустроительное дело по восстановлению границы земельного участка для проведения аукциона 308 (триста восемь) рублей 70 (семьдесят) копеек | Возместить затраты: За изготовление градостроительного паспорта земельного участка 315 (триста пятнадцать) рублей 89 (восемьдесят девять) копеек. За землеустроительное дело по восстановлению границы земельного участка для проведения аукциона 310 (триста десять) рублей 84 (восемьдесят четыре) копейки | Возместить затраты: за изготовление градостроительного паспорта земельного участка – 315 (триста пятнадцать) рублей 89 (восемьдесят девять) копеек. За землеустроительное дело по восстановлению границы земельного участка для проведения аукциона 359 (триста пятьдесят девять) рублей 11 (одиннадцать) копеек. За государственную регистрацию создания земельного участка и возникновения прав, ограничений (обременений) на земельный участок 52 (пятьдесят два) рубля 50 (пятьдесят) копеек |
| **Номер лота** | **4** | **5** | **6** |
| Адрес земельного участка, кадастровый номер | Лидский район, Третьяковский сельсовет, аг. Ёдки, позиция 40, 423685403125000330 | Лидский район, Третьяковский сельсовет, аг. Ёдки, позиция 36 423685403125000356 | Лидский район, Третьяковский сельсовет, аг. Ёдки, позиция 64 423685403125000362 |
| Право на земельный участок | право частной собственности | право частной собственности | право частной собственности |
| Площадь, га | 0,1120 га | 0,1179 га | 0,1012 га |
| Начальная цена земельного участка, руб. | 2 589,69 р. (две тысячи пятьсот восемьдесят девять рублей шестьдесят девять копеек) | 2 726,11 р. (две тысячи семьсот двадцать шесть рублей одиннадцать копеек) | 2 339,97 р. (две тысячи триста тридцать девять рублей девяносто семь копеек) |
| Задаток, руб. | 259 р. (двести пятьдесят девять рублей) | 273 р. (двести семьдесят три рубля) | 234 р. (двести тридцать четыре рубля) |
| Дополнительное условие | возместить затраты: за изготовление градостроительного паспорта земельного участка 315 (триста пятнадцать) рублей 89 (восемьдесят девять) копеек. За землеустроительное дело по восстановлению границы земельного участка для проведения аукциона 324 (триста двадцать четыре) рубля 50 (пятьдесят) копеек | возместить затраты: за изготовление градостроительного паспорта земельного участка 315 (триста пятнадцать) рублей 89 (восемьдесят девять) копеек. За землеустроительное дело по восстановлению границы земельного участка для проведения аукциона 311 (триста одиннадцать) рублей 72 (семьдесят две) копейки | возместить затраты: за изготовление градостроительного паспорта земельного участка 315 (триста пятнадцать) рублей 89 (восемьдесят девять) копеек. За землеустроительное дело по восстановлению границы земельного участка для проведения аукциона 308 (триста восемь) рублей 70 (семьдесят) копеек |
| **Номер лота** | **7** | | |
| Адрес земельного участка, кадастровый номер | Лидский район, Третьяковский сельсовет, аг. Ёдки, позиция 11 423685403125000306 | | |
| Право на земельный участок | право частной собственности | | |
| Площадь, га | 0,1011 га | | |
| Начальная цена земельного участка, руб. | 2 571,42 р. (две тысячи пятьсот семьдесят один рубль сорок две копейки) | | |
| Задаток, руб. | 1 669 р. (одна тысяча шестьсот шестьдесят девять рублей) | | |
| Дополнительное условие | возместить затраты: за изготовление градостроительного паспорта земельного участка 315 (триста пятнадцать) рублей 89 (восемьдесят девять) копеек. За землеустроительное дело по восстановлению границы земельного участка для проведения аукциона 307 (триста семь) рублей 44 (сорок четыре) копейки. За государственную регистрацию создания земельного участка и возникновения прав, ограничений (обременений) на земельный участок 52 (пятьдесят два) рубля 50 (пятьдесят) копеек | | |
| Инженерные коммуникации на участке отсутствуют. Земельные участки предоставляются в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (для размещения объектов усадебной застройки) | | | |
| Условия проведения аукциона в части продажи земельных участков в частную собственность | | | |

Победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона:
- в течение десяти рабочих дней после утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона либо после признания аукциона несостоявшимся:
- внести плату за земельный участок;
- возместить затраты на организацию и проведение аукциона, включая расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения, формированием земельного участка, государственной регистрацией создания этого участка;
- осуществить в течение двух месяцев после утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона либо после признания аукциона несостоявшимся государственную регистрацию прав, ограничений (обременений) прав на земельный участок;
- при невыполнении требований об обращении в течение двух месяцев со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона либо после признания аукциона несостоявшимся за государственной регистрацией земельного участка и прав на него, результаты аукциона аннулируются;
- в установленном законодательством порядке получить разрешение на выполнение проектно-изыскательских и строительных работ по строительству одноквартирного жилого дома;
- в течение одного года со дня государственной регистрации возникновения права на земельный участок приступить к занятию данного участка в соответствии с целью и условиями его предоставления (начать строительство, иное освоение земельного участка);
- возместить затраты в соответствии с решением Лидского районного исполнительного комитета от 28 марта 2016 г. № 282 «О некоторых вопросах возмещения затрат на строительство, в том числе проектирование, объектов распределительной инженерной и транспортной инфраструктуры»;
- строительство одноквартирного жилого дома завершить в течение трех лет с даты осуществления государственной регистрации права частной собственности на данный земельный участок;
- предупредить победителя аукциона либо единственного участника несостоявшегося аукциона, что право частной собственности на земельный участок прекращается:
- при неуплате земельного налога по истечении двух налоговых периодов;
- при использовании земельного участка не по целевому назначению;
- если гражданин в течение одного года со дня государственной регистрации возникновения права на земельный участок не приступил к занятию данного участка;
- при неосуществлении мероприятий по охране земель, указанных в части первой статьи 89 Кодекса Республики Беларусь о земле;
- при прекращении гражданства Республики Беларусь.

Продажа земельного участка производится гражданам Республики Беларусь.

Шаг аукциона — 5% от предыдущей цены.

Для участия в аукционе необходимо в сроки, указанные в извещении, представить в комиссию по проведению аукциона заявление, к заявлению прилагают:
- заверенную банком копию платежного поручения (квитанцию) о внесении задатка;
- копию документа, удостоверяющего личность (паспорт) покупателя или доверенного лица;
- доверенность, заверенную нотариально, если в аукционе участвует представитель физ. лица.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении.

Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются.

Номер р/с для перечисления задатка для участия в аукционе по продаже земельных участков в частную собственность и по продаже права аренды земельных участков — р/с 3012579170017 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, БИК 153001739, УНП 500833225.

■ Экалагічны лікбез

# Калі галоўны прынцып — не нашкодзь!

**Спецыялісты Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь працягваюць даваць тлумачэнні па самых розных пытаннях, якія датычацца прыродакарыстання. Чаму нельга лавіць рыбу на зімавальных ямах? Хто павінен прадухіляць заморныя з'явы на вадаёмах? Што будзе за самавольны захоп зямлі? Ці можна насіць з сабой патроны з кулямі пры паляванні на ненармаваныя віды паляўнічых жывёл?**

## ЗРАБІЦЬ ЗІМОЎКУ СПАКОЙНАЙ

**Каб прадухіліць масавы вылаў рыбы ў перыяд зімоўкі, Правіламі вядзення рыбалоўнай гаспадаркі і рыбалоўства прадугледжаны ахоўныя меры: забаронена прамысловая лоўля ўсіх відаў рыбы на зімавальных ямах з 1 кастрычніка па 15 красавіка. Пералік зімавальных ям з указаннем іх межаў указваецца ў рыбаводна-біялагічных абгрунтаваннях водных аб'ектаў.**

Напрыклад, для захавання папуляцыі звычайнага сома, які становіцца лёгкай здабычай у зімовы перыяд, па ўсёй краіне ўстаноўлена забарона на яго вылаў з 1 лістапада па 31 сакавіка. Забарона закранае як прамысловую, так і аматарскую лоўлі.

Ёсць і такія рыбы, для якіх холад зусім не ў цяжар. У прадстаўнікоў сямейства ласосевых, да якіх адносіцца чудскі сіг і еўрапейская рапушка, позняй восенню пачынаецца перыяд нерасту. У сувязі з гэтым лоўля сіга забаронена з 1 лістапада па 15 снежня, а рапушкі — з 15 лістапада па 20 снежня.

Адзіны прэснаводны прадстаўнік сямейства трасковых — мянтуз — таксама рады пахаладанню. Цёплая вада яго прыгнятае: улетку пры тэмпературы вады вышэй за 15 ° С мянтуз перастае харчавацца і, забіўшыся ў берагавыя норы, пад буйныя камяні або карчакі, упадае ў спячку. Толькі восенню, калі вада ў рэках прыкметна астывае, мянтуз абуджаецца і пачынае адкормлівацца. Нераставая забарона на вылаў мянтуза ўстаноўлена ў Беларусі з 25 снежня па 28 лютага.

З 63 відаў рыб, якія жывуць у вадаёмах і вадацёках Беларусі, многія (усе карпавыя, сомавыя) з'яўляюцца цеплалюбівымі. У ходзе эвалюцыі яны прыстасаваліся да пражывання ва ўмовах значных ваганняў тэмпературы вады (ад 2 да 25 °С). Пры нізкіх тэмпературах у гэтых рыб запавольваецца абмен рэчываў, зніжаецца або спыняецца рухальная актыўнасць і харчаванне. Перад зімоўкай у целе рыбы назапашваецца тлушч, які затрачваецца ў зімовы перыяд.

Розныя віды рыб неаднолькава перажываюць гэты цяжкі перыяд. Цеплалюбівыя віды, такія, як ляшчы, карпы, ліні, ужо ў кастрычніку-лістападзе збіраюцца ў велізарныя касякі і адпраўляюцца на зімоўку. Пры гэтым асобіны аднаго віду і ўзросту зімуюць разам. Рыбы прыціскаюцца адна да адной, і холад ужо становіцца не страшны.

Для зімоўкі рыба звычайна выбірае глыбокія ўчасткі вадаёмаў са стаячай вадой або слабай праточнай — так званыя зімавальныя ямы. Пры гэтым яны не абавязкова з'яўляюцца ямамі ў літаральным сэнсе гэтага слова, нярэдка гэта могуць быць і роўныя ўчасткі дна. Штогод рыба выкарыстоўвае адны і тыя ж зімавальныя ямы. Іх змена адбываецца толькі ў штучных вадаёмах з нестабільным узроўнем вады (вадасховішчы, сажалкі).

**Самавольнае заняцце зямельнага ўчастка з'яўляецца адміністрацыйным правапарушэннем. Такім лічыцца выкарыстанне зямельнага ўчастка без пасведчання аб дзяржаўнай рэгістрацыі.**

Згодна з часткай 1 артыкула 15.35 Кодэкса аб адміністрацыйных правапарушэннях Рэспублікі Беларусь, здабыча рыбы ў забароненых тэрміны, у забароненых месцах, забароненымі прыладамі або спосабамі, а таксама замах на такую здабычу цягнуць накладанне штрафу ў памеры ад 20 да 50 базавых велічынь.

Сума пакрыцця шкоды ў выпадку незаконнай здабычы адной асобіны сома ў забаронены перыяд складае 252 рублі, сіга і рапушкі — 189 рублёў, ментуза — 567 рублёў. Калі нанесеная браканьерам шкода дасягне 100 базавых велічынь (2100 рублёў), наступае крымінальная адказнасць.

## ПРАДУХІЛІЦЬ ЗАМОРЫ РЫБЫ

**Амаль штогод зімой, на жаль, фіксуюцца перадзаморныя або заморныя з'явы. Як правіла, адбываюцца яны на закрытых вадаёмах, дзе няма праточнай вады. Напрыклад, у канцы студзеня сёлета ў асобных вадаёмах Лідскага і Навагрудскага раёнаў адзначаліся факты гібелі рыбы ў выніку зімовых замораў. Аналагічная сітуацыя назіралася на некаторых участках вадаёмаў, утвораных на месцы здабычы торфу ў Жабінкаўскім раёне.**

Сітуацыя абумоўлена перш за ўсё значным зніжэннем колькасці кіслароду ў вадзе, што негатыўна адбіваецца на жыццядзейнасці рыбы. Пры ўзнікненні ў вадаёмах заморных і перадзаморных з'яў яна становіцца млявай, гіне ад асфіксіі. Спажыванне кіслароду залежыць і ад узросту рыбы: чым яна маладзейшая, тым больш яго патрэбна на адзінку вагі цела. Таму замор у першую чаргу аказвае негатыўнае ўздзеянне на малькой рыбы.

У адпаведнасці з Правіламі вядзення рыбалоўнай гаспадаркі і рыбалоўства прадводзіць мерапрыемствы па прадухіленні заморных з'яў і ліквідацыі іх наступстваў у арандавальнікаў, а таксама перададзеных у карыстанне рыбалоўных угоддзях абавязаны арандатары (карыстальнікі). У рыбалоўных угоддзях, якія складаюць фонд запасу, — мясцовыя выканаўчыя і распарадчыя органы або спецыяльна ўпаўнаважаныя імі юрыдычныя асобы.

Дзяржінспекцыя загадзя звяртае ўвагу абласных выканаўчых камітэтаў на неабходнасць прыняцця мер пры ўзнікненні падобнай пагрозы. Як толькі наяўнасць перадзаморных або заморных з'яў на якім-небудзь вадаёме будзе пацверджана дадзенымі гідрахімічных даследаванняў, праведзеных атэставанымі лабараторыямі, парадак і ўмовы лоўлі рыбы тут могуць быць зменены: знятыя абмежаванні па прамысловай меры і сутачнай норме вылаву. Прыняцце такога рашэння знаходзіцца ў кампетэнцыі райвыканкамаў па ўзгадненні з тэрытарыяльнымі органамі Дзяржінспекцыі і Мінпрыроды.



■ Супрацоўніцтва

### СУДАК... БЕЗ ГРАНІЦ

А потым чарга і іншых абарыгенных відаў

**Дзяржінспектары Віцебскай вобласці разам з калегамі з Расрыбалоўства паўдзельнічалі ў зарыбленні возера Жыжыцкага. Вадаём размешчаны на трансгранічнай тэрыторыі — у Кунінскім раёне Пскоўскай вобласці, за 50 кіламетраў ад беларуска-расійскай граніцы.**

— Праз праточнае возера Жакта і раку Жыжыцу Жыжыцкае злучаецца з Заходняй Дзвіной, якая далей нясе свае воды па тэрыторыі Беларусі. У акваторыю возера выпушчана 12 тысяч асобін моладзі судака, — расказала прэс-сакратар Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь Вольга Грамовіч. — Сумесныя мерапрыемствы па зарыбленні прадугледжаны Планам узаемадзеяння тэрытарыяльных падраздзяленняў Дзяржінспекцыі з Паўночна-Заходнім тэрытарыяльным упраўленнем Федэральнага агенцтва па рыбалоўстве на 2016—2018 гады. Дзяржінспекцыя таксама ініцыявала перад расійскімі калегамі правядзенне комплексу мерапрыемстваў, скіраваных на аднаўленне запасаў Дняпра, у прыватнасці, зарыбленні яго абарыгеннымі відамі. Гэтыя меры дапамогуць рацэ пасля масавай гібелі рыбы, якая назіралася ў пачатку жніўня на трансгранічным участку Дняпра ў Смаленскай і Віцебскай абласцях ■

## САМАВОЛЬНА ЗЯМЛЮ НЕ ЗАЙМАЦЬ!

**Часам у мэтах вядзення гаспадарчай дзейнасці грамадзяне, юрыдычныя асобы і індывідуальныя прадпрымальнікі самавольна займаюць землі (у тым ліку тыя, што адносяцца да ляснога фонду) за межамі зарэгістраваных на іх зямельных участкаў. Устанаўліваюць там агароджы, узводзяць капітальныя будынкі, складуюць будаўнічыя матэрыялы, адходы. Пры гэтым адказнасці за свае дзеянні яны не ўсведамляюць.**

Між тым самавольнае заняцце зямельнага ўчастка з'яўляецца адміністрацыйным правапарушэннем. У адпаведнасці з артыкулам 72 Кодэкса аб зямлі Рэспублікі Беларусь, такім лічыцца выкарыстанне зямельнага ўчастка без дакумента, які засведчвае права на яго, гэта значыць без пасведчання аб дзяржаўнай рэгістрацыі.

Адказнасць за такія дзеянні прадугледжана артыкулам 23.41 Кодэкса аб адміністрацыйных правапарушэннях Рэспублікі Беларусь: для грамадзян штраф у памеры ад 10 да 30 базавых велічынь, для індывідуальных прадпрымальнікаў — ад 20 да 100 базавых велічынь, а для юрыдычных асоб — ад 50 да 300 базавых велічынь. За паўторнае парушэнне на працягу года «захопніка» могуць прыцягнуць да крымінальнай адказнасці з прызначэннем яму больш вялікага штрафу, арышту або папраўчых работ.

## З МАЛАКАЛІБЕРНАЙ — НА ВАВЁРКУ

**Пры паляванні на вавёрку, лясную і каменную куніцу, амерыканскую норку, андатру, а таксама лясной тхара дазваляецца выкарыстанне наразной паляўнічай зброі калібру 5,6 мм (пункт 21 дадатку 2 да Правілаў вядзення паляўнічай гаспадаркі і палявання).**

Пры гэтым абмежаванні адносна дапушчальнай дульнай энергіі кулі дадзенай малакаліберной наразной зброі не вызначаны, што выклікае пытанні ў паляўнічых. У адпаведнасці з тлумачэннямі, распрацаванымі Мінлясгасам і Дзяржаўнай інспекцыяй, пры правядзенні палявання на вышэйпералічаныя віды жывёл дапускаецца выкарыстанне любой наразной паляўнічай зброі калібру (дыяметра канала ствала) 5,6 мм і патронаў да яго незалежна ад дульнай энергіі кулі.

## ПРА ПАТРОНЫ З КУЛЯМІ І КАРЦЕЧЧУ

**У паляўнічых часта ўзнікае пытанне аб законнасці нашэння і транспарціроўкі паляўнічых патронаў з кулямі і карцеччу пры паляванні на ненармаваныя віды паляўнічых жывёл.**

З аналізу нормаў, выкладзеных у пунктах 2 (абзацы 24, 25), 3, 113, 114 (абзац 4), 129 (абзац 7) Правілаў вядзення паляўнічай гаспадаркі і палявання і дадатку 2 да Правілаў, вынікае: знаходжанне ў паляўнічых угоддзях ці іншых месцах пражывання паляўнічых жывёл асоб з гладкаствольнай паляўнічай зброяй і патронамі з кулямі і карцеччу (у тым ліку, калі зброя і патроны знаходзяцца ў транспартным сродку) пры наяўнасці пуцёўкі на здабычу жывёл ненармаваных відаў з'яўляецца парушэннем.

Адказнасць за дадзенае парушэнне прадугледжана часткай 1 артыкула 15.37 Кодэкса аб адміністрацыйных парушэннях Рэспублікі Беларусь: штраф у памеры ад 20 да 50 базавых велічынь з канфіскацыяй стрэльбаў, іншых прылад палявання і прадметаў, якія з'явіліся прыладай альбо сродкам здзяйснення ўказанага парушэння, або без канфіскацыі з пазбаўленнем спецыяльнага права.

Дапускаецца перамяшчэнне падрыхтаваных кулямі і карцеччу боепрыпасаў:

— па дарогах агульнага карыстання;

— па вызначаных карыстальнікамі паляўнічых угоддзяў або райвыканкамам дарогах — пры пераездзе да спецыяльна адведзеных месцаў прыстрэлкі паляўнічай зброі і назад;

— па вызначаных карыстальнікамі паляўнічых угоддзяў або райвыканкамам дарогах — пры накіраванні да месцаў часовага пражывання паляўнічых (дома паляўнічага, аграсядзібы і інш.) і назад.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**
rs@zviazda.by

■ Ну і ну!

### НЕЛЕГАЛ ПАДРАБІЎ ДАЗВОЛ

**У Маларыцкім раёне пры праверцы брыгады паляўнічых работнікі Брэсцкай міжрайінспекцыі выявілі нелегала. Падазрэнні выклікаў адзін з дакументаў — дазвол на права захоўвання і нашэння паляўнічай зброі.**

— Апошняе яго падаўжэнне на тры гады было завізавана ў 2014 годзе подпісам начальніка Брэсцкага РАУС. Аднак дзяржінспектар, сам у мінулым работнік міліцыі, быў упэўнены: гэты кіраўнік на той час ужо не працаваў у органах, — расказала прэс-сакратар Дзяржінспекцыі Вольга Грамовіч. — Было ўстаноўлена, што мужчына ў 2014 годзе за кіраванне нападпітку быў пазбаўлены вадзіцельскіх правоў. Па законе паляўнічы павінен прадаць зброю і здаць у міліцыю дазвольны дакумент на яе. Стрэльбу ён насамрэч прадаў аднавяскоўцу, а вось дазвол быццам бы згубіў на паляванні. У дакуменце мужчына падрабіў запіс аб яго падаўжэнні, а затым набыў нелегальную зброю, на якой набыў указаны ў дазволе нумар. Колькі разоў з тых часоў грамадзянін удзельнічаў у паляваннях — высвятляе міліцыя. Складзены адміністрацыйны пратакол, парушальніку таксама пагражае крымінальная адказнасць — ад вялікага штрафу да двух гадоў абмежавання волі — за падробку дакументаў ■

# АЛІМПІЙСКАЯ ПРАГА

**За лідарства на ўсіх значных спаборніцтвах у веславанні сёння спрачаюцца ўсяго тры краіны: Беларусь, Германія і Венгрыя. Пачатак моцнай беларускай школы ў гэтым відзе спорту быў пакладзены на Алімпіядзе ў Рыме, у 1960 годзе. Тады беларусы Леанід ГЕЙШТАР і Сяргей МАКАРАНКА здабылі першае ў гісторыі нашай краіны алімпійскае «золата».**



Леанід Гейштар з «алімпійскай« сумкай.

## Джэк Лондан і блакітнавокія кошкі

Пад гарбату на кухні ў колерах кавы мы разважаем з Леанідам Гейштарам. Чэмпіён Алімпіяды ў Рыме па веславанні на каноэ толькі адзначыў 80-годдзе. Ён занатаваў свае ўспаміны ў аўтабіяграфічнай кнізе, але сярод агульнавядомых фактаў заўсёды прыгадваецца нешта, магчыма, не вельмі значнае, але прыемнае. Напрыклад, ён дагэтуль памятае жывёл, якіх сустрэў каля знакамітага Калізея ў той памятны, 1960 год.

— Нас пасля Алімпіяды пакінулі ў якасці ўзнагароды ў Італіі яшчэ на тыдзень. Мы паўсюль хадзілі там. Былі ў Ватыкане, бачылі фрэскі Мікеланджэла. Калізей глядзелі. Там жыло шмат кошак. На іх утрыманне з турыстаў збіралі грошы. А кошкі такія прыгожыя! З блакітнымі вачыма...

Сёння Леанід Рыгоравіч жыве ў гомельскай двухпакаёўцы адзін, любіць чытаць біяграфічную літаратуру, праз слова цытуе розных пісьменнікаў і паэтаў. Кажа, у школе № 6, дзе ён вучыўся адразу пасля вайны, многія прадметы выкладалі па-беларуску. Таму шмат кніг у жыцці чытаў ён і беларускіх. А вось аўтарам, які па-сапраўднаму паўплываў на яго свядомасць, называе Джэка Лондана. Магчыма таму, што абодвум ім зразумелая водная стыхія:

— Джэк Лондан прайшоў на лодцы цераз Японскае мора. Мы, дарэчы, калісь ехалі ў Японію на караблі з Находкі. Калі туды плылі, было сонца і дэльфіны гарэзавалі за кармой. А назад ішлі ноччу, трапілі ў шторм, было вельмі страшна. Але ж сіла волі здольная перамагчы страх. Я люблю тыя кніжкі, дзе ёсць нейкае рацыянальнае зерне. Між тым у Японіі з намі быў такі выпадак: за сталом падалі нешта, падобнае на каўбасу, загорнутую ў цэлафан. Мы спачатку разгубіліся, думаем, што з гэтым рабіць? Аказваецца, унутры быў гарачы вільготны ручнік — каб рукі выціраць.

## Воднае таксі ў якасці трэнажора

Дзяцінства будучага алімпійца простым не назавеш. Дарэчы, як і многіх, хто перажыў Вялікую Айчынную на акупаванай тэрыторыі. Яго бацька загінуў на вайне ў 44-м. За год да гэтага ў сям'і нарадзілася пятае дзіця. Маці прыйшлося адной падымаць усіх. Выжывалі, кажа Леанід Рыгоравіч, толькі за кошт таго, што маці добра шыла, і заказы ў яе былі пастаянна. У раён пад назвай Манастырок, дзе тады жылі Гейштары, з горада прыходзілі жанчыны, каб замовіць модную суконку ці спадніцу.

Між тым пра Манастырок трэба сказаць некалькі слоў асобна. Рэч у тым, што гэты прыватны сектар Гомеля меў у пасляваенныя гады нядобрую славу. Немясцовыя туды хадзіць увогуле баяліся. Дарэчы, і сёння там можна лёгка заблытацца. Дамы па схіле спускаюцца практычна да Сажа і, як вынік, калі рака вясной разліваецца, без лодкі адтуль проста не выбрацца. Дом Гейштараў быў зусім блізка да рэчкі, таму пры паводцы, кажа Леанід Рыгоравіч, іншым разам праз акно вылазілі, каб сесці ў лодку і пераехаць у горад — у краму, у школу, на базар.

**У Гомелі мяне сустрэлі чамусьці... на машыне хуткай дапамогі. З яе і выйшаў насустрач сваякам.**

— Лодкі былі ў кожным двары. Без лодкі там проста нельга. На лодцы я і першыя грошы зарабляў. Людзей перавозіў, а яны мне капейкі давалі. Хто 20, а хто і 50 капеек. Гэта былі вялікія грошы. Між іншым, за 20 капеек можна было ў лазню схадзіць памыцца ці ў цырульню — падстрычыся. Я вырас на рацэ і таму вады не баяўся. Вясло грабе, і ты адчуваеш, якая шчыльная вада.

Зарабляць «водным таксістам» юны Лёня пачаў з сямі гадоў. Гэта і былі першыя, несвядомыя яшчэ трэніроўкі. Да таго ж рака забяспечвала палівам для печкі. Драўніну выцягвалі з вады, сушылі і палілі. Вылаўленай рыбы хапала не толькі на харчаванне. Вялікіх рыбін маці насіла на продаж, каб потым купіць за гэтыя грошы нешта патрэбнае дзецям.

## Даўбанка як у індзейцаў

Леанід добра ведаў рыбацкія «даўбанкі» — з дрэва выдзяўбленыя чоўны. Яны былі не вельмі ўстойлівымі, як, дарэчы, і каноэ, якое прынесла яму перамогу і сусветную вядомасць.

— Нашы даўбанкі былі падобныя на лодкі індзейцаў. А сапраўднае каноэ я ўпершыню пабачыў у 1955 годзе. На рацэ займаліся спартсмены, за якімі я назіраў. А потым вырашыў і сам паспрабаваць. Селі ў яго з сябрам, даплылі да сярэдзіны ракі... і перавярнуліся. Але ж нас падабралі з парахода, які ішоў на Кіеў. Вось пасля гэтага пайшоў запісвацца ў добраахвотнае спартыўнае таварыства «Воднік». Пад калена падклаў пучок сена і паплыў на каноэ.

Літаральна праз паўтара месяца на кіламетровай дыстанцыі выйграў першынство горада і вобласці, а потым і на «рэспубліцы» перамог. Мне тады было 19 гадоў. Да гэтага паспрабаваў сябе ў байдарцы і акадэмічным веславанні. Але зразумеў, што гэта не маё. А каноэ спадабалася.

Ён і сёння пяшчотна ўспамінае пра сваё каноэ, а 800-грамовае алімпійскае вясло, зробленае з елкі, замацавана на самым заўважным месцы пад самай столлю ў пакоі, падобным на музей. Пра былы трыумф тут нагадваюць дзясяткі артэфактаў: парадны і будзённы алімпійскія гарнітуры, фотаздымкі і карціны, кубкі, значкі, сувеніры... Захавана нават багажная бірка з рымскага аэрапорта. Успаміны пра паездкі ў ГДР, ФРГ, Вялікабрытанію, Данію, Румынію, Венгрыю, Японію, Грэцыю... Але галоўны экспанат, вядома, — залаты медаль. Гаворыць, усё гэта важна для гісторыі.

## Да Алімпа — праз ложкавы завод

Калі ж зноў вярнуцца да чэмпіёнскай біяграфіі, трэба ўспомніць, што служыць у арміі Леанід Гейштар быў прызваны ў Башкірыю. І там яму было дазволена працягваць трэніроўкі на рацэ Белая. Гамяльчанін на каноэ-адзіночцы двойчы паспеў стаць чэмпіёнам Башкірыі. Пасля службы яму нават прапанавалі застацца ва Уфе, але ён вярнуўся дадому і пайшоў працаваць на завод, самы блізкі да месца жыхарства. Цяпер прадпрыемства ўсе ведаюць як завод вымяральных прыбораў, а адразу пасля вайны там выраблялі ложкі. Леанід паліраваў асобныя металічныя дэталі перад тым, як іх пакрывалі нікелем.

Пасля рабочай змены Гейштар ішоў на раку, нават узімку. Два-тры разы на тыдзень ён спускаў каноэ ў палонку ўздоўж берага. Так і плаваў — без выратавальнай камізэлькі, за страх і рызыку:

— Гэта цяпер у спартсменаў трэнажоры, дыеты, стыпендыі... А тады страшна было ў палонцы грэбці: вада ледзяная, перавернешся — патонеш адразу. Тэхніку адпрацоўваў так: выразаў палонку, клаў падушку на край лёду, станавіўся і веславаў. Цяпер успамінаю — сам не веру.

## Містычныя неспадзяванкі

У 1959 годзе, за дзесяць дзён да Спартакіяды народаў СССР, беларускія трэнеры вырашылі стварыць тандэм — Леанід Гейштар — Сяргей Макаранка. Пра псіхалагічную сумяшчальнасць у той час не разважалі. Пасадзілі ў адну лодку — а там самі наладжвайце свае стасункі. У іх яны так і не скалціся па-сапраўднаму. Але ж тут Леанід Рыгоравіч нагадвае містычную гісторыю, якая здарылася напярэдадні паездкі на Алімпіяду. Яго маці расказала пра сон, у якім двое хлапчукоў гулялі, нібы мячом, сонцам. Знаёмая манашка затым растлумачыла: «Хутка пра тваіго сына і яго таварыша загаворыць увесь свет». Так што перамагаць ім было наканавана ўдваіх, нягледзячы на некаторыя ўзаемныя непаразуменні.



Алімпійскі медаль.

Не адразу, з усялякімі перашкодамі, але ж вызначыліся са складам каманды весляроў, якія павінны былі адстойваць гонар СССР на Алімпіядзе ў Рыме. За месяц іх з Макаранкам выклікалі ў Ленінград і ўключылі ў зборную. Пашылі форму, выдалі алімпійскія значкі. Перад самым вылетам давялося сур'ёзна панервавацца. І прычыны былі незразумелыя:

— Прыехалі ў Маскву, усе паляцелі, а нас не бяруць. Прычын не тлумачаць. Кажуць: «Чакайце». Макаранка злуецца: з-за цябе затрымалі. Прычына затрымання? Відаць, прозвішча не спадабалася маё. Да таго ж я на той момант не быў ні камсамольцам, ні членам партыі. Мяне ў камсамол прынялі толькі пасля Алімпійскіх гульняў.

Неспадзяванка за некалькі дзён да Алімпіяды здарылася ў Гейштара і з вяслом. На трэніроўцы яно зламалася. У той час замяніць спартыўны снарад не было чым. Леанід знайшоў майстра, які проста склеіў вясло. Праверыць — як, ён змог толькі на трэніроўцы ў Італіі, куды іх пасля шматлікіх праверак нарэшце выпусцілі.

> **Леанід Гейштар — першы ў Беларусі алімпійскі чэмпіён, заслужаны майстар спорту, чэмпіён свету і Еўропы, заслужаны трэнер Беларусі, Ганаровы грамадзянін горада Гомеля. Аўтар трох кніг пра спорт. Першая з іх прысвечана шляху ў спорце да Алімпа, другая — дапаможнік па гісторыі веславання і трэцяя — «Алімпіяды вачамі алімпіёніка з Гомеля».**

## Тры пераможныя секунды

— Пакуль мы не прыехалі, на возеры Альбана быў такі вецер, што ніхто не мог трэніравацца. Аднак нас надвор'е падтрымала. Мы выйгралі алімпійскае «золата» на дыстанцыі ў 1000 метраў, чаго ніхто ад нас не чакаў — нас проста не ведалі. Хоць у Макаранкі на фінішы вясло пайшло вертыкальна. Ён вісіць за бортам, але выраўняўся, і мы ўсё ж змаглі выйграць тры секунды ў італьянцаў. Выклаліся па поўнай. Дарэчы, маё вясло не падвяло. І сон маці спраўдзіўся. У Гомелі мяне сустрэлі чамусьці... на машыне хуткай дапамогі. З яе і выйшаў насустрач сваякам.

Разам з Сяргеем Макаранкам яны выйгралі яшчэ чэмпіянат свету ў 1963 годзе, два чэмпіянаты Еўропы (1961 і 1963), чэмпіянаты СССР. Але ж у 1967 годзе экіпаж распаўся...

## А мог стаць грузчыкам

Пасля рымскай Алімпіяды ён вырашыў атрымаць адукацыю ў Гомельскім палітэхнікуме: сем класаў школы для чэмпіёна — неяк малавата. Пасля закончыў факультэт фізвыхавання Гомельскага ўніверсітэта, дзе застаўся працаваць на кафедры. Выкладаў сем гадоў. Кандыдацкую нават абараніць збіраўся, але, калі ў 1973 годзе змянілася начальства, Гейштара следам папрасілі вызваліць пасаду.

Алімпіец доўга не мог знайсці работу, згадзіўся нават пайсці грузчыкам на млынкамбінат і ўжо аформіў дакументы. Аднак раптам патэлефанавалі з Мінска і прапанавалі пасаду трэнера ў прафсаюзнай дзіцячай спартыўнай школе «Чырвоны Сцяг». 40 гадоў Леанід Рыгоравіч перадаваў свой тэарэтычны і практычны досвед маладым веслярам. Вырасціў чэмпіёна свету Сяргея Пусева, чэмпіёнаў СССР Югена Суслянкова, Сяргея Анісімава і свайго сына Ігара. Сёння адышоў ад трэнерскай работы, аднак працуе ў прафсаюзнай спартыўнай школе.

## Пра рух, сала і веру

Між тым пра вёслы дагэтуль не забывае. Летам на звычайнай лодцы ходзіць па Сажы. Рыбалка таксама займае пэўны час жыцця. Гаворыць, у 90-я гады, калі было складана з харчаваннем, гэтае хобі дапамагала пражыць. Кожную раніцу Гейштар пачынае з зарадкі. Не менш за паўгадзіны дае нагрузку на ўсе мышцы, у тым ліку займаецца з пяцікілаграмовымі жалезнымі «блінамі». Пытанне «як захаваўся» такім падцягнутым і бадзёрым — адно з самых распаўсюджаных, бо на свае 80 гадоў Леанід Гейштар ну ніяк не выглядае. Ён усім дае парады:

— Не трэба пераядаць. Важна здаровае харчаванне. Я люблю простую ежу, у тым ліку і сала. Я заўсёды ў руху: сам гатую, сам прыбіраю, хаджу па крамах. Транспартам імкнуся як мага менш карыстацца, больш хутка пешшу, хоць бы ўніз не карыстацца ліфтам. Ну, зразумела ж, ніколі не курыў і са спіртным вельмі стрыманы. Важна таксама верыць у Бога. У царкву хаджу. Між іншым, адзін з маіх выхаванцаў стаў святаром.

Мы гутарылі з 80-гадовым алімпійскім чэмпіёнам Леанідам Гейштарам больш за дзве гадзіны і ўрэшце дамовіліся, што зноў сустрэнемся. Праз 20 гадоў.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**
iost@zviazda.by



На возеры Альбана ў Італіі.

## ИЗВЕЩЕНИЕ о проведении открытого аукциона по продаже земельных участков в Лидском районе в частную собственность

**Аукцион состоится в 11.00 07 декабря 2016 г. в г. Лида по ул. Советской, 8.**

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник—четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Последний день приема заявлений — 01 декабря 2016 г. до 15.00. Телефон для справок 45-05-38 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки». http://grodnoino.by/**

| Номер лота | 1 | 2 | 3 |
|---|---|---|---|
| Адрес земельного участка, кадастровый номер | г. Лида, ул. Свердлова, У-1301, 423650100005001037 | г. Лида, ул. Центральная, У-1287, 423650100013002257 | г. Лида, ул. Центральная, У-1288, 423650100013002240 |
| Право на земельный участок | право частной собственности | право частной собственности | право частной собственности |
| Площадь, га | 0,1147 га | 0,1104 га | 0,1071 га |
| Начальная цена земельного участка, руб. | 25 177,07 р. (двадцать пять тысяч сто семьдесят семь рублей семь копеек) | 17 734,08 р. (семнадцать тысяч семьсот тридцать четыре рубля восемь копеек) | 17 203,98 р. (семнадцать тысяч двести три рубля девяносто восемь копеек) |
| Задаток, руб. | 2 518 р. (две тысячи пятьсот восемнадцать рублей) | 1 773 р. (одна тысяча семьсот семьдесят три рубля) | 1 720 р. (одна тысяча семьсот двадцать рублей) |
| Дополнительное условие | возместить затраты:<br>за изготовление градостроительного паспорта земельного участка – 313 (триста тринадцать) рублей 72 (семьдесят две) копейки;<br>за землеустроительное дело по формированию земельного участка для проведения аукциона — 712 (семьсот двенадцать) рублей 19 (девятнадцать) копеек;<br>за государственную регистрацию создания земельного участка и возникновения прав, ограничений (обременений) на земельный участок – 79 (семьдесят девять) рублей 80 (восемьдесят) копеек | возместить затраты:<br>за изготовление градостроительного паспорта земельного участка 319 (триста девятнадцать) рублей 45 (сорок пять) копеек;<br>за землеустроительное дело по формированию земельного участка для проведения аукциона 873 (восемьсот семьдесят три) рубля 25 (двадцать пять) копеек;<br>за государственную регистрацию создания земельного участка и возникновения прав на земельный участок – 63 (шестьдесят три) рубля | возместить затраты:<br>за изготовление градостроительного паспорта земельного участка 319 (триста девятнадцать) рублей 45 (сорок пять) копеек;<br>за землеустроительное дело по формированию земельного участка для проведения аукциона 895 (восемьсот девяносто пять) рублей 81 (восемьдесят одна) копейка;<br>за государственную регистрацию создания земельного участка и возникновения прав, на земельный участок — 63 (шестьдесят три) рубля |
| Номер лота | 4 | 5 | 6 |
| Адрес земельного участка, кадастровый номер | г. Лида, ул. Центральная, У-1289, 423650100013002241 | г. Лида, ул. Центральная, У-1290, 423650100013002238 | г. Лида, ул. Центральная, У-1291, 423650100013002235 |
| Право на земельный участок | право частной собственности | право частной собственности | право частной собственности |
| Площадь, га | 0,1042 га | 0,1057 га | 0,1037 га |
| Начальная цена земельного участка, руб. | 16 738,14 р. (шестнадцать тысяч семьсот тридцать восемь рублей четырнадцать копеек) | 16 979,10 р. (шестнадцать тысяч девятьсот семьдесят девять рублей десять копеек) | 16 657,83 р. (шестнадцать тысяч шестьсот пятьдесят семь рублей восемьдесят три копейки) |
| Задаток, руб. | 1 674 р. (одна тысяча шестьсот семьдесят четыре рубля) | 1 698 р. (одна тысяча шестьсот девяносто восемь рублей) | 1 666 р. (одна тысяча шестьсот шестьдесят шесть рублей) |
| Дополнительное условие | возместить затраты:<br>за изготовление градостроительного паспорта земельного участка 319 (триста девятнадцать) рублей 45 (сорок пять) копеек;<br>за землеустроительное дело по формированию земельного участка для проведения аукциона 840 (восемьсот сорок) рублей 32 (тридцать две) копейки;<br>за государственную регистрацию создания земельного участка и возникновения прав на земельный участок — 63 (шестьдесят три) рубля | возместить затраты:<br>за изготовление градостроительного паспорта земельного участка 319 (триста девятнадцать) рублей 45 (сорок пять) копеек;<br>за землеустроительное дело по формированию земельного участка для проведения аукциона 895 (восемьсот девяносто пять) рублей 81 (восемьдесят одна) копейка;<br>за государственную регистрацию создания земельного участка и возникновения прав на земельный участок — 63 (шестьдесят три) рубля | возместить затраты:<br>за изготовление градостроительного паспорта земельного участка 319 (триста девятнадцать) рублей 45 (сорок пять) копеек;<br>за землеустроительное дело по формированию земельного участка для проведения аукциона 895 (восемьсот девяносто пять) рублей 81 (восемьдесят одна) копейка;<br>за государственную регистрацию создания земельного участка и возникновения прав на земельный участок — 63 (шестьдесят три) рубля |
| Номер лота | 7 | 8 | 9 |
| Адрес земельного участка, кадастровый номер | г. Лида, ул. Центральная, У-1294, 423650100013002239 | г. Лида, ул. Центральная, У-1295, 423650100013002252 | г. Лида, ул. Центральная, У-1296, 423650100013002242 |
| Право на земельный участок | право частной собственности | право частной собственности | право частной собственности |
| Площадь, га | 0,1039 га | 0,1021 га | 0,1104 га |
| Начальная цена земельного участка, руб. | 16 689,95 р. (шестнадцать тысяч шестьсот восемьдесят девять рублей девяносто пять копеек) | 16 400,81 р. (шестнадцать тысяч четыреста рублей восемьдесят одна копейка) | 17 734,08 (семнадцать тысяч семьсот тридцать четыре рубля восемь копеек) |
| Задаток, руб. | 1 669 р. (одна тысяча шестьсот шестьдесят девять рублей) | 1 283 р. (одна тысяча двести восемьдесят три рубля) | 1 773 р. (одна тысяча семьсот семьдесят три рубля) |
| Дополнительное условие | возместить затраты:<br>за изготовление градостроительного паспорта земельного участка 319 (триста девятнадцать) рублей 45 (сорок пять) копеек;<br>за землеустроительное дело по формированию земельного участка для проведения аукциона 866 (восемьсот шестьдесят шесть) рублей 83 (восемьдесят три) копейки;<br>за государственную регистрацию создания земельного участка и возникновения прав на земельный участок — 63 (шестьдесят три) рубля | возместить затраты:<br>за изготовление градостроительного паспорта земельного участка 319 (триста девятнадцать) рублей 45 (сорок пять) копеек;<br>за землеустроительное дело по формированию земельного участка для проведения аукциона 895 (восемьсот девяносто пять) рублей 81 (восемьдесят одна) копейка;<br>за государственную регистрацию создания земельного участка и возникновения прав на земельный участок — 63 (шестьдесят три) рубля | возместить затраты:<br>за изготовление градостроительного паспорта земельного участка 319 (триста девятнадцать) рублей 45 (сорок пять) копеек;<br>за землеустроительное дело по формированию земельного участка для проведения аукциона 866 (восемьсот шестьдесят шесть) рублей 83 (восемьдесят три) копейки;<br>за государственную регистрацию создания земельного участка и возникновения прав на земельный участок — 63 (шестьдесят три) рубля |
| Номер лота | 10 | | |
